WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 ЧЭРВЕНЯ 2010 г. СЕРАДА № 115 (26723)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «НЕАБХОДНА ВЫПРАЦАВАЦЬ ДАКЛАДНЫ МЕХАНІЗМ МІЖВЕДАМАСНАЙ КААРДЫНАЦЫІ АНТЫТЭРАРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ»

**Неабходна выпрацаваць дакладны механізм міжведамаснай каардынацыі антытэрарыстычнай дзейнасці сілавых структур. Пра гэта заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях удасканалення работы міжведамасных дзяржаўных органаў сістэмы забеспячэння бяспекі Беларусі, якая адбылася на базе Групы «А» КДБ Беларусі.**

«Цяпер на заканадаўчым узроўні ў Беларусі распрацавана сістэма рэагавання на экстрэмісцкія дзеянні. Павысіць эфектыўнасць яе функцыянавання — надзённая задача», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, апошнім часам усё часцей даводзіцца звяртацца да тэмы барацьбы з тэрарызмам, хоць рэспубліцы і ўдалося пазбегнуць гэтай бяды. Тым не менш даводзіцца канстатаваць, адзначыў кіраўнік дзяржавы, што радыкальныя сілы ў якасці сродку дасягнення сваіх палітычных мэтаў як у глабальным маштабе, так і на рэгіянальных узроўнях нярэдка бяруць на ўзбраенне крывавыя экстрэмісцкія метады. «Гэта зло, імкліва распаўзаючыся па планеце, сёння вельмі блізка падышло да граніц нашай дзяржавы. Сведчанне таго — нядаўнія тэрарыстычныя акты ў Маскве. Мы не маем права аслабляць увагу да такіх пагроз бяспецы людзей, спадзяваючыся на стабільнасць сацыяльна-палітычнай абстаноўкі ў Беларусі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разуменне гэтага патрабуе пастаяннай работы па аптымізацыі і ўдасканаленні нацыянальнай сістэмы мераў супрацьдзеяння тэрарызму, па інтэграванні яе з адпаведнымі міжнароднымі структурамі. Неабходны таксама адзіная стратэгічная лінія, якая вызначае канцэптуальныя асновы супрацьдзеяння гэтаму злу, і канкрэтныя дзеянні па яе рэалізацыі.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 2008 годзе па яго ўказанні была праведзена праверка службовай дзейнасці спецпадраздзяленняў КДБ, МУС, Дзяржпагранкамітэта і Мінабароны. Яе вынікі паказалі, што гэтыя падраздзяленні здольныя вырашаць пастаўленыя задачы. Але адначасова былі выяўлены і вузкія месцы, звязаныя з неабходнасцю карэкціроўкі прававога становішча гэтых структур, паляпшэння іх вучэбна-трэніровачнай базы, аснашчэння сучасным узбраеннем і спецсродкамі, сацыяльнай абароненасці супрацоўнікаў. «Але галоўнае — былі выяўлены недахопы пры ўзаемадзеянні спецыяльных падраздзяленняў у вырашэнні агульных задач. У ходзе рэалізацыі маіх даручэнняў, дадзеных па выніках праверкі, многае ўжо зроблена. Але і нявырашаных праблем яшчэ дастаткова», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён асабліва падкрэсліў неабходнасць выпрацоўкі дакладнага механізма міжведамаснай каардынацыі антытэрарыстычнай дзейнасці сілавых структур у цэлым і іх спецпадраздзяленняў у прыватнасці. «У цяперашніх умовах нельга дапусціць распылення сілаў і сродкаў. На стварэнне гэтых структур у некалькіх сілавых ведамствах мы пайшлі не таму, што нам няма куды дзяваць грошы, а для таго, каб быць гатовымі да адэкватнага супрацьдзеяння сучасным экстрэмісцкім выклікам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што ў свой час, калі ішла размова аб стварэнні ў сілавых ведамствах спецпадраздзяленняў, ён палічыў неабходным ствараць не адну-дзве магутныя структуры (хоць і гэта можна было зрабіць), а некалькі. У першую чаргу яны павінны быць мабільнымі, а па-другое, адзначыў Прэзідэнт, важна пэўная здаровая канкурэнцыя. Але ў цяжкую хвіліну ўсе спецпадраздзяленні павінны дзейнічаць у адным ключы, выконваць агульную задачу, дадаў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі нямала зроблена для таго, каб спецпадраздзяленні мелі дастойны ўзровень. «Да нас едуць з многіх краін, каб навучыцца антытэрарыстычнай рабоце і выкананню спецыяльных мерапрыемстваў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Калі раней адчувалася няхватка зброі і спецыяльных сродкаў у спецпадраздзяленнях, то сёння ёсць усё. «Але ёсць лепшыя ў свеце ўзоры, мы гэта ведаем, і гэта лепшае вы, безумоўна, атрымаеце. Усё гэта павінна быць накіравана на тое, каб абараніць нашу краіну, наш народ», — сказаў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, ён падкрэсліў, што «беларускія спецпадраздзяленні павінны ўмець рабіць усё, што трэба ў сучасным свеце для таго, каб дастойна адрэагаваць на захоп заложнікаў або тэрарыстычны акт». Прэзідэнт Беларусі дадаў, што на дзейнасць спецпадраздзяленняў будзе звяртацца сур'ёзная ўвага, ім будзе аказвацца падтрымка, але адпаведным будзе і патрабаванне.

СТАР. 2

## ТРЫ РАГУЛІ Ў ВІКУЛІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Порплішча Докшыцкага раёна Вікторыя КАРДОЎСКАЯ вяртаецца дадому пасля дзённага выпасу свойскай жывёлы.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «МЫ ХАЦЕЛІ Б АТРЫМАЦЬ БАБУЛІН ОРДЭН...»

**У нумары «Звязды» ад 11 чэрвеня быў змешчаны артыкул Генадзя Баркуна «1945: вяртанне на Беларусь... коней». Каротка нагадаем, што гаворка ў ім на падставе архіўных дакументаў вялася пра папаўненне пагалоўя коней у нашай краіне ў перыяд 1944-1945 гадоў. Так, на 1 студзеня 1945 года ў Беларусі іх налічвалася ўсяго 577 138 галоў, або 49,7 працэнта ад даваеннай колькасці, пісаў аўтар. Да канца 1945 года пагалоўе коней павялічылася амаль на 80 тысяч у большай ступені за кошт трафейных коней і коней ад расфарміраваных часцей Чырвонай Арміі. Пра тое, як доўжыўся гэты шматмесячны цяжкі конскі марафон з тэрыторыі Германіі і Польшчы ў нашу краіну, і распавядаў падрабязна Генадзь Баркун.**

**Апроч іншых архіўных звестак напрыканцы артыкула ён прывёў і своеасаблівы «падсумоўваючы» дакумент, які сведчыў пра паспяховае выкананне пастаўленай задачы — прынятую 25 снежня 1945 года пастанову ЦК КП(б)Б «Аб прадстаўленні да ўрадавай узнагароды калгаснікаў, спецыялістаў жывёлагадоўлі і работнікаў райвыканкамаў, савецкіх і земельных органаў Беларусі, якія асабліва вызначыліся пры выкананні задання ўрада па перагонцы жывёлы». У прыватнасці, згодна з ім, ордэнам Чырвонай Зоркі ўзнагароджваліся 12 чалавек. І сярод іх аўтар першай называў Бар'яш Ганну Архіпаўну — старшую табуншчыцу калгаса «Лесен» Акцябрскага раёна Бабруйскай вобласці. Паведамлялася, што пад яе кіраўніцтвам быў забяспечаны перагон у свой раён 100 коней без страт у дарозе.**

І вось праз некалькі дзён пасля выхаду гэтага артыкула ў рэдакцыю патэлефанавала ўнучка названай гераіні — Святлана Мікалаеўна Модус з гарадскога пасёлка Акцябрскі. Звярнулася яна з пытаннем: дзе нашчадкі Ганны Архіпаўны маглі б забраць яе ордэн? Заяўніца сцвярджала, што ні дачка, ні яна сама як унучка ніколі не чулі, што гэтая ўзнагарода была ўручаная. На жаль, сама гераіня артыкула ва ўзросце 84 гадоў пайшла з жыцця яшчэ ў 1991 годзе. Але ж ордэн, калі яго не ўручылі, недзе павінен быць, меркавала заяўніца...

СТАР. 3

Прамая лінія

### ЭНДАКРЫННАЯ СІСТЭМА

Дыягностыка і лячэнне цукровага дыябету 1-га і 2-га тыпаў, захворванняў шчытападобнай залозы, прафілактыка эндакрыннай паталогіі будуць у цэнтры ўвагі «прамой лініі» з удзелам **загадчыцы эндакрыналагічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Алены Іванаўны КУЗЬМЯНКОВАЙ.**

Задаць пытанні спецыялісту можна **18 чэрвеня, у пятніцу, з 14.00 да 15.30** па рэдакцыйных нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.

Завочная «прамая лінія»

### ХІРУРГІЯ ТВАРУ

На пытанні, звязаныя з пашкоджаннем мяккіх тканак і касцей твару, рэканструктыўна-пластычнай хірургіяй твару, паталогіямі сківічна-тварнай вобласці (прыдатачных пазух носа (гаймарыты), слінных залоз, нерваў, скронева-ніжнесківічнага сустава, дабраякасных пухлін і пухлінападобных захворванняў) гатовы адказаць **дэкан стаматалагічнага факультэта, прафесар кафедры сківічна-тварнай хірургіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук Аляксандр Сяргеевіч ЛАСТАЎКА.**

**Пакідайце, калі ласка, пытанні да 25 чэрвеня па рэдакцыйным нумары: 8 (017) 287 18 29. Адказы будуць надрукаваны на старонках нашага выдання.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.06.2010 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| 1 долар ЗША ... 3 018,00 | 1 чэшская крона ... 143,52 | USD ... 31,4595 |
| 1 еўра ... 3 675,02 | 1 польскі злоты ... 902,26 | 10 UAH ... 39,4972 |
| 1 латвійскі лат ... 5 199,86 | 1 расійскі рубель ... 95,93 | 1000 BYR ... 10,4205 |
| 1 літоўскі літ ... 1 065,75 | 1 украінская грыўня ... 381,33 | EUR ... 38,3303 |

Агенцтва Уладзіміра Гаўрыловіча

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР на ремонт кровли здания площадью 350 м²

Ценовое предложение представить на 1 м² ремонта кровли.

Предложения принимаются в течение 7 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс 205 86 00, тел. 205 85 26. Тельтевский В.Н. УНП 190050257

Сяргей СІДОРСКІ:

Ва Урадзе

## «РАЗВІЦЦЁ БЕЗНАЯЎНЫХ ПЛАЦЯЖОЎ ПАВІННА СТЫМУЛЯВАЦЦА РЫНКАВЫМІ МЕТАДАМІ»...

**ЯШЧЭ чатыры гады таму ў краіне прадпрыемствы, якія пагаджаліся на такое ноу-хау, як выплата зарплаты сваім работнікам на пластыкавыя карткі, можна было пералічыць па пальцах. Аднак у 2006 годзе была прынятая Дзяржаўная праграма развіцця тэхнічнай інфраструктуры, якая забяспечвае выкарыстанне банкаўскіх пластыкавых картак. Яе мэтай, адзначалася ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, было, у прыватнасці, скарачэнне наяўнага грашовага абарачэння, замяшчэння яго безнаяўнымі спосабамі аплаты тавараў, стварэнне вытворчасці айчыннага высокатэхналагічнага абсталявання, якое дазваляе ажыццяўляць безнаяўныя разлікі з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. З таго часу доля безнаяўнай аплаты з выкарыстаннем пластыкавай карткі істотна павялічылася і па выніках мінулага года ў агульнай суме аперацый з карткамі склала 11,4 працэнта. Між іншым, у Расіі гэты паказчык знаходзіцца на ўзроўні 9,2 працэнта, ва Украіне — 5,2. Гэта значыць, узровень безнаяўных разлікаў у Беларусі з'яўляецца адным з самых высокіх у краінах, якія маюць падобныя стартавыя ўмовы для развіцця гэтага віду паслуг.**

Спыняючыся на выніках рэалізацыі праграмы, якая прымалася на 2006—2010 гады, **віцэ-прэм'ер Андрэй КАБЯКОЎ** праінфармаваў, што на 1 красавіка гэтага года банкамі Беларусі было эмітавана ўжо 7,9 мільёна пластыкавых картак (гэта перавышае праграмныя задачы адносна 1 студзеня 2011 года на 15 працэнтаў), усталявана 2748 банкаматаў (на 31,8 працэнта), 3071 інфакіёскі (на 12 працэнтаў), 21 689 плацежных тэрміналаў (у два разы больш за запланаванае). Сярод заходаў, якія стымулявалі развіццё безнаяўных разлікаў, ён згадаў і прынятае ў 2007 годзе рашэнне па зніжэнні банкаўскага камісійнага ўзнагароджання за эквайрынг (камісійнае ўзнагароджанне за праўядзенне безнаяўных разлікаў з дапамогай пластыкавых картак) — з 2,5 працэнта да 0,3-0,5 працэнта. Дарэчы, да гэтага кроку інкасацыя наяўных грошай была ў 5 разоў таннейшай, чым работа з пластыкавымі карткамі. А таму, патлумачыў Андрэй Кабякоў, раней гандлю было эканамічна нявыгадна працаваць з «пластыкам». Сітуацыя змянілася прынцыпова, калі расходы на эквайрынг зраўняліся з інкасацыяй. Больш за тое, віцэ-прэм'ер для стымулявання развіцця безнаяўных разлікаў у краіне ў будучыні прапанаваў пайсці яшчэ далей — зрабіць інкасацыю на 20 працэнтаў даражэйшай за эквайрынг. І дадаў, што ў большасці замежных краін інкасацыя, «калі прыязджае жывы чалавек і забірае грошы», з'яўляецца дарагой паслугай.

Разам з тым, апошняя ініцыятыва не падтрымліваецца Нацыянальным банкам, які настойвае на тым, каб інкасацыя была таннейшай, чым эквайрынг, і прапаноўвае для аб'ектаў гандлю вызначыць паказчыкі па долі безнаяўных разлікаў. З чым катэгарычна не згодны **прэм'ер-міністр Сяргей СІДОРСКІ.** Паводле яго слоў, у свеце ніхто нікому планаў не даводзіць. «Развіццё безнаяўных плацяжоў павінна стымулявацца рынкавымі метадамі», — лічыць кіраўнік Урада. Напрыклад, развіццём сістэмы бонусаў у рознічным і аптовым гандлі пры аплаце за тавар ці паслугі пластыкавымі карткамі. Акрамя таго, Сяргей Сідорскі запатрабаваў актывізаваць і працу па імпартазамяшчэнні абсталявання для безнаяўных разлікаў. На яго думку, існуе шэраг сур'ёзных пытанняў, якія датычацца тэхнічнай інфраструктуры і працы Міністэрства прамысловасці ў гэтым напрамку, у першую чаргу, гэта асваенне вытворчасці банкаматаў, інфакіёскаў, плацежных тэрміналаў. «Практычна праца — на нулі, — канстатаваў ён. — І галоўнае, што пытанне не ў жалезе, а пытанне ў ідэалогіі, якое Мінпрам быў павінен вырашыць з буйнымі міжнароднымі кампаніямі. На жаль, з боку Мінпрама выніку няма. Толькі за апошнія гады мы закупілі на 130 мільярдаў рублёў тэрміналаў, якія паставілі ў банках». У гэтай сувязі прэм'ер запытаўся ў прадстаўнікоў Нацыянальнага банка, які з'яўляецца каардынатарам дзяржаўнай праграмы: чаму галоўны банк не вырашае пытанне, якое заўсёды ставіць перад Урадам, — па імпартазамяшчэнні абсталявання для безнаяўных разлікаў. «Чаму працягваецца закупка імпартнага абсталявання, трацiцца дарагая для краіны валюта, і ўсё ідзе ціха і гладка», — заўважыў Сяргей Сідорскі. Паводле звестак Андрэя Кабякова, на закупку за мяжой абсталявання, у тым ліку закупку загатовак банкаўскіх картак, у 2007—2009 гадах пайшло 40 мільёнаў долараў. Прычына таго, што на гэтыя мэты трацяцца вялікія сродкі, падкрэсліў віцэ-прэм'ер, у наступным: «Мінпрам не асвоіў выпуску абсталявання, якое б адпавядала па ўзроўні патрабаванням, што прад'яўляюцца плацежнымі сістэмамі Visa і MasterCard», хоць за сертыфікацыю абсталявання і сертыфікацыю вырабу загатовак картак пайшло б нашмат менш грошай, чым на закупку імпартнага. Разам з тым, картачны бізнэс — вельмі перспектыўная рэч, ён у свеце будзе развівацца і надалей, а таму нашай краіне не пашкодзіла б увайсці ў гэтую справу.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## Даішнік вымушаны быў страляць па колах аўто п'янага кіроўцы ў Мінску

**Каб спыніць «нецвярозую» «Лянчу Зета», якая ўчыніла наезд на жанчыну і два аўтамабілі, давялося прымяніць зброю, а потым — службовы аўтамабіль.**

А пачалася гонка за парушальнікам, паводле звестак інспектара аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Юрыя Карніевіча, каля дзевяці гадзін вечара, калі кіроўца праехаў на чырвонае святло на развязцы сталічных праспекта Ракасоўскага — вуліцы Ванеева. На наступным святлафоры «Лянча» спынілася, але калі да аўтамабіля пачаў падыходзіць інспектар, рынулася наперад. Праваахоўнікі распачалі аперацыю па затрымцы ўцекача, які, між іншым, спыніўся на патрабаванне ўжо іншага інспектара. Але машына сарвалася з месца зноў, калі супрацоўнік ДПС АДАІ накіраваўся да яе. Апошні на службовым аўтамабілі пачаў праследаванне «Лянчы», якая ігнаравала спецсігналы на забарону руху. Больш за тое, у раёне перакрыжавання праспекта Ракасоўскага і вуліцы Пляханава ліхач учыніў наезд на «Фіят» і «Пежо», а ў раёне дома № 150 ён выехаў на тратуар, дзе наехаў на жанчыну. Было прынятае рашэнне выкарыстаць табельную зброю: пасля таго, як некалькімі стрэламі былі пашкоджаныя колы «Лянчы», аўтамабіль замарудзіў хуткасць, але не спыніўся. Тады яго блакіравалі ўжо з дапамогай службовага аўто. За рулём аўтамабіля знаходзіўся 40-гадовы раней судзімы грамадзянін, да таго ж п'яны. Пазалетась ён быў пазбаўлены права кіравання транспартнымі сродкамі за кіраванне ў стане алкагольнага ап'янення. Між іншым, высветлілася і тое, што машыну ён узяў без дазволу гаспадара...

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЖЫХАРЫ КЫРГЫЗСТАНА БЯГУЦЬ З КРАІНЫ



**Колькасць уцекачоў з-за кровапралітных міжэтнічных сутыкненняў паміж кіргізамі і ўзбекамі на поўдні Кыргызстана можа ўзрасці да 100 тысяч чалавек. Пра гэта паведаміў спецыяльны прадстаўнік генеральнага сакратара ААН Міраславаў Енчэ.**

Паводле звестак узбекскіх уладаў, у аўторак раніцай на мяжы з Кыргызстанам налічвалася ўжо 83 тысячы ўцекачоў, у сувязі з чым Узбекістан нават быў вымушаны зачыніць памежную заставу з-за немагчымасці прыняць большую колькасць людзей. Аднак, па меркаванні кіраўніка часовага ўрада Кыргызстана Розы Атунбаевай, колькасць уцекачоў, якія перасеклі мяжу і размешчаныя ў прымежнай зоне, не перавышае 40 тысяч чалавек. У выніку міжэтнічных сутыкненняў на поўдні Кыргызстана за апошнія дні загінуў не менш як 171 чалавек, больш за 2000 атрымалі раненні. Тым часам, колькасць пацярпелых можа быць значна большай, паколькі часта медыкі не выязджаюць на выклікі, асцерагаючыся за сваё жыццё.

Становішча ў Ошы па-ранейшаму застаецца напружаным, але ў цэлым кантралюецца войскам. Спецслужбы Кыргызстана канфіскавалі ў мясцовых жыхароў вялікую колькасць агнястрэльнай зброі і боепрыпасаў, у тым ліку буйнакаліберны танкавы кулямёт, танкавы кулямёт Калашнікава, шэсць АКМ, гранатамёт і больш за тры тысячы патронаў. Улады краіны вядуць перамовы з кіраўніцтвам Расіі пра ўвядзенне сілаў у зону беспарадкаў на поўдні краіны для раз'ядњання канфліктуючых бакоў, паведаміла Атунбаева. Гуманітарнае становішча на поўдні Кыргызстана таксама застаецца цяжкім. Людзям не хапае ежы, а ў лагерах уцекачоў з-за недахопу медыкаментаў паміраюць параненыя. Добраахвотнікі з ліку мясцовых жыхароў па ўсёй тэрыторыі краіны збіраюць гуманітарную дапамогу пацярпелым.



### ПАЛЯКІ СУДЗЯЦЦА ЗА КРЭСЛА КАЧЫНЬСКАГА

**У Польшчы фаварыт выбараў кіраўніка дзяржавы, лідар партыі «Грамадзянская платформа» Браніслаў Камароўскі будзе судзіцца са сваім галоўным канкурэнтам, кіраўніком партыі «Права і справядлівасць» Яраславам Качыньскім, братам загінулага пад Смаленскам прэзідэнта.**



*Яраслаў КАЧЫНЬСКІ і Браніслаў КАМАРОЎСКІ.*

Выбарчы штаб Камароўскага падаў іск на свайго візаві Качыньскага, у якім патрабуе ад адказчыка аспрэчыць заяву пра тое, што лідар партыі «Грамадзянская платформа» выступае за прыватызацыю бальніц. Справу разгледзіць у спецыяльным выбарчым парадку Варшаўскі суд. Датэрміновыя выбары прэзідэнта Польшчы пройдуць 20 чэрвеня. Паводле апошняга сацапытання, паміж супернікамі імкліва скарачаецца разрыў. Камароўскі, якому яшчэ месяц таму прадказвалі перамогу ў першым туры, цяпер набірае 41 % галасоў. Качыньскага падтрымліваюць 32 % патэнцыйных выбаршчыкаў.

### АМЕРЫКАНЕЦ ПАЛЯВАЎ НА БЕН ЛАДЭНА

**На поўначы Пакістана затрыманы грамадзянін ЗША, які заявіў следчым, што ён паляваў на Усаму бен Ладэна. Затрыманы быў узброены пісталетам і шабляй.**

Гэры Фолкнер, 52-гадовы будаўнік са штата Каліфорнія, быў затрыманы ў лесе ў правінцыі Чытрал. Паводле слоў следчых, спачатку яны ўспрынялі яго заяву пра мэту знаходжання ў краіне як жарт. Аднак пасля таго, як у затрыманага канфіскавалі зброю і прыбор начнога бачання, да амерыканца вырашылі паставіцца сур'езна. Паводле слоў затрыманага, гэта яго сёмая паездка ў Пакістан і трэці візіт у Чытрал — горны рэгіён, які лічыцца адным з магчымых месцаў, дзе хаваецца правадыр «Аль-Каеды».

### З-ЗА КАТА — ПАД СЛЕДСТВА І Ў БАЛЬНІЦУ

**У Даніі гаспадар ката апынуўся пад следствам, а пяць чалавек — у мясцовай бальніцы. А віной усяму звычка 8-кілаграмовага нахабніка без папытання залазіць у суседскі сад і пазначаць там тэрыторыю.**

Такія паводзіны хвастатага вельмі не спадабаліся ўладальніку саду, і той вырашыў правучыць гаспадара ката. Ён змайстраваў пастку, злавіў жывёлу і запатрабаваў за яго вызваленне выкуп, які, паводле яго слоў, ён збіраўся накіраваць на пакрыццё нанесенай шкоды. Гаспадар ката вырашыў вызваліць гадаванца. Сабраўшы радню, ён рушыў на штурм суседскага дома. Першы напад быў адбіты, а падчас другога завязалася неслабая калатнеча, у выніку якой пяць чалавек апынуліся ў бальніцы. А гаспадар ката быў затрыманы паліцыяй і знаходзіцца пад следствам.



Ну і ну!

## ПАРВАЎ МАМЕ... ВУХА

**Адбылося здарэнне ў Дубровенскім раёне.**

Як расказаў «Звяздзе» пракурор Дубровенскага раёна Ігар Белавусаў, 31-гадовы сын хацеў пахмяліцца і яму здалося, што мама выпіла віно, якое было ў доме. Мама ціхенька глядзела тэлевізар і ніякага віна не піла. Сын вырашыў павучыць жанчыну жыццю. Узяў яе, як дзіця, якое не слухаецца, за вуха і...

Няшчаснай жанчыне «хуткую» выклікалі суседзі. У дачыненні да яе сына, які жорстка «перавыхоўваў» маму, заведзена крымінальная справа: за наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання.

За парванае вуха мамы яму могуць абмежаваць волю тэрмінам ад 3 да 5 гадоў або пакараць яшчэ больш строга — пазбавіць волі тэрмінам ад 4 да 8 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ISSN 1990 - 763X

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает о следующих изменениях вознаграждений, взимаемых банком с 01.07.2010 при обслуживании карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»:

Обслуживание международных банковских пластиковых карточек MasterCard (Standard, Business, Gold), VISA (Classic, Gold) (мультивалютные)

| № п/п | Наименование операции | MasterCard (Standard, Business) VISA Classic | | | MasterCard Gold VISA Gold | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. |
| 1 | Снятие наличных денежных средств*, % от суммы: с отрицательного остатка счета (в пределах разрешенного овердрафта) | – | – | 1,5 | – | – | 1,5 |

Обслуживание международных банковских пластиковых карточек Maestro, VISA Electron (мультивалютные)

| № п/п | Наименование операции | Maestro, VISA Electron | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Счет в долларах США | Счет в евро | Счет в бел. руб. |
| 1 | Снятие наличных денежных средств*, % от суммы: с отрицательного остатка счета (в пределах разрешенного овердрафта) | – | – | 1,5 |

* При снятии наличных денежных средств с отрицательного остатка счета (в пределах разрешенного овердрафта) в других банках и банкоматах других банков данное вознаграждение взимается дополнительно с вознаграждением за снятие наличных денежных средств в других банках и банкоматах других банков.

Обслуживание банковских пластиковых карточек Maestro, VISA Electron, (для использования только в Республике Беларусь)

| № п/п | Наименование операции | Maestro, VISA Electron |
|---|---|---|
| 1 | Обслуживание карточки в течение срока действия**, бел. руб. | 5 000 |

** Вознаграждение не взимается при заключении договора карт-счета с лицами, являющимися пенсионерами в соответствии с законодательством Республики Беларусь и оформлении основной или дополнительной карточки VISA Electron (пенсионной карточки).

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Парламенцкі дзённік

# БЕЗ ПРАВА НА АДТЭРМІНОЎКУ

## Дэпутаты выпраўляюць завочнікаў у войска

**Народныя абраннікі падтрымалі папраўкі ў закон аб воінскім абавязку і воінскай службе, якія пазбаўляюць завочнікаў адтэрміноўкі ад прызыву, цяпер ужо ў другім чытанні. А гэта значыць, што справе дадзены ход — неўзабаве дакумент апынецца ў верхняй палаце парламента, пройдзе ўзгадненне ў Канстытуцыйным судзе (ёсць такі нюанс з гэтым законапраектам), а пасля ляжа на подпіс кіраўніку дзяржавы. І пацягнуцца стройныя шэрагі (вой, ці стройныя?) навабранцаў проста ад студэнцкай лаўкі.**

А было ж пасяджэнне, калі дэпутаты грудзьмі станавіліся на абарону навучэнцаў-завочнікаў — ажно закрадвалася спадзяванне, што яшчэ пачакаюць хлопцы з прысягай. Але ж Мінабароны сказала «трэба», і парламент адказаў «за»... Пасля галасавання **Ігар ЛАЎРЫНЕНКА, першы намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных сіл,** падзякаваў дэпутатам за «разуменне пазіцыі Міністэрства абароны», запэўніў іх, што прынятыя імі папраўкі палепшаць якасць камплектавання Узброеных сілаў, а значыць, павысяць нацыянальную бяспеку.

**Ігнацій МІСУРАГІН, нядаўна абраны калегамі на пасаду старшыні камісіі па нацыянальнай бяспецы,** падчас выступу ў Авальнай зале на сумнай для завочнікаў парламенцкім пасяджэнні не стаў. Зрабіў акцэнт на пазітыве. А ён — трэба, відаць, прызнаць — у законапраекце ёсць. Завочнікі адтэрміноўкі пазбаўлены, затое «служывыя» ёю надзеленыя — прынамсі па выплаце крэдытаў на будаўніцтва жылля падчас прызыву. Менавіта вакол гэтай нормы нібыта было шмат спрэчак, таму і «зацягнулі разгляд законапраекта», — кажа новы старшыня камісіі. Пытанне, паводле яго слоў, складанае, балючае. У ведамствах успрымалася неадназначна. Тым не менш «здолелі знайсці паразуменне з Нацбанкам, Мінфінам, Беларусбанкам». І усё ж «зрабілі добрую справу для нашай моладзі» — лічыць І. Місурагін. «Чалавек, які мае сям'ю, будзе жыллё, павінен мець нейкія гарантыі, ідучы ў войска».

Законапраектам скарэктаваныя таксама палажэнні адносна воінскага ўліку і праходжання ваеннай службы. Пашырана кола асобаў, якія прымаюць ваенную прысягу. Удакладнены падставы для датэрміновага скасавання кантракту з вайскоўцам.

Аднак у гутарцы з журналістамі лёс завочнікаў абмінуць не ўдалося. Старшыня камісіі паведаміў: новаўвядзенні не датычацца тых, хто вучыцца на завочным аддзяленні цяпер або паступае сёлета. Яны закрануць ужо тых, хто будзе паступаць налета... Палітык перакананы, што заканадаўчыя змены не пазбаўляюць моладзь магчымасці атрымаць адукацыю, маўляў, вучыцца можна і пасля службы ў войску. Спасылаўся ён і на шмат разоў агучаныя лічбы па колькасці адтэрміновак: у нас іх 28, а гэта больш, чым у самых блізкіх суседзяў...

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ФІНАНСАВАЯ РАПСОДЫЯ

**Сенатары зацвердзілі справаздачу аб выкананні леташняга бюджэту з амаль паўтрыльённым прафіцытам. «Лішак» забяспечылі пераважна мытныя бюджэтныя фонды і Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. На заробкі, пенсіі ды іншыя выплаты хапіла, таму пра сацыяльную скіраванасць бюджэту можна гаварыць з упэўненасцю. Сярэдні намінальны заробак на канец снежня адпавядаў прыблізна 840 тыс. рублёў. На ахову здароўя казна патрацілася ў маштабах 1,2 трлн, на адукацыю — і таго больш.**

Дзяржаўную падтрымку адчулі і прадпрыемствы. Летась менавіта бюджэт быў ключавым інструментам для падтрымкі эканомікі, — адзначыў **міністр фінансаў Андрэй ХАРКАВЕЦ,** выступаючы перад сенатарамі. На працягу цяжкага крызіснага года рэспубліканскі бюджэт удакладняўся двойчы. А чаго можна чакаць сёлета? Да падвядзення вынікаў першага паўгоддзя ўдакладняць бюджэт не плануецца, — запэўніў міністр.

У гутарцы з журналістамі ён выказаўся аб неабходнасці больш дэталёвай ацэнкі наступстваў нафтавага шоку для прадпрыемстваў. Аптымізму галоўны фінансіст краіны не губляе: «не ўсё так змрочна, як падавалася». Ушэсна, што з МВФ у ацэнках наступстваў нафтавага шоку для нашай краіны сышліся. А прапанаваныя беларускім Урадам захады канструктыўныя і павінны гэтыя наступствы «ў дастатковай ступені нівеліраваць».

Дарэчы, магчымасці чарговай праграмы фонду для нашай краіны будуць абмяркоўвацца не раней, чым увосень, калі ўжо можна будзе рабіць высновы па эканамічным развіцці краіны за восем месяцаў года. Цяпер жа неабходнасці ў экстранным фінансаванні няма, — запэўнівае кіраўнік Мінфіна і ўдакладняе, што праграма супрацоўніцтва з МВФ патрэбная ў першую чаргу тады, калі ёсць сур'ёзны макраэканамічны разрыў. А. Харкавец нагадаў, што папярэдняя праграма з МВФ рэалізаваная паспяхова.

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ЛАСКА

Сенатары падтрымалі чарговую амністыю, якая дазволіць выпусціць на волю больш за дзве тысячы чалавек з папраўчых установаў закрытага тыпу, каля 900 — з адкрытага. Прыблізна дзевяць тысяч асуджаных прабудуць у месцах зняволення менш за вызначаны тэрмін. Больш за сотню няпоўнагадовых могуць быць амніставаныя, — паведамляе **намеснік міністра ўнутраных спраў Яўген ПОЛУДЗЕНЬ.**

Вызваляць ад крымінальнай адказнасці і пакарання няпоўнагадовых, цяжарных жанчын, жанчын і адзінокіх мужчын, якія маюць няпоўнагадовых дзяцей, асобаў пенсійнага ўзросту, інвалідаў, хворых на актыўную форму сухотаў, ВІЧ-інфекцыя, ветэранаў баявых дзеянняў, удзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, асобаў, якія атрымалі раненні пры выкананні абавязкаў у перыяд праходжання службы, якія ўчынілі злачынствы, што не адносяцца да катэгорыі цяжкіх. Ад пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі, накіравання ў дысцыплінарную вайсковую часць, пазбаўлення волі могуць быць вызваленыя таксама іншыя катэгорыі асобаў пры асуджэнні за злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі (да двух гадоў пазбаўлення волі), а таксама пры асуджэнні да арышту — незалежна ад тэрміну адбытага пакарання; за менш цяжкія злачынствы (да шасці гадоў пазбаўлення волі) — пры адбыцці не менш за адну чвэрць тэрміну пакарання. Пры гэтым асуджаныя, якія ўчынілі іншыя катэгорыі злачынстваў і не падлягаюць вызваленню ад далейшага адбывання пакарання, вызваляюцца ад названых пакаранняў часткова тэрмінам на адзін год.

Праваахоўнікі запэўніваюць, што ўсплёскам злачыннасці дзяржаўны акт гуманізму не пагражае. Па-першае, палёгка аказваецца толькі тым, хто не з'яўляецца сур'ёзна небяспечным для грамадства. Улічваюцца іх паводзіны падчас зняволення, пад пільнай увагай застаюцца яны і па выхадзе на волю. Па-другое, не выклікае трывогі і практыка, якая склалася. Гэта ж далёка не першая амністыя ў незалежнай Беларусі, і сур'ёзнага ўплыву на крыміногенную сітуацыю ў краіне памілаванне яшчэ ніколі не аказвала. Хоць, безумоўна, рэцыдывы ўсё ж мелі месца. Дарэчы, раней амніставаным, якія зноў збіліся з правільнага шляху, другое памілаванне не «свеціць».

Не зазнаюць дзяржаўнай ласкі і хабарнікі. Амністыя да 65-годдзя Вялікай Перамогі прыкметная сваёй антыкарупцыйнай скіраванасцю.

## БОНУСЫ БІЗНЭСУ

Сенатары ўхвалілі законапраект аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, які выразна размяжоўвае бізнэс-суб'екты паводле колькасных крытэрыяў. Падтрымкай для суб'ектаў малога прадпрымальніцтва, паводле дакумента, змогуць карыстацца індывідуальныя прадпрымальнікі, мікраарганізацыі (з сярэдняй колькасцю працаўнікоў да 15 чалавек уключна) і малыя арганізацыі (ад 16 да 100 уключна). Да суб'ектаў сярэдняга прадпрымальніцтва адносяць камерцыйныя арганізацыі з сярэдняй колькасцю працаўнікоў за каляндарны год ад 101 да 250 чалавек уключна. У дакуменце замацоўваецца магчымасць асаблівых рэжымаў падаткаабкладання і спрошчанай сістэмы вядзення бухгалтарскага ўліку для згаданых суб'ектаў.

Праект закона арыентаваны на тое, каб прыцягнуць малы бізнэс да ўдзелу ў дзяржаўных праграмах, — каментуе дакумент **намеснік міністра эканомікі Андрэй ТУР,** выступаючы ў верхняй палаце парламента. Плануюцца і квоты ў агульным аб'ёме замоў для дзяржаўных патрэбаў: так, на долю суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва павінна даводзіцца не менш за адну дзясятую.

Мы згадвалі ўжо няпросты шлях законапраекта і гутаркі пра яго адхіленне. Аднак рамачнасць яго, якая не здавальняе адных дзеячаў, трактуецца другімі ў большай ступені як палітычны імпульс, чым эканамічны. Распрацоўваецца праект дырэктывы нумар чатыры па далейшай лібералізацыі эканомікі, якая апроч іншага павінна палегчыць дробнаму бізнэсу доступ да крэдытаў. Так што ў гэтым кірунку ўсё яшчэ толькі пачынаецца...

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

А не шкодзь!

## Міліцыянер-браканьер патрапіў у СІЗА

Работнікі Бярозаўскай міжрайінспекцыі падчас сумесных аператыўных мерапрыемстваў з супрацоўнікамі УКДБ па Брэсцкай вобласці паблізу вёскі Лявошкі Бярозаўскага раёна спынілі для праверкі аўтамабіль «Мерседэс-123» пад кіраўніцтвам работніка Бярозаўскага РАУС.

Падчас агляду аўтамашыны была знойдзеная скрадзеная сажалкавая рыба (карп, таўсталобік) агульнай вагой 174 кілаграмы і мокрыя сеткі агульнай даўжынёй 441 метр. Апошнія канфіскаваныя, рыба вернутая ў рыбгас «Сялец». Парушальнікі, а ў салоне акрамя вадзіцеля быў яшчэ машыніст кацельні в/ч 55782, былі змешчаныя ў СІЗА УКДБ па Брэсцкай вобласці. У дачыненні да аднаго з іх заведзена крымінальная справа за злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі, здзейсненае з карыслівай ці асабістай зацікаўленасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДЫСЦЫПЛІНА НА ЦТ ПАВЫШАЕЦЦА...

Прыёмная кампанія-2010

**ПЕРШАЕ сур'ёзнае выпрабаванне ў абітурыентаў ужо засталося ў мінулым — абавязковы для ўсіх прэтэндэнтаў на студэнцкі білет экзамен па дзяржаўнай мове здадзены. Вынікі цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай і рускай мовах стануць вядомыя прыкладна праз 10-12 дзён пасля экзамену.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў з задавальненнем адзначаюць, што колькасць абітурыентаў, якія рэгіструюцца, але прапускаюць цэнтралізаванае тэсціраванне, з кожным годам змяншаецца. Так, напрыклад, сёлета на тэсціраванне па беларускай мове не прыйшлі толькі 2 працэнты ад агульнай колькасці прайшоўшых рэгістрацыю, а ў ранейшыя гады колькасць «прагульшчыкаў» даходзіла да 7-10 працэнтаў. Праўда, і 2 працэнты — гэта 1 тысяча 321 чалавек. Наўрад ці ў многіх з іх будуць сапраўды ўважлівыя прычыны, каб быць дапушчанымі да здачы тэсціравання ў рэзервовы дзень. Значыць, колькасць прэтэндэнтаў на паступленне аўтаматычна змяншаецца. Змяншаецца сярод абітурыентаў таксама і колькасць парушальнікаў правілаў правядзення ЦТ. На тэсціраванні па беларускай мове толькі двое абітурыентаў праігнаравалі забарону на пранос у экзаменацыйную аўдыторыю мабільнага тэлефона. Праўда, ім за гэта дорага давядзецца заплаціць — яны вымушаны былі развітацца з марай аб паступленні сёлета. Перадаць тэсціраванне ў рэзервовы дзень ім ніхто не дазволіць.

Вельмі крыўдны выпадак здарыўся з хлопцам, вынікі работы якога былі ануляваныя пасля шматразовых патрабаванняў здаць экзаменацыйную работу. Згодна з Палажэннем аб правядзенні ЦТ, адказныя арганізатары, якія прысутнічаюць у аўдыторыі, павінны інфармаваць за 15 і 5 хвілін аб заканчэнні часу, адведзенага на выкананне педагагічнага тэста, што яны і зрабілі. Але і пасля заканчэння 120 хвілін, якія даюцца на выкананне тэста па беларускай і рускай мовах, хлопец спрабаваў дапісаць сваю работу, не звяртаючы ўвагі на патрабаванні арганізатараў. Гэта з'яўляецца грубым парушэннем правілаў удзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні. Таму ануляванне вынікаў тэставай работы абітурыента — хоць і суровае , але цалкам заканамернае і справядлівае пакаранне.

Як паведаміў журналісту «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ,** для сканіравання бланкаў адказаў у інстытуце выкарыстоўваюцца шэсць высакахуткасных сканераў, якія дазваляюць за суткі апрацаваць 50 тысяч бланкаў. Гэтай хуткасці дастаткова, каб забяспечыць наступны этап работы — верыфікацыю, якая вымагае значна больш часу.

— У нас часта пытаюцца, чаму вынікаў тэсціравання па самых масавых дысцыплінах даводзіцца чакаць так доўга. Па той прычыне, што працэс праверкі работ стрымлівае верыфікацыя, — патлумачыў Мікалай Фяськоў. — Сутнасць у тым, што сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтнай якасці пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. Таму на верыфікатараў ускладзена задача — прасачыць за правільнасцю распазнавання сімвалаў на бланках. Хачу падкрэсліць, што гэта робіцца выключна ў інтарэсах абітурыентаў. Скажам, камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за лічбу «8», калі яна напісана неакуратна. А чалавек гэта бачыць і папярэджвае памылку, якая можа абітурыенту вельмі дорага каштаваць. Ці, напрыклад, камп'ютар можа няправільна прачытаць прозвішча абітурыента, таму і сертыфікат будзе выпісаны затым з памылкай у прозвішчы ці ў пашпартных звестках. Верыфікацыя праводзіцца два-тры разы рознымі людзьмі, і фактычна адзін кантралюе другога. У спрэчнай сітуацыі папяровы бланк заўсёды можна зверыць з электроннай выявай. Дарэчы, папяровыя бланкі адказаў мы захоўваем да 31 снежня года правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

На верыфікацыі ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў задзейнічаны 270 чалавек. За камп'ютарамі сядзяць пераважна дзяўчаты-студэнткі. У інстытуце пераканаліся, што дзяўчаты больш падыходзяць для манатоннай работы. Да прэтэндэнтаў на дадатковыя заробкі прад'яўляліся два асноўныя патрабаванні. Яны не могуць удзельнічаць сёлета ў цэнтралізаваным тэсціраванні і не павінны курыць. Работа па верыфікацыі патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі, таму рабочая змена доўжыцца толькі чатыры гадзіны. З 9 гадзін раніцы да 21 гадзіны за камп'ютарнай тэхнікай змяняюцца тры змены.

Мікалай Фяськоў паабяцаў, што Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў забяспечыць аператыўнае інфармаванне аб выніках тэсціравання. Інфармацыю можна будзе знайсці на сайце інстытута **(www. rikz.unibel. by)**, на сайтах навучальных устаноў, дзе праходзіла тэсціраванне, на дошках для аб'яў ва ўстановах адукацыі, а таксама з дапамогай мабільнай сувязі. Для гэтага трэба будзе адправіць **SMS-запыт на кароткі нумар 5050.** Інтэрактыўны сэрвіс SMS-падпіскі даступны цяпер абанентам усіх аператараў сувязі GSM. Кошт адпраўкі SMS-запыту на нумар 5050 складае 3500 рублёў без уліку падатку (за гэтыя сродкі абітурыент атрымае вынікі па ўсіх трох прадметах). Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў плануе аператыўна, па меры апрацоўкі бланкаў адказаў, накіроўваць гэту інфармацыю мабільным апаратам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Як скласці SMS-запыт

Адправіць запыт можна як напярэдадні, так і пасля праходжання тэсціравання.

**Фармат SMS-запыту (уводзіцца праз прабел) уключае нумар этапа тэсціравання, серыю дакумента, нумар дакумента.**

1 — першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання
2 — другі этап рэпетыцыйнага тэсціравання
3 — трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання
4 — цэнтралізаванае тэсціраванне (у тым ліку ў рэзервовы дзень)

**Серыя дакумента**

Серыю дакумента, якую абітурыент пазначаў таксама ў бланку адказаў, трэба ўводзіць без прабелаў вялікімі лацінскімі літарамі. Для беларускіх пашпартоў, напрыклад, MP, BM, AB і г.д. Для пашпартоў грамадзян РФ — гэта першыя чатыры лічбы, надрукаваныя наверсе кожнай старонкі пашпарта. Для пашпартоў іншых дзяржаў усе нялічбавыя сімвалы трэба ўводзіць так, як паказана ў дакуменце.

**Нумар дакумента**

Нумар дакумента, які быў пазначаны абітурыентам у бланку адказаў, трэба ўводзіць без прабелаў. Нулі, якія стаяць першымі, трэба ўводзіць абавязкова! Для беларускіх пашпартоў гэта сямізначны нумар. Для пашпартоў грамадзян РФ — гэта апошнія шэсць лічбаў, надрукаваныя ўверсе кожнай старонкі пашпарта.

У тым выпадку, калі вы дапусціце памылку пры фарміраванні SMS-запыту або пры запаўненні рэгістрацыйнай часткі бланка адказаў на ЦТ, вынікі тэсціравання ў выглядзе SMS-паведамлення вы атрымаць не зможаце. Аднак кошт адпраўленага SMS-запыту будзе спісаны з вашага рахунка.

Прыклад SMS-запыту на атрыманне вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання на пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь серыі MP і № 0123456: 4 MP 0123456

**Прыклад SMS-запыту на атрыманне вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання на пашпарт грамадзяніна РФ серыі 5101 і № 112233:**

**4 5101 112233.**

**Прыклад зваротнага SMS-паведамлення на пашпарт грамадзяніна РБ серыі MP і № 0123456**

**MP 0123456**
**CT, Этап 4**
**Руская мова**
**Балл 85**

**Аналагічным спосабам азнаёміцца з вынікамі тэсціравання па сваім тэлефоне можа любы абанент, які падтрымлівае абітурыента. Для гэтага неабходна адправіць такі ж запыт з пашпартнымі звесткамі чалавека, які будзе ўдзельнічаць у тэсціраванні.**

# «НЕАБХОДНА ВЫПРАЦАВАЦЬ ДАКЛАДНЫ МЕХАНІЗМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Падчас наведвання Групы «А» кіраўнік дзяржавы азнаёміўся са станам вучэбна-матэрыяльнай базы спецпадраздзялення, перспектывамі яго развіцця, вынікамі і задачамі службова-баявой дзейнасці Групы «А».

Цяпер у адпаведнасці з планам развіцця КДБ ужо завершана рэканструкцыя асноўнага адміністрацыйнага будынка Групы «А», дзе створаны ўсе неабходныя ўмовы для асабовага складу. У далейшым плануецца стварэнне сучаснага тактычнага гарадка для падрыхтоўкі байцоў спецпадраздзялення. У прыватнасці, пачынаецца абсталяванне 400-метровага ціра для снайперскай падрыхтоўкі. У тактычным гарадку будзе створана інфраструктура для адпрацоўкі дзеянняў на розных відах транспарту. З'явіцца таксама катэджны гарадок (як частка тактычнага) для адпрацоўкі дзеянняў у малых населеных пунктах. Паралельна плануецца развіваць і спартыўную інфраструктуру.

Байцы Групы «А» прадэманстравалі вучэбна-баявую аперацыю па нейтралізацыі ўмоўных тэрарыстаў. Потым Прэзідэнт агледзеў службовыя памяшканні адміністрацыйнага корпуса спецпадраздзялення, трэнажорную залу, залу рукапашнага бою, клас снайперскай падрыхтоўкі, кабінет спецыяльнай тэхнікі. Ён таксама азнаёміўся з арганізацыяй службы і падрыхтоўкі асабовага складу, узбраеннем розных спецпадраздзяленняў Беларусі. Сярод арсенала, які ёсць у наяўнасці ў псіхолагаў спецпадраздзялення, былі прадэманстраваны кантактны і бескантактны паліграфы, апарат для аналізу псіхалагічнага стану чалавека, спецыяльнае праграмнае забеспячэнне, якое дае магчымасць вызначыць схільнасці кандыдатаў і тыя аптымальныя функцыі, якія яны могуць выконваць у складзе спецпадраздзялення.

Цяпер у Беларусі адсутнічаюць перадумовы для шырокамаштабнай тэрарыстычнай дзейнасці. Разам з тым, пры неабходнасці байцы Групы «А» гатовыя выканаць задачы па яе спыненні. Таму пры ўдасканаленні вучэбна-матэрыяльнай базы ўлічваецца міжнародны вопыт дзейнасці гэтых падраздзяленняў у такіх краінах, як Азербайджан, Германія, Чэхія, Венгрыя, Расія і інш.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з байцамі спецпадраздзялення і сфатаграфаваўся з імі на памяць.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Абзац




◢ **Графік з Мінска Сяргей Саркісаў перамог у конкурсе на новы дызайн уваходнага білета Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, які будзе дзейнічаць на працягу года. Праца 59-гадовага канкурсанта набрала максімальную колькасць галасоў судзейскай калегіі. Яму дастаўся галоўны прыз — Br1,5 млн. Праца гэтага аўтара адзначана таксама спецыяльным прызам дырэктара музея Уладзіміра Пракапцова.**

◢ На вялікай хуткасці на аўтадарозе Гродна—Азёры вадзіцель «Мерседэса», 28-гадовы гродзенец, не справіўся з кіраваннем на закругленні дарогі і сутыкнуўся з «Фіятам» на сустрэчнай паласе. Ад удару «Мерседэс» разарвала на дзве часткі, вадзіцеля выкінула з машыны. Ён памёр на месцы. Мужчына знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Атрымалі траўмы і шпіталізаваныя вадзіцель і пасажырка «Фіята».

◢ **ААТ «Славянка» (Бабруйск) распрацавала для школьнікаў новую калекцыю адзення дзелавога стылю «Прэміум-клас». Яго адрознівае арыгінальны дызайн, зручнасць, гіграскапічнасць і шматфункцыянальнасць. Прадпрыемства прапаноўвае модныя навінкі з сучаснай мяккай джынсавай тканіны. Да таго ж у гарнітурах ёсць адмысловая кішэня для мабільных тэлефонаў з блакаваннем выпраменьвання. Да таго ж гэтае адзенне будзе не на шмат даражэйшым, чым звычайнае.**

◢ Авіярэйс Мінск—Тэгеран адкрыецца ў жніўні. Пералёт з адной сталіцы ў другую будзе займаць 4 гадзіны. Грамадзянін Беларусі можа атрымаць турыстычную візу ў Іран на працягу аднаго дня. Адпачынак у Іране вельмі танны ў параўнанні з адпачынкам у краінах Заходняй Еўропы.

◢ **Брытанска-азіяцкую прынцэсу чатырох струн, мультыплацінавую артыстку Ванэсу Мэй, якая 20 чэрвеня дасць адзіны канцэрт у мінскім Палацы спорту, будзе абслугоўваць выключна персанал, які не курыць.**

◢ Беларускія нявесты 20 чэрвеня на штогадовым гарадскім свяце Парад нявестаў-2010 у Мінску прадэманструюць 42 непаўторныя вясельныя вобразы. Сёлета была пададзена рэкордная колькасць заявак — больш за 950 з розных рэгіёнаў Беларусі. Журы адабрала 42 найбольш таленавітыя ўдзельніцы. Усіх дзяўчат падзеляць на шэсць камандаў — «Нявесты-Ундзіны», «Нявесты-Арыстакраткі», «Галівудскія дзівы», «Нявесты-Трапіканкі», «Нявесты-Імператрыцы». Упершыню сёлета ў праекце прыме ўдзел каманда «NEW-весты», якая складаецца з выдатных прадстаўніц СМІ.

## Поўны абзац



◢ **У Мексіцы матадор спалохаўся быка і збег з арэны, пераскочыўшы праз загараджальнае збудаванне. Неўзабаве пасля таго як 22-гадовы Крысціян Эрнандэс пакінуў арэну, ён быў арыштаваны за парушэнне кантракта з арганізатарамі карыды. Маладога матадора адпусцілі з-пад варты пасля выплаты штрафу.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

**ЗАО «Агрэст» информирует своих акционеров**
**О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**
30 июня 2010 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Филимонова, 2.
Форма проведения **очная**.
**Повестка дня:** подведение итогов работы предприятия за 5 месяцев 2010 г., план работы на второе полугодие 2010 года.
УНП 100266857

# ПРАГРАМІСТЫ І ГАРЭЛКА —

## вось што прываблівае брытанцаў у Беларусі

**Летась тавараабарот паміж дзвюма краінамі перасягнуў мільярд долараў. Вялікабрытанія, паводле слоў кіраўніка дыпмісіі Розмары ТОМАС, застаецца адным з асноўных імпарцёраў беларускіх тавараў. Аднак львіная доля прыходзіцца на энерганосьбіты, а «будучыня гэтага сектару зараз выглядае цьмяна», — адзначае дыпламат. Таму абедзвюм краінам варта «разам падумаць, як зрабіць больш разнастайнай аснову нашага ўзаемнага гандлю».**

Пачынаем разважаць. Якія айчынныя прадукты сталі б папулярнымі ў Злучаным Каралеўстве? «Напэўна, гарэлка — адзін з іх», — мяркуе пасол Вялікабрытаніі ў Беларусі. І ўжо, кажа, ідуць сур'ёзныя перамовы, каб беларускі моцны напой прадаваўся праз сетку аднаго з самых буйных дыстрыб'ютараў у Вялікабрытаніі. Сярод сфер брытанскага інтарэсу ў Беларусі таксама касметыка, лекі, тэкстыль. І няхай кожная з іх сама па сабе — нязначная доля імпарту, аднак, як слушна заўважыла дыпламат, «мноства малых частак могуць скласці сур'ёзную частку тавараабароту». Эканоміка Беларусі пакрысе пачынае дэманстраваць рост — тое ж, прыкмячае пасол, адбываецца і на яе радзіме. Тым не менш «і беларускі ўрад, і ўрад Вялікабрытаніі не спадзяюцца, што ўсё будзе гэтак жа лёгка, як і ў дакрызісныя гады»...

Ёсць і такія галіны беларускай вытворчасці, у якія астраўныя бізнэсмены гатовы ўкладваць уласныя грошы. Так, інвестары Злучанага Каралеўства праяўляюць інтарэс да тутэйшай сферы высокіх тэхналогій. Апошнім часам брытанскія фірмы ўсё часцей давяраюць IT-аўтсорсінгу (гэта калі кампанія дэлегуе вырашэнне ўсіх пытанняў, звязаных з інфармацыйнымі сістэмамі, іншай — спецыялізаванай) беларускім спецыялістам. «Яны задаволеныя якасцю праграмістаў», — адзначае пасол. І ў тую ж хвілю перасцерагае ад занадта аптымістычных чаканняў: «калі мы гаворым пра маштабныя інвестыцыі, з боку ўрада павінны быць створаныя ўмовы, якія прывабілі б». Пакуль жа лічбы некрыклівыя: у 2008 годзе, напрыклад, Беларусь адчула прыток каля 0,5 млрд брытанскіх інвестыцый (у тым ліку 50 млн долараў — прамых).

У палітычным плане астраўляне бачаць сваю місію ў тым, каб «падтрымліваць больш цесныя ўзаемаадносіны паміж Беларуссю і ЕС». Не забываюцца яны пры гэтым і «паважаць стратэгічна важныя стасункі Беларусі з Расіяй і іншымі краінамі СНД». Дыпламат згадвае ўнікальнае геапалітычнае становішча Беларусі — як аднаго з галоўных перакрыжаванняў дарог Еўропы — і дастатковы патэнцыял для таго, каб «зрабіць унёсак у доўгатэрміновую стабільнасць у рэгіёне».

— Мы вітаем удзел Беларусі ва Усходнім партнёрстве і намер беларускіх уладаў правесці грамадскія слуханні па пытанні маратэрыю на смяротную кару, — акцэнтуе пасол Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі.

Аднак далей за дасягненні, як заўжды, крочаць чаканні:

— Мы спадзёмся на вялікі прагрэс у галіне лібералізацыі ў Беларусі.

**Ала МАЧАЛАВА.**

МАЛАДАЯ ВУЛІЦА



Новы пасёлак у вёсцы Баравая Лельчыцкага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Курманбек БАКІЕЎ:

# «ПРАШУ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ АКАЗАЦЬ ГУМАНІТАРНУЮ ДАПАМОГУ ПАЦЯРПЕЛЫМ»

**У МІНСКУ прайшла прэс-канферэнцыя Курманбека Бакіева. Ініцыятарам чарговай сустрэчы з беларускімі журналістамі выступіў сам прэзідэнт Кыргызстана (паводле яго слоў, паўнамоцтвы прэзідэнта юрыдычна ён яшчэ не складаў), які пакінуў краіну пасля ўзброенага захопу ўлады апазіцыяй. Курманбек Саліевіч прызнаўся, што не можа проста сядзець і моўчкі назіраць за тым, што адбываецца сёння на яго радзіме.**

### «ПРАШУ АДКБ ПРЫСЛАЦЬ ВОЙСКІ Ў КЫРГЫЗСТАН»

Прычынай міжнацыянальнага канфлікту, які адбыўся ў горадзе Ош, як паведаміў Бакіеў, паслужыла элементарная бытавая сварка.

— У нейкім казіно гэтага горада паміж маладымі хлопцамі кіргізскай і ўзбекскай нацыянальнасцяў адбылася сварка. І замест таго, каб пагасіць і хутка зрэагаваць на гэтую сварку, і мясцовыя органы ўлады, і часовы ўрад ці праігнаравалі, ці зрабілі выгляд, што з гэтага нічога не можа адбыцца. У выніку адбылося страшнае: бязладдзе на поўдні краіны прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяр, я ўжо не кажу пра раненых і бежанцаў. І ў гэтым члены часовага ўрада, як гэта ў іх прынята, зноў-такі абвінавачваюць мяне і членаў маёй сям'і. Але ўсе мае блізкія, вы ж у курсе, на ўцёках у розных краінах. Я не кантактую з імі, бо гэта небяспечна.

Спадар Бакіеў заверыў, што практычна («ну, магчыма, маю некалькі тэлефонных размоў з асобнымі членамі былога парламента») не падтрымлівае стасункаў і з былымі членамі ўрада, кіраўнікамі міністэрстваў і ведамстваў.

— Практычна ўсе, з кім я працаваў, таксама на ўцёках. Адзінкі засталіся ў Бішкеку. У дачыненні да іх заведзены надуманыя крымінальныя справы. Іх запалохваюць, пагражаюць, захопліваюць маёмасць. І яны не ўмешваюцца ва ўнутраныя справы Кыргызстана, згодны на ўсё, каб толькі не чапалі іх дзяцей. Адным словам, бязладдзе, якое пачалося з самага пачатку ўзброенага нападу на Белы дом, працягваецца і па сёння.

Курманбек Бакіеў прызнаўся, што не верыць у тое, што часовы ўрад Кыргызстана здольны спыніць кровапраліцце, бо «ён абсалютна не кантралюе сітуацыю ў краіне. Калі б яны кантралявалі сітуацыю, то такога б не дапусцілі». Ён лічыць, што стабілізаваць сітуацыю ў Кыргызстане, дзе ўспыхнулі сутыкненні на міжнацыянальнай глебе, у сілах толькі калектыўныя сілы аператыўнага рэагавання АДКБ.

— Пасля ўзброенага захопу ўлады ў Кыргызстане праваахоўныя органы, сілавыя структуры цалкам дэмаралізаваныя. Яны не могуць нічога рабіць. Як у такой сітуацыі можна забяспечыць бяспеку грамадзян? Толькі за кошт знешніх сілаў. Трэба ўводзіць у рэспубліку сілы АДКБ, я казаў пра гэта, яшчэ калі (у красавіку) прайшоў штурм Белага дома і Бішкек гарэў і палаў. Інакш чалавечыя ахвяры могуць яшчэ ўзрасці. Хачу яшчэ раз звярнуцца да кіраўнікоў краін — членаў АДКБ з просьбай больш аператыўна і адэкватна адрэагаваць на сітуацыю ў Кыргызстане, дапамагчы народам, якія пражываюць там, аднавіць стабільнасць і парадак.

### «СЯМ'Я БАКІЕВЫХ ЗАЎСЁДЫ БЫЛА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ»

Вялікія спадзяванні спадар Бакіеў ускладае і на мудрасць двух брацкіх народаў, узбекскага і кіргізскага.

— Гістарычна мы заўсёды жылі разам, працавалі разам, у нас вельмі шмат змешаных шлюбаў, і наогул дзяліць там няма чаго. Наша сям'я, сям'я Бакіевых, заўсёды была інтэрнацыянальнай. Бацькі нас выхоўвалі ў такім духу. У нас рускія нявесткі, ёсць узбечкі, ёсць татары. Усе ведаюць, што сям'я Бакіевых жыла ў міры і згодзе. Я заклікаю членаў часовага ўрада Кыргызстана, спадарыню Атунбаеву, Бекназарава і ўсіх астатніх, не эмацыйныя заявы рабіць (яны вельмі любяць гаварыць, праводзіць прэс-канферэнцыі), а справай займацца. Чым валіць з хворай галавы на здаровую, абвінавачваючы мяне, маіх родных і папярэдняе кіраўніцтва, ды займацца ганеннямі, лепш бы пастараліся зняць напружанне, урэгуляваць сітуацыю. Гаворка ж ідзе пра бяспеку людзей.

Карыстаючы магчымасцю, Курманбек Бакіеў звярнуўся з просьбай і да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аказаць пацярпелым гуманітарную дапамогу.

— Не часоваму ўраду Кыргызстана, а народу Кыргызстана, тым, хто пацярпеў, сем'ям кіргізскага і ўзбекскага народаў. Бо нічога зараз там не працуе, усё разрабавана, усё гарыць. І проста можа здарыцца так, што людзям элементарна не будзе чаго есці.

### «Я НЕ ТРЫМАЮСЯ ЗА ГЭТУЮ ЎЛАДУ»

Курманбек Бакіеў таксама заявіў, што не збіраецца вяртацца ў Кыргызстан у якасці прэзідэнта.

— Ходзяць чуткі, што я хачу вярнуцца ў Кыргызстан. Я пра гэта ўжо гаварыў некалькі разоў: такога і ў думках няма, быццам бы мы спрабуем перашкодзіць рэферэндуму. Ды калі ласка, хоць дзесяць рэферэндумаў праводзьце. Я не трымаюся за гэтую ўладу.

Больш за тое, Бакіеў з упэўненасцю заявіў, што палітыкай больш займацца не збіраецца.

— Зараз вывучаю беларускае заканадаўства. Я прыйшоў са сферы вытворчасці, таму гэта мне блізка. Хачу проста, як усе, хадзіць па горадзе, кантактаваць з нармальнымі людзьмі і радавацца таму, што жывым застаўся. Беларусь мне падабаецца, людзі гасцінныя і моўных праблем няма. Як доўга тут прабуду? Пакуль не думаў пра гэта. Зараз мяне больш за ўсё трывожыць сітуацыя ў Кыргызстане.

### «ЗА АПОШНІ ЧАС Я НІКУДЫ НЕ ВЫЯЗДЖАЎ З БЕЛАРУСІ»

**— Пэўны час гуляла інфармацыя, што Вы пакідалі Мінск, каб з'ездзіць на адпачынак у Турцыю, — пацікавіліся ў Курманбека Бакіева. — Гэта праўда?**

— Я нікуды не выязджаў. З першых дзён, як прыехаў у Беларусь, знаходжуся тут. Ні ў якой Турцыі я не быў. Калі б я быў там, то, напэўна, гэта схаваць было б немагчыма. За гэты час я пазнаёміўся з Мінскам, горад мне вельмі спадабаўся. Чыста, акуратна, дружалюбна. Прырода прыгожая, дажджоў, праўда, шмат. Раней я быў тут з афіцыйным візітам, таму практычна нічога не бачыў.

### «У ДАЧЫНЕННІ ДА МЯНЕ БЕСПАДСТАЎНА ЗАВЯЛІ КРЫМІНАЛЬНУЮ СПРАВУ»

— Мяне абвінавачваюць у тым, што я быццам бы перавысіў свае паўнамоцтвы і стварыў структуры, не прадугледжаныя законам, — адзначыў спадар Бакіеў. — Гэта надумана і не мае пад сабой ніякой падставы. Як можна распачынаць такія крымінальныя справы, не разабраўшыся?

Ён нагадаў, што прыйшоў да ўлады ў сакавіку 2005 года. Працаваў ў межах Канстытуцыі. За пяць гадоў яго каманда змагла павялічыць дзяржаўны бюджэт у 3,5 раза.

— Мы рабілі сваю справу: будавалі новыя школы, дарогі, павышалі зарплаты, пенсіі. А апазіцыя ў гэты час мітынгавала, патрабавала адстаўкі прэзідэнта. Я думаў: няхай крычаць, нічога страшнага, усё ж такі дэмакратычная краіна. Менавіта яны, арганізатары гэтых мітынгаў, і захапілі ўладу ў Кыргызстане. Улада не змагла сябе абараніць: праваахоўныя органы аказаліся негатовымі да ўзброенага захопу.

Напрыканцы сустрэчы Курманбек Бакіеў выказаў меркаванне, што ў сувязі з падзеямі, якія адбываюцца, кыргызстанскія бізнэсмены і інтэлігенцыя пачнуць выязджаць з краіны.

— Эканоміка ды і наогул імідж Кыргызстана моцна ўпалі. Вельмі цяжка будзе ўсё аднаўляць. Але я спадзяюся, што ў кыргызскага народа і ў іншых нацый і народнасцяў, якіх на тэрыторыі краіны больш за 80, хопіць сілаў, мудрасці, вытрымкі, цярпення і разважлівасці, каб аднавіць краіну.

**Надзея ДРЫЛА.**

# БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЦІ МОГУЦЬ ПРАЙСЦІ АЗДАРАЎЛЕННЕ Ў БОЛЬШ ЧЫМ 5 ТЫСЯЧАХ ЛАГЕРАЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Скончыўся чарговы навучальны год. Першы летні месяц у самым разгары. Школы, летнія лагеры і санаторыі, базы адпачынку і палаткавыя стаянкі напоўніліся вясёлай дзіцячай мітуснёй. Дзеці заўсёды з нецярпеннем чакаюць канікулаў, сонца, вады. І, вядома ж, як і дзецям, так і іх бацькам вельмі хочацца, каб адпачынак прайшоў змястоўна і цікава. Пра тое, як правесці летнія месяцы з карысцю для розуму і здароўя, што трэба ведаць бацькам, якія адпраўляюць дзіця ў лагер, расказвае начальнік упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Беларусі Віктар Якжык.**

***— Віктар Віктаравіч, з пачаткам летняга аздараўленчага сезону многія школьнікі ўжо адправіліся ці яшчэ паедуць адпачываць у дзіцячыя аздараўленчыя лагеры. Што робіцца на месцах па арганізацыі адпачынку?***

— У Беларусі кожнае лета тысячы дзяцей і падлеткаў могуць адпачыць у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях. У горадзе функцыянуюць лагеры дзённага знаходжання, размешчаныя на тэрыторыі навучальных устаноў, цэнтраў пазашкольнай працы. Таксама ўсе аб'екты агра-і экатурызму даюць магчымасць арганізаваць паўнавартасны адпачынак.

Галоўнае, што мы разглядаем летні адпачынак не толькі як час умацавання здароўя, але і як перыяд для фізічнага і творчага развіцця дзяцей. Прычым, калі казаць пра традыцыі, то ў Беларусі падрыхтоўку летняй аздараўленчай кампаніі педагогі, метадысты пачынаюць яшчэ ўзімку. Першым чынам мы імкнёмся высветліць колькасць дзяцей, якім будзе неабходны адпачынак у лагеры. Таксама пачынаем падбіраць кандыдатуры педагогаў, якія хочуць працаваць у аздараўленчых лагерах. І трэці складнік — арганізуем мэтавыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы дарослых (кіраўнікоў і педагагічных работнікаў) да летняй аздараўленчай кампаніі, распрацоўваем метадычныя матэрыялы, каб зрабіць адпачынак дзяцей паўнавартасным.

***— Пра што павінны нагадаць бацькі дзецям, адпраўляючы іх у лагер? І ў цэлым, якія прадпрымаюцца крокі па забеспячэнні бяспекі ў аздараўленчых арганізацыях?***

— Падчас прыёмкі лагера даюцца заключэнні на прадмет бяспекі тэрыторыі, водных аб'ектаў, збудаванняў, адпаведнасці спартыўнага і гульнявога інвентару нормам бяспекі. Перад правядзеннем розных мерапрыемстваў дзяцей знаёмяць з правіламі бяспечных паводзінаў. На гэта зарыентаваны ўвесь персанал, і ў першую чаргу педагогі і важатыя. Але і бацькі павінны расказаць дзецям пра паводзіны на дарогах, а таксама папярэдзіць, што любыя непрадуманыя свавольствы, у тым ліку і на вадзе, могуць прывесці да сумных наступстваў. Акрамя таго, неабходна нагадаць дзецям, што ў цёмны час сутак трэба пазначаць сябе флікерам.



Пры падрыхтоўцы дзіцяці да аздараўлення ў лагеры не можа быць нейкіх спецыяльных рэкамендацый. Усё індывідуальна і залежыць ад узросту хлопчыка ці дзяўчынкі. Разам з тым найбольш спрыяльным для знаёмства з аздараўленчым лагерам лічыцца дзіця васьмі-дзесяці гадоў. Аздараўленчы лагер — гэта ў тым ліку і час сталення. Дзецям даводзіцца ўсё выконваць самастойна: запраўляць пасцель, сачыць за чысцінёй адзення, прыбіраць свае рэчы, выконваць правілы гігіены і гэтак далей.

Вядома, дзяцей трэба настроіць на адпачынак далёка ад дому і растлумачыць, што яны не будуць там адзінокімі — побач будуць іх аднагодкі, а таксама педагогі і важатыя, да якіх можна звярнуцца з любым пытаннем, і яны заўсёды дапамогуць і падтрымаюць.

Бацькі павінны разумець, што ў першы раз ехаць у лагер дзіцяці цяжка, бо навізна і невядомасць часта палохаюць, таму ім, перш чым адправіць дзяцей, варта загадзя даведацца пра распарадак дня і мяркуемыя ў рамках змены мерапрыемствы і расказаць пра гэта дзіцяці. Нельга супраць волі адпраўляць дзяцей у лагер, хоць можна паспрабаваць пераканаць іх.

***— Як будзе арганізаваны адпачынак у аздараўленчых лагерах? Колькі здраўніц прымае гэтым летам беларускіх дзяцей на тэрыторыі краіны?***

— Традыцыйна адпачынак дзяцей праходзіць у аздараўленчых лагерах з кругласутачным і дзённым знаходжаннем. У летні перыяд плануецца аздаравіць больш за 418 тыс. дзяцей, што дазволіць ахапіць амаль 36 працэнтаў хлопчыка і дзяўчынак ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў. Гэтым летам у Беларусі будзе працаваць больш за 5 тыс. 380 лагераў розных тыпаў і профіляў, з якіх у 1 тыс. 490 — дзеці змогуць адпачываць кругласутачна. Астатнія лагеры разлічаны на дзённае знаходжанне.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Адпачываем і зарабляем

# ЯК СТУДЭНТУ ЗАРАБІЦЬ ЛЕТАМ МІЛЬЁН?

**Пачынаецца лета, а з ім завяршаецца яшчэ адзін навучальны год. У каго школьны, у каго — студэнцкі. Але не ўсе школьнікі, як і не ўсе студэнты, збіраюцца летам адпачываць. Для многіх — гэта неблагі шанц зарабіць. Якія магчымасці для гэтага існуюць?**

### На працу ў 14 гадоў

Што трэба для таго, каб на працу ўзялі школьніка? Па-першае, самому школьніку павінна быць не менш за 14. Па-другое, згода бацькоў, станоўчая характарыстыка са школы і медыцынская даведка формы 086/У. Дадаткова трэба зрабіць копію пасведчання аб нараджэнні і ўзяць накіраванне ў службе занятасці. І калі ласка — welcom to work! Але перш чым ісці працаваць, варта запомніць: працоўны дзень падлеткаў 14—16 гадоў не павінен перавышаць 4 гадзін 36 хвілін, моладзі з 16 да 18 — сямі гадзін. Зарплата школьнікаў — пагадзінная, у памеры не ніжэй за месячную зарплату звычайнага работніка.

Школьнікі, паводле звестак БЕЛТА, могуць знайсці сябе на азеляненні вуліц, рамонце школьнага інвентару і добраўпарадкаванні тэрыторый.

### Куды ісці і што шукаць

Каб даведацца, ці ёсць для вас вольныя вакансіі, найперш варта звярнуцца ў раённы аддзел працаўладкавання. Добрым дарадцам стане таксама БРСМ. Дадаткова можна звярнуцца ў Моладзевую сацыяльную службу і Лігу добраахвотнай працы моладзі.

Студэнтам у гэтым плане прасцей: калі пашанцавала і запісаўся ў студатрад, шанцы зарабіць нядрэнныя грошы ўзрастаюць. Але тут усё залежыць ад характару атрадаў. Найбольшы заробак у будаўнічых атрадах — Br 500 тыс.— Br 1,5 млн, але і праца тут адна з самых складаных.

Сельскагаспадарчыя атрады дадуць студэнтам магчымасць зарабіць каля Br 200 тыс., столькі ж — сэрвісныя, педагагічныя крыху больш — Br300 тыс.

Калі ж вы вырашылі шукаць працу самастойна, то, як паказвае практыка, і заробак ваш будзе на парадак вышэй, чым у студатрадах. Напрыклад, студэнт-прамоўтар у сярэднім можа зарабіць Br500—Br800 тыс., прадавец — каля Br500 тыс., рэалізатар латарэйных білетаў — ад Br300 тыс., вартаўнік — ад Br500 да Br 1,2 млн, падсобны рабочы — ад Br500 да Br1 млн, тынкоўшчык — да Br1,5 млн.

Афіцыянты зарабляюць ад Br400 тыс. (плюс працэнты). Самая няўдзячная праца — расклейшчыка аб'яў. За тысячу расклееных лісткоў вам заплацяць толькі Br40 тыс.

Падрыхтаваў Ілья ЛАПАТО.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрапрас, кухонны камбайн, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **6 ліпеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 ліпеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 22.05.10 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 22.05.10 па 30.09.10.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1694 ад 13.05.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

7 **Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)
____________ на III кв. або 2-е паўг. 2010 года

Хатні адрас і тэлефон ____________
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

ПВ | месца | літар

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі ____ руб.; пераадрасоўкі ____ руб. Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)



# ДЗЯЎЧАТЫ — НА ЎПАКОЎКУ МАРОЖАНАГА, ХЛОПЦЫ — НА БУДОЎЛЮ

**Гродзенскі гарадскі камітэт грамадскага аб'яднання «БРСМ» на працоўны семестр «Лета-2010» планує працаўладкаваць не меншую колькасць моладзі, чым у мінулым годзе. Летась у адным сельскагаспадарчым, дзевяці будаўнічых, сямі валанцёрскіх, адзінаццаці сэрвісных і васьмі педагагічных студэнцкіх атрадах працавала больш за 4,5 тысячы маладых людзей.**

Пры гэтым кожны студэнт абавязкова застрахаваны, што абараняе не толькі на працягу васьмі гадзін, якія праводзяцца на вытворчасці, але і ўсе суткі.

Ужо традыцыйна студэнтаў у летні перыяд чакаюць у ААТ «Малочны свет», дзе яны (як правіла, гэта дзяўчаты) займаюцца ўпакоўкай марожанага. Летась месячны заробак не быў ніжэйшым за 500 тысяч, а сёлета можна спадзявацца і на большае. Зразумела, пры ўмове добрасумленнай працы, а таксама... адсутнасці запазычанасцяў па вучобе.

Дзявочыя рукі спатрэбяцца таксама на агароднінай фабрыцы, на кансервавым заводзе і шэрагу іншых прадпрыемстваў. А вось юнакоў чакаюць на будоўлях (ААТ «Гроднапрамбуд», будаўніча-мантажны трэст № 30 і інш.) Праўда, сёлета адбор у будаўнічыя арганізацыі больш жорсткі. Гэта звязана з тым, тлумачыць **першы сакратар Гродзенскага гаркама ГА «БРСМ» Святлана АМЕЛЬЧАНКА**, што летась не заўсёды строга выконваліся дагаворныя ўмовы. Дамовы з наймальнікамі заключаліся на два месяцы, аднак некаторыя «будатрадаўцы» ўжо праз тры тыдні давалі «зваротны ход», звальняліся. Мо нешта не спадабалася, не разлічылі свае магчымасці, ці па нейкай іншай прычыне ... У выніку ж — праблемы для наймальнікаў, паколькі запланаваныя аб'ёмы працы былі ўвязаныя з колькасцю работнікаў. А таксама — незадаволенасць студэнтаў заробкам, што звязана, зноў жа, з невыкананнем дагаворных умоў. У такім выпадку — голы, як кажуць, аклад і ніякай прэміі.

Тых, хто летась не выканаў дамову з наймальнікам, у банку звестак на сёлетні працоўны семестр няма. Затое цяпер ёсць кадры не толькі для так званай некваліфікаванай працы на будоўлях, але і там, дзе патрабуюцца спецыяльныя веды — іх рыхтуе будаўнічы факультэт Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы.

За даведкамі па пытаннях працаўладкавання моладзі на летні перыяд можна звяртацца:

*Гродзенскі гарадскі штаб працоўных спраў: тэл. 72 31 09*

*Штаб працоўных спраў ГрДУ імя Янкі Купалы: тэл. 74 29 99*

*Штаб працоўных спраў аграрнага ўніверсітэта: тэл. 74 16 66*

*Штаб працоўных спраў медыцынскага ўніверсітэта: тэл. 781 95 47 (МТС).*

Працаўладкавацца на лета студэнтам, а таксама школьнікам, якім ужо споўнілася 16 гадоў, дапаможа і гарадская служба занятасці. Летась было працаўладкавана больш за 1800 навучэнцаў, у асноўным ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў. Школьнікам, як правіла, прапануецца праца ў сваёй жа навучальнай установе, згодна з пералікам дазволеных работ. Гэта можа быць дробны рамонт, добраўпарадкаванне, азеляненне, магчыма, трэба будзе паклапаціцца пра кнігі ў бібліятэцы. У сярэднім, працуючы па дзве — тры гадзіны, можна за дзесяць дзён зарабіць 70—80 тысяч рублёў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

## НІ ХВІЛІНЫ — МАРНАТРАЎНА

**Такі дэвіз узялі за аснову арганізатары ваенна-патрыятычных лагераў для цяжкіх падлеткаў з Гомеля.**

Па ініцыятыве Упраўлення прафілактыкі УУС Гомельскага аблвыканкама, гарадскога аддзела адукацыі, камітэта БРСМ і камандавання вайсковай часці 5525 МУС Беларусі за лета плануецца арганізаваць працу 10 такіх лагераў для падлеткаў са складаным лёсам. Не толькі на базе вайсковай часці, але і на базе МНС, пры РАУС. Як паведаміў **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Гомельскага аблвыканкама Анатоль ВАСІЛЬЕЎ**, кандыдатаў у першы лагер падбіралі інспектары па справах няпоўнагадовых чатырох раёнаў Гомеля.

Ваенныя зараз праводзяць з 20 хлопчыкамі заняткі па фізічнай падрыхтоўцы, спартыўныя спаборніцтвы, вучэбныя стрэльбы ў ціры, а супрацоўнікі БРСМ і адукацыі арганізоўваюць наведванне выстаў, музеяў і іншых мерапрыемстваў. Кожнаму з юнакоў для гэтай мэты нават выдалі бясплатныя праязныя білеты. Кормяць падлеткаў таксама цэнтралізавана і без грошай — у сталоўцы сярэдняй школы № 39.

У праграме, падрыхтаванай дарослымі, побач з экскурсіямі на прадпрыемствы і ў тэхнічныя вучылішчы, станцыі юных тэхнікаў і Палац Паскевічаў — наведванне следчага ізалятара. Лепш там пабываць у якасці экскурсанта, раяць дарослыя і прапануюць такім чынам цяжкім падлеткам задумацца над сваімі паводзінамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

## ПРАВІНЦЫЙНЫ ЗААПАРК СТАНЕ САМЫМ ВЯЛІКІМ

### У Віцебскім заалагічным парку арганізавалі Свята лета

Сфатаграфавацца бясплатна з гіганцкай змяёй — альбіносам, замежнымі козамі, іншымі экзатычнымі жывёламі, паўдзельнічаць у розных конкурсах і віктарынах, атрымаць памятныя прызы — такія магчымасці былі ва ўсіх наведвальнікаў заапарка. Гадзінамі бацькі і дзеці знаёміліся з жывёламі.

**Дырэктар заапарка Аляксей АНДРЭЙКАЎ** і яго калегі ўпэўненыя, што заапарк — месца, дзе неабходна праводзіць такія цікавыя акцыі для ўсёй сям'і. Для гэтага ўжо многае зроблена. Нездарма ў апошні час менавіта віцебскі заапарк стаў адным з нямногіх у абласным цэнтры месцам, куды прыходзяць бавіць час усёй сям'ёй. Чэргі выстройваюцца ля клетак з малпамі, атракцыёнаў заапарку: электрычных аўтамабіляў, арэляў, горкі.

Між іншым, віцебскі заапарк па ініцыятыве **старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра КОСІНЦА** рыхтуецца пераехаць з цэнтра горада на жывапісную ўскраіну — недалёка ад новых мікрараёнаў. Пераезд звязаны з неабходнасцю павелічэння плошчаў «царства жывёл», каб яго жыхарам — братам нашым меншым было магчыма стварыць самыя ўтульныя ўмовы для пражывання.

Для гэтага ў лесе ля ўезда ў Віцебск — побач з міжнароднай трасай выдзелілі каля 100 гектараў зямлі. Актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі правялі суботнік па добраўпарадкаванні і прыборцы тэрыторыі будучага новага заапарка. Для параўнання, тэрыторыя існуючага заапарка — меней за 2 гектары. Тут жывуць прадстаўнікі больш за 50 відаў жывёл — па самых сціплых падліках болей за тысячу экзэмпляраў. Пераезд дазволіць павялічыць колькасць насельніцтва заапарка і правінцыйны заапарк па плошчы зможа стаць адным з самых вялікіх. Каб даць заапарку новае жыццё, прыцягваюць і інвестараў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

## ПАЧЫНАЮЦЬ РАБОТУ ШТАБЫ БРСМ «АБІТУРЫЕНТ-2010»

**Ва ўсіх ВНУ і ССНУ Беларусі 17 чэрвеня пачнуць работу штабы БРСМ «Абітурыент-2010». Такія штабы ствараюцца на час уступных кампаній для аказання дапамогі прыёмнай камісіі і паведамлення неабходнай інфармацыі абітурыентам, паведамілі нам у Цэнтральным камітэце моладзевай арганізацыі.**

Як паказвае досвед працы, па дапамогу ў штабы звяртаюцца ў большасці іншагароднія абітурыенты. Акрамя псіхалагічнага напружання ўступнай кампаніі, яны адначасова адчуваюць большы дыскамфорт з-за няведання горада, арганізацыйна-бытавых праблем, ды і адрыў ад роднага дома аказвае негатыўны ўплыў на псіхалагічны стан выпускніка. Звярнуўшыся да членаў штабоў, абітурыенты і іх родныя змогуць атрымаць кансультацыйную, маральна-псіхалагічную дапамогу, інфармацыю пра ўмовы паступлення ва ўстанову адукацыі, профілі спецыяльнасцяў.

Добраахвотнікі з ліку студэнцкай моладзі (сакратары пярвічак, актывісты БРСМ) працуюць у грамадскіх прыёмных камісіях ВНУ. Іх задача — праверыць правільнасць запаўнення тымі, хто паступае, заяў і анкет, інфармаваць аб тым, якія дакументы неабходна падаць у прыёмную камісію, адказаць на пытанні абітурыентаў і іх бацькоў. Гэты праект Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі рэалізуе ўжо некалькі гадоў запар. Інфармацыя аб працы штабоў размешчана на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі».

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## СПЯКОТНА І Ў ХАЛОДНЫЯ ДНІ

Цэнтралізаванае тэсціраванне ў БНТУ



# БЕЛАРУСКІЯ ДЗЕЦІ МОГУЦЬ ПРАЙСЦІ АЗДАРАЎЛЕННЕ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Больш 7 тыс. 800 дзяцей, у тым ліку цяжкіх падлеткаў, правядуць частку канікулаў у профільных абаронна-спартыўных лагерах на базе вайсковых часцей, якія арганізуюцца сумесна з Міністэрствам абароны, Міністэрствам унутраных спраў, Дзяржаўным памежным камітэтам і МНС. А ў цэлым у аздараўленчых лагерах экалагічнага, краязнаўчага, мастацкага, турысцкага і іншых профіляў адпачнуць амаль 30 тысяч дзяцей.

У Беларусі цэлы год працуе Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня». Сюды накіроўваюцца дзеці, якія маюць высокія вынікі ў навучальнай і грамадскай дзейнасці. На працягу года больш за 13 тысяч дзяцей заахвочваюцца паездкай у гэту ўстанову, бяруць удзел у цікавай, пазнавальнай дзейнасці, а, вярнуўшыся дамоў, марыць зноў вярнуцца ў «краіну дзяцінства Зубраня». Вопыт работы гэтай установы цікавы і для рэгіёнаў. Ужо сёння для дзяцей сталіцы круглы год працуе Мінскі гарадскі аздараўленчы лагер «Лідар». А ў перспектыве мы плануем стварыць падобныя адукацыйна-аздараўленчыя цэнтры ў кожнай вобласці краіны.

***— Якімі мерапрыемствамі будзе напоўнены летні адпачынак дзяцей?***

— Ва ўсіх аздараўленчых лагерах пройдуць мерапрыемствы рэспубліканскіх акцый і праектаў: «Здаровы я — здаровая краіна», «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» і іншыя. Дзеці разам з важатымі правядуць серыю творчых конкурсаў па пытаннях здаровага ладу жыцця і прафілактыкі шкодных звычак. Наогул гэтыя праекты доўгатэрміновыя — іх вынікам стане новы сайт для падлеткаў па пытаннях здаровага ладу жыцця, які распрацуюць і напоўняць самі дзеці. Міністэрства адукацыі таксама абвясціла пра правядзенне рэспубліканскай летняй акцыі «Лета — на здароўе!», накіраванай на правядзенне мерапрыемстваў, якія папулярызуюць рухомыя гульні, сярод якіх перавагу моладзь аддае футболу.

Будзе нададзена ўвага і працы з лідарамі дзіцячых і моладзевых грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку з прадстаўнікамі самых масавых — БРПА і БРСМ. А вось формы арганізацыі работы па лідарскім выхаванні ва ўмовах аздараўленчага лагера прапануюцца самыя розныя: школа юных лідараў, арганізацыйна-гульнявы праект, работа органаў дзіцячага самакіравання і інш.

Шмат мерапрыемстваў будзе прысвечана тэме 65-годдзя Вялікай Перамогі. На ўрачыстых лінейках і атрадных мерапрыемствах дзеці азнаёмяцца з гераічнымі старонкамі нашай гісторыі, успомняць баявыя подзвігі праслаўленых землякоў. Таксама адбудуцца сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай. Плануецца, што ўдзельнікі акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся» адправяцца ў турысцкія паходы, пройдуць па месцах баявой і працоўнай славы.

І, нарэшце, які ж лагер без ранішняй зарадкі! З улікам узросту дзяцей будуць прапанаваныя самыя разнастайныя віды гэтага ранішняга мерапрыемства: зарадка-гульня, зарадка на сцежцы здароўя, зарадка-фантазія, зарадка-аэробіка і інш.

На прапаганду здаровага ладу жыцця можа быць накіравана і дзіцячая творчасць: прапанаваныя конкурсы плакатаў, малюнкаў, фатаграфій дазволяць не толькі выказаць стаўленне да здароўя як неабходнага элемента агульнай культуры, але і напоўняць адпачынак дзяцей яркімі ўражаннямі.

**Юлія ВАНІНА, карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ДЫПЛОМ ЯК ФАРМАЛЬНАСЦЬ ЦІ НЕШТА ІНШАЕ?!

Вось і наступіла яно, тое самае доўгачаканае лета. Здаецца, пайсці б на пляж ды прабавіць там шмат часу. Або наогул з'ехаць куды падалей ад гарадскіх турбот і невыноснай гарачыні. Але дзе там. Час зараз гарачы і ў прамым і ў пераносным сэнсе для... студэнтаў. Менавіта ім зараз трэба наганяць усё тое, што было прапушчана падчас заняткаў, каб удала здаць сесію. Для кагосьці з іх яна будзе чарговай, а камусьці рыхтавацца да яе прыйдзецца ў апошні раз. Я маю на ўвазе студэнтаў-пяцікурснікаў. У іх наперадзе доўгачаканы дыплом, самастойнае жыццё і невядомая будучыня. Нехта пойдзе працаваць па спецыяльнасці, а для кагосьці паперчына, якую выдадуць пасля здачы дзяржіспытаў, так і застанецца проста фармальнасцю. І нават тыя планы на жыццё, якія цяпер ужо ёсць у кожнага, могуць змяніцца амаль што ў апошні момант. Гады праз два маладыя спецыялісты будуць з усмешкай разважаць пра ўсё, што адбылося. Вось толькі ці ўсе задаволеныя? Пытанне адмысловае. Менавіта яно мяне і зацікавіла.

Да нядаўніх студэнтаў, а цяпер маладых спецыялістаў, я вырашыла звярнуцца за своеасаблівай кансультацыяй. Усё ж такі і мне «свеціць» тая самая зорка, вобразна кажучы. А досвед папярэднікаў ніколі не бывае лішнім.

**Вольга Марціновіч, 24 гады.** Скончыла ўніверсітэт 2 гады таму па спецыяльнасці **«англійская мова»**. Зараз працуе ў школе **настаўніцай**. Вользе пашанцавала ў тым плане, што навучалася яна на платным аддзяленні. Таму адпрацоўка за бюджэтнае месца ёй не свяціла. Ды і з мужам Іванам таксама пашанцавала. Ён пачаў працаваць на фірме (якіх зараз, дарэчы, шмат) яшчэ студэнтам, там і застаўся пасля размеркавання. Маладым давялося пачакаць, пакуль Вольга скончыць навучанне ва ўніверсітэце (Ваня скончыў вучобу на год раней), каб справіць вяселле. Дзяўчына лічыць, што жаніцца падчас студэнтцтва — гэта глупства. Шмат яшчэ турботаў іншага плана. А сямейнае жыццё патрабуе даволі часу і намаганняў дзеля шчасця і бесканфлітнасці сумеснага жыцця.

Сядзець на шыі бацькоў не хацелася, — кажа Вольга. — Ды і, напэўна, губляць адчуванне таго, што ты студэнт, таксама. Я яшчэ да пятага курса любіла і па начных дыскатэках пахадзіць, і ў інтэрнаце з дзяўчатамі пабавіць час весела. А з мужам, калі ўсё так афіцыйна і абавязкова, ужо не нагуляешся. А там яшчэ і дзяржэкзамены здаць трэба, дыплом атрымаць. Даводзіцца пасядзець за падручнікамі ды канспектамі. Вучоба абавязвае да іншых інтарэсаў.

Затое цяпер Вольга працуе па спецыяльнасці і радуецца кожнаму дню, праведзенаму ў школе. Стаць настаўніцай — гэта была мара з самага дзяцінства. Праўда, знайсці вольнае месца аказалася не такой лёгкай справай. Чамусьці малады спецыяліст, без вопыту нікога не цікавіць. У многіх школах Вользе на пытанне **«Чаму не бераце на працу?»** так і адказвалі **«Таму што ў вас вопыту няма»**. Вось так. Тады сустрэчнае пытанне: а дзе ж яго ўзяць, гэты самы вопыт, калі працаваць не даеце магчымасці?

Шукаць месца пачала з ліпеня, амаль што адразу пасля таго, як атрымала дыплом на рукі, — расказала мне Вольга. — Хацелася ўзяцца за працу як мага хутчэй. Але няўдача за няўдачай. І прычына адна і тая ж. І ўжо тады, калі надзея была амаль што страчаная, знайшлося месца і для мяне. Сцвярджальны адказ наконт свайго працаўладкавання пачула 29 жніўня.

Заробак, па словах Вольгі — слёзы. Муж ёй адразу сказаў, што працуе яна не дзеля грошай. Сям'ю забяспечвае ён, а свой заробак Вольга растрачвае на асабістыя патрэбы: касметыка, паперы, асадкі, алоўкі і іншае гэтага кшталту.

Вядома, заробак у настаўніка, а тым больш без стажу, зараз мізэрны. Стаўка афіцыйна 300—350 тысяч. Плюс прэмія, надбаўкі за сшыткі, класнае кіраўніцтва і гэтак далей. У выніку атрымліваецца тысяч 500. І гэта з улікам таго, што шмат асабістых грошай даводзіцца затрачваць на працоўныя патрэбы. Напрыклад, падпіску на розныя выданні.

Каб зарабіць крыху больш, Вольга падпрацоўвае рэпетытарам. Прычым бярэ адразу па чатыры-пяць чалавек. Часу вольнага амаль што не застаецца. Жыццё размеркавана паміж працай і сям'ёй.

— Нягледзячы на такі тэмп, — кажа Вольга, — сваім жыццём я задаволена. Шчыра кажучы, назад ва ўніверсітэт вярнуцца не хачу. Студэнцтва, безумоўна, самы вясёлы час у жыцці. Але і самы турботны таксама. Гэтыя сесіі, канспекты, лекцыі і пастаянная прага да самастойнасці, якую я атрымала нарэшце. Цяпер не мяне экзаменуюць, а я правяраю веды і выстаўляю адзнакі. Гэта даволі прыемны аспект. Ды і працаваць з дзецьмі — занятак вельмі цікавы.

А **Сяргей Галавач**, які скончыў універсітэт амаль што **4 гады таму**, сумуе па тым часе, калі можна было спаць на занятках і весела адпачываць з суседзямі па інтэрнацкім пакоі. Зараз іншыя турботы: сям'я, праца, пастаянная прага да грошай, якіх, чамусьці, заўсёды не хапае.

— Не скажу, што падчас студэнцкіх гадоў грошай хапала на ўсё і заўсёды, — кажа Сяргей. — Затое мы былі вялікай сям'ёй. І не турбаваліся, што сёння атрымаем вымову за прагул. Заўсёды можна было дамовіцца са старастай.

Сяргей працуе па спецыяльнасці, але ўжо сумняваецца, ці правільна быў зроблены выбар.

«Не скажу, што я вельмі захоплены працай. Але і адмоўных эмоцый таксама не адчуваю, калі прыходжу на працоўнае месца. Усё неяк абыякава. Таму і хочацца нечага новага, пазітыўнага. Нават з'явілася ідэя пайсці на атрыманне другой вышэйшай адукацыі. Але гэта калі час дазволіць. Зараз шмат праектаў на асноўным месцы».

Сяргей раіць будучым студэнтам сто разоў падумаць, перш чым падаваць дакументы ў пэўную навучальную ўстанову. Лепш адразу пасумнявацца, чым пасля забраць дакументы ці вучыцца з нянавісцю ў сэрцы да спецыяльнасці, якую асвойваеш. Калі вучоба да сэрца не ляжыць, то могуць узнікнуць праблемы з узаемаразуменнем з выкладчыкамі і аднагрупнікамі.

**І не трэба «цягнуць» вучобу толькі дзеля бацькоў.** Многія мае знаёмыя так вучыліся, але нічым добрым такое навучанне не скончылася. Дыплом яны атрымалі, а вось задавальненне наўрад ці. Ды і працаваць па ім не пайшлі. Яго наяўнасць была толькі галачкай у графе працадаўцы аб вышэйшай адукацыі.

А вось наконт студэнцкіх шлюбаў у Сяргея іншае меркаванне.

— Калі каханне сапраўднае, то, на мой погляд, можна жыць і ў студэнцкім інтэрнаце на адну стыпендыю. Галоўнае — каб разам. А штамп у пашпарце — гэта такая фармальнасць на самой справе. І пагуляць можна, і павучыцца, калі загадзя дамовіцца са сваёй другой паловай аб планах.

**Максім Барысевіч** у свае **25 гадоў** працуе па спецыяльнасці, атрыманай ва ўніверсітэце — **менеджарам па турызме**. Праўда, далася яна не так лёгка. Давялося шмат кніжак прачытаць, значную колькасць навуковых прац напісаць, каб абараніць чырвоны дыплом. Выдатнікам ён быў на працягу ўсіх пяці гадоў навучання ва ўніверсітэце. Навукі даваліся лёгка. Так пайшло яшчэ са школы. Праўда, усё студэнцкае жыццё вось так і прайшло ў пастаянных паходах па бібліятэках і напісанні рэфератаў. Трэба было трымаць марку. Нават па начных дыскатэках пахадзіць часу не было. А з чацвёртага курса дабавілася яшчэ і праца. Хацелася незалежнасці. Ды і пра размеркаванне надыйшоў час падумаць.

Праўда, — кажа Максім, — чамусьці, калі я ўладкоўваўся на працу, ніхто і не запытаўся, якія адзнакі стаяць у маёй залікоўцы. Галоўным для майго наймальніка быў графік працы і яе якасць. Чым больш я працаваў, тым больш умацоўваўся на месцы. Можа, адзнакі — гэта і не асноўнае. Галоўнае, каб чалавек умеў за жыццё ўхапіцца. А залікоўкай наўрад ці ўдасца зрабіць гэта трывала. Я ведаю, што многія двоечнікі з маёй групы, якія хадзілі па два разы на пераздачы падчас сесіі, цяпер сталі сур'ёзнымі людзьмі. Яны зарабляюць немалыя грошы і, дарэчы, не ўсе працуюць па спецыяльнасці. Галоўным пры іх працаўладкаванні была наяўнасць дыплома з вышэйшай адукацыяй. Вось табе і статыстыка!

А вось, напрыклад, мая **сяброўка Хрысціна** збіраецца паступаць у гэтым годзе ва ўніверсітэт, і абавязкова тэхналагічны. На сучасны момант гэта мэта яе жыцця, якая не спраўдзілася адразу пасля заканчэння школы: не хапіла балаў. Але, разумеючы, як цяжка бацькам будзе выцягнуць яе вучобу, Хрысця збіраецца на завочнае аддзяленне. Зараз яна працуе прадаўцом, дзе і плануе застацца. Вучыцца дзяўчына ідзе з разлікам на будучыню.

— Я разумею, што зараз без вышэйшай адукацыі ўладкавацца на нармальную працу з высокім заробкам немагчыма. Усюды пытаюцца дыплом і пажадана, каб ён быў з універсітэта ці інстытута. Вось і іду атрымліваць адукацыю. Тэхналагічны ўніверсітэт абраны невыпадкова: спецыфіка майго мыслення найбольш прыдатная да спецыяльнасцяў такога кшталту. Ды і не хочацца ісці туды, куды душа не ляжыць, толькі з-за малога конкурсу ці нізкага прахаднога бала. Мне падаецца, што ўсё ў жыцці павінна знаходзіцца на сваім месцы. І спецыялісты ў першую чаргу. Хто на што здатны!

Я падтрымліваю слушную думку, выказаную Хрысцяй. Усё ў гэтым жыцці павінна знаходзіцца на сваіх месцах. І абіраць дзеля будучыні неабходна тое, што ляжыць да душы. А інакш якое жыццё ў нас атрымаецца? Пераблытаныя фігуркі могуць збіць ход усёй гульні, і давядзецца пачынаць усё нанава. Толькі вось як адразу зразумець, што гэта тваё месца, і пазбегнуць памылкі, якая можа змяніць усё жыццё? Гэтаму ва ўніверсітэтах не вучаць. Такую навуку трэба спасцігнуць самому.

**У пытаннях атрымання дыпломаў і ступені іх неабходнасці разбіралася студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.**

## З ВЕНЕСУЭЛЫ — У БЕЛАРУСКУЮ ГЛЫБІНКУ

**У Пастаўскім раёне ўпершыню выберуць першую прыгажуню. Атрымаць тытул «Пастаўская прыгажуня-2010» пажадалі дзясяткі дзяўчат.**

Конкурс гармоніі і грацыі душы і цела правядуць у рамках XX юбілейнага міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», які ў гонар свайго юбілею стане самым маштабным за ўсе гады правядзення. У прыватнасці, сёлета на фестываль запрасілі і таленты з-за мяжы. Нават з далёкай Венесуэлы.

Гасцям, безумоўна, будзе што паказаць і чым здзівіць у старажытных Паставах. Між іншым, канцэрты адбудуцца не толькі ў раённым цэнтры, але і ў вёсках, аграрных гарадках. Фестываль пройдзе 2—4 ліпеня. Тэатралізаваны паказ, святочны баль, кірмашы — усё гэта і не толькі будзе на фестывалі ў глыбінцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Яна і Ён

## Шлюб — не прычына не хадзіць на спатканні

**Муж і жонка павінны абавязкова прызначаць спатканні адно аднаму, каб умацаваць пачуцці.**

Уся іронія сямейнага жыцця заключаецца ў тым, што двое доўгія гады жывуць разам пад адным дахам, але рэдка знаходзяць час для таго, каб хаця б пагаварыць. Дзеці, побыт, сябры, сваякі — усё гэта забірае тую невялікую колькасць вольнага часу, які застаецца пасля працы. Між тым, без такіх размоў і сустрэч шлюб страчвае ўсякую рамантыку. А без яе і мужчынскае, і тым больш жаночае сэрца пачынае сумаваць.

Нядаўна адзін з брытанскіх сайтаў знаёмстваў прапанаваў новую паслугу — «спатканне мары» для сямейных пар. «Падобныя спатканні вяртаюць вас у той час, калі вы толькі сустрэліся адно з адным. Уваскрашаюць у вашых сэрцах нецярпенне, хваляванне і захапленне. Вы зноў адчуеце сябе, як у маладосці», — сцвярджаюць заснавальнікі сайта.

Псіхолагі настойліва раяць хаця б раз у месяц наладжваць падобныя спатканні. І, вядома ж, не ў хатняй абстаноўцы, дзе даўно знаёмы кожны куток, а ў суседнім пакоі спяць дзеці. Выбірайце самыя рамантычныя месцы для сустрэч — ад папулярнай кавярні да аквапаркаў і прагулачных цеплаходаў.

Пра што гаварыць на такіх спатканнях, калі свайго кавалера вы ведаеце ўжо не першы дзясятак гадоў? Ды ўсё пра тое ж, што было цікавым і падчас першых спатканняў — кіно, захапленні, планы на будучыню. Пацалункі крадком, асцярожныя дотыкі пад сталом, збліжэнне целаў у цёмнай зале кінатэатра — усё гэта можна і трэба адрадзіць, таму што без падобнай рамантыкі любы шлюб асуджаны на нуду і руціну. І калі вы не запросіце свайго мужа на спатканне ў гэтыя выхадныя, то ў наступныя ён можа запрасіць каго-небудзь яшчэ.

## Пасляродавая дэпрэсія ў мужчын

**Вучоныя прыйшлі да нечаканай высновы — пасляродавая дэпрэсія накрывае не толькі прыгожы пол. Маладыя бацькі пакутуюць ад гэтай немачы прыкладна ў такой жа колькасці, што і жанчыны. 10 % прадстаўнікоў моцнага полу праходзяць праз дэпрэсію незадоўга да нараджэння малога або неўзабаве пасля. А да таго моманту, калі дзіцяці спаўняецца тры месяцы, пасляродавая дэпрэсія ахоплівае ўжо 25 % мужчын.**

Пры гэтым амерыканскія даследчыкі асабліва падкрэсліваюць, што прычына ўзнікнення такой дэпрэсіі ў мужчын не падобная на жаночую прычыну. Калі маладых мам сумаваць прымушаюць гармаенальныя змены ў арганізме, то таты пакутуюць ад цяжкага грузу бацькоўства, які зваліўся на іх. Маладыя бацькі маркоцяцца аб тым, што цяпер іх жыццё стане значна менш свабодным і незалежным, ім давядзецца здабываць сродкі на пражытак не толькі сабе, а і жонцы з дзіцем. На шчасце, як правіла, гэта дэпрэсія праходзіць за некалькі тыдняў. Радасны смех немаўляці, як высветлілася, з'яўляецца для татаў і мам самым лепшым антыдэпрэсантам.

## Жанчыны пачалі выкрываць мужоў праз інтэрнэт

**Нават тыя прадстаўніцы цудоўнага полу, якім не патрэбны асаблівыя IT-навыкі, акрамя звычайнага для сучаснага чалавека ўмення адкрываць сайты ў інтэрнэце, наведваць сацыяльныя старонкі і адпраўляць пошту, цяпер усё часцей становяцца вельмі дасведчанымі ў камп'ютарных адносінах. Гэта звязана не з жаданнем далучыцца да захапляльнага свету высокіх тэхналогій, а з імкненнем шпіёніць за мужамі.**

Яшчэ ўчора мужы маскіравалі тэлефонныя размовы з палюбоўніцамі пад дзелавыя званкі і хавалі інтымныя запіскі ў патайныя кішэнькі. Сёння асабістае жыццё моцнага полу, як правіла, працякае ў інтэрнэце. І мужчыны зусім не такія недальнабачныя, каб лічыць сваіх жонак і сяброўак зусім няздольнымі высачыць іх здрады. Таму мужы ідуць на розныя хітрыкі. Напрыклад, мяняюць уласцівасці папак, забараняюць прагляд скрытых файлаў. Такім чынам можна замаскіраваць і фотаздымкі мілай сяброўкі, і яе лісты. Мужы рэгулярна выдаляюць са сваіх паштовых скрынак пісьмы, якія іх кампраметуюць, сочаць, каб у ліку новых сяброў на сацыяльных старонках не з'яўлялася «падазроных» дзяўчат.

Але ўсё больш жонак вучацца выкрываць здрады сваіх мужоў. Цяпер прадстаўніцы слабага полу ўмеюць праглядаць і скрытыя файлы, яны рэгулярна глядзяць паштовую карзіну сваіх мужоў, таму што ведаюць, што пісьмы адтуль не выдаляюцца адразу. А дзе-небудзь на «Аднакласніках» можна высачыць, хто менавіта наведваў старонку твайго выбранніка, калі ты, зразумела, маеш туды доступ. Ну і самым выпрабаваным сродкам праверкі з'яўляецца інтэрнэт-раман з уласным мужам пад падстаўным нікам на сацыяльнай старонцы і з чужымі фотаздымкамі сэксуальнай дзяўчыны. Можна толькі пашкадаваць здрадніка, які адправіцца на спатканне з гэтай несапраўднай спакусніцай.

## Колькасць «мамчыных сынкоў» расце

**Мужчыны ўсё часцей застаюцца жыць са сваімі бацькамі, заўважана Нацыянальным статыстычным упраўленнем Вялікабрытаніі.**

Паводле звестак вучоных, сёння з бацькамі жыве чвэрць мужчын ва ўзросце ад 25 да 29 гадоў і кожны дзясяты мужчына ва ўзросце ад 30 да 34 гадоў. Спецыялісты адзначаюць, што за 10 гадоў абодва паказчыкі павялічыліся амаль на 10 %. У справаздачы, выкладзенай на сайце арганізацыі, гаворыцца, што некаторыя мужчыны пакідаюць бацькоўскі дом, але вяртаюцца, страціўшы працу і сутыкнуўшыся з недахопам грошай. Іншыя застаюцца пасля заканчэння вучобы, паколькі яшчэ не зрабілі кар'еру і вымушаны выплачваць даўгі, назапашаныя падчас вучобы. Яшчэ адна частка мужчын позна ўступае ў шлюб або вяртаецца дадому пасля разводу.

Жанчын жа, якія жывуць з бацькамі, значна менш. Яшчэ не пакінулі бацькоўскі дом толькі кожная восьмая ва ўзросце ад 25 да 29, і кожная дваццатая ва ўзросце ад 30 да 34 гадоў.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Хочаце — верце...

# ЯК ЗАЧАЦЬ ДЗІЦЯ ЖАДАНАГА ПОЛУ?

## АСТРОЛАГІ ПРАПАНУЮЦЬ НЕКАЛЬКІ МЕТАДАЎ

### Метад энергій

Паводле сцвярджэнняў астролагаў, пол дзіцяці залежыць ад таго, у каго з бацькоў больш моцная энергія (калі ў таты — то народзіцца хлопчык, калі ў мамы — дзяўчынка). Вызначыць гэта можна, выявіўшы энергетычныя ўздымы і спады абодвух бацькоў.

Уздым энергіі назіраецца адразу пасля дня нараджэння (гэта адносіцца да ўсіх людзей). У жанчын уздым доўжыцца тры месяцы, наступныя тры месяцы ідзе спад, потым — ізноў трохмесячны ўздым. У мужчын адзін перыяд цыкла займае чатыры месяцы.

Для вызначэння патрэбнай даты зачацця трэба накласці графікі ўздымаў і спадаў энергій абодвух бацькоў. Для нагляднасці графікі можна намаляваць на паперы, падзяліўшы прамую лінію на 12 месяцаў. Кропкай ці літарай «Ж» ад дня нараджэння жанчыны адзначыць перыяды па тры месяцы, а ад дня нараджэння мужчыны — кропкай і літарай «М» перыяды па чатыры месяцы. У прамежкі часу паміж «М» і «Ж» будзе зачаты хлопчык, а ў прамежкі паміж «Ж» і «М» — дзяўчынка. На графіку могуць аказацца прамежкі паміж дзвюма «Ж». У гэты перыяд можа быць зачаты і хлопчык, і дзяўчынка.

### Метад Месяца

Пол дзіцяці можна вызначыць па тым, у якім задыякальным знаку ў дзень зачацця знаходзіўся Месяц.

Усе знакі задыяка можна падзяліць на жаночыя і мужчынскія. Жаночымі лічацца: Цялец, Рак, Дзева, Скарпіён, Казярог, Рыбы. Мужчынскімі — Авен, Блізняты, Стралец, Леў, Вадалей, Шалі. Калі зачацце адбывалася пад мужчынскім знакам — народзіцца хлопчык, а калі пад жаночым — дзяўчынка. Аднак Месяц знаходзіцца ў адным знаку не больш за двое — трое сутак, а сперматазоід можа злучыцца з яйцаклеткай аж праз 48 гадзін пасля палавога акта, таму зачынаць дзіця варта ў момант, калі Месяц толькі-толькі ўвайшоў у патрэбны вам знак.

### Метад спрыяльнага дня

Кожны дзень тыдня адносіцца да той ці іншай планеты, а таму таксама ўплывае на пол дзіцяці. Для зачацця хлопчыка лепш за ўсё падыходзяць чацвер і нядзеля, бо імі кіруюць Юпітэр і Сонца. Дзяўчынку лепш за ўсё зачаць у панядзелак ці пятніцу. Гэтымі днямі кіруюць Месяц і Венера. А вось у аўторак, сераду і суботу лепш наогул устрымацца ад зачацця, бо планеты гэтых дзён правакуюць нараджэнне нездаровых дзяцей.

### Метад правільнага харчавання

Ва ўсходняй філасофіі і медыцыне існуе вельмі важнае паняцце адзінства дзвюх супрацьлегласцяў, уласцівага ўсяму жывому — Інь і Ян. Ян сімвалізуе мужчынскі пачатак, Інь — жаночы.

Для таго, каб зачаць хлопчыка, неабходна харчавацца прадуктамі, якія валодаюць моцнай энергетыкай Ян. Гэта — рыс, проса, морква, ялавічына, селядзец, цыбуля, капуста, бабы, рыба, качка. Прычым рэкамендаваныя стравы павінны быць вострымі і гарачымі. Такая ежа дапамагае напоўніцца мужчынскай энергіяй.

Для таго, каб зачаць дзяўчынку, раяць сілкавацца Інь-прадуктамі: буракамі, агуркамі, мёдам, садавіной, памідорамі, маслам, кефірам, бульбай.

Такую дыету мае сэнс пачынаць за паўгода да зачацця дзіцяці. Толькі ў гэтым выпадку яна падзейнічае.

### Як зачаць ЗДАРОВАЕ дзіця?

Нельга зачынаць дзіця ў поўню ці маладзік, а тым больш — падчас месяцовага ці сонечнага зацьмення. Лічыцца, што дзеці, зачатыя ў гэтыя перыяды, нараджаюцца хворымі, неданошанымі, у маці можа адбыцца і выкідыш.

Для таго, каб абраць найбольш спрыяльны для зачацця дзень, неабходна скласці асабісты гараскоп жанчыны. У дзень зачацця Сонца павінна знаходзіцца ў выгадным становішчы адносна Урана, Плутона, Сатурна і Нептуна. З дапамогай гараскопа можна загадзя выявіць і самыя неспрыяльныя дні для зачацця.

Паводле ўсіх вераванняў, ні ў якім разе нельга ўмешвацца ў працэс нараджэння дзіцяці. Выключэннем з'яўляюцца толькі выпадкі, калі ёсць пагроза для жыцця маці. Нельга рабіць кесарава сячэнне толькі для таго, каб не мецьболю падчас родаў.

### Узрост бацькоў і пол дзіцяці

Калі мужчына ўжо не малады і не мае моцнага здароўя, то верагоднасць таго, што ён стане бацькам хлопчыка вельмі нізкая. Паводле закона прыроды, мужчыны ва ўзросце часцей зачынаюць дзяўчынак.

У гарачае надвор'е часцей зачынаюцца хлопчыкі, у халодны час — дзяўчынкі. Чым маладзейшая жанчына, тым большая верагоднасць таго, што яна народзіць хлопчыка.

Калі мужчына вымушаны працаваць ва ўмовах недахопу кіслароду, напрыклад пад зямлёй, у шахце, у гарах, у гарачым цэху і г.д., то ў яго, хутчэй за ўсё, народзіцца дзяўчынка.

Пасля працяглага ўстрымання ад сэксу ў пары, хутчэй за ўсё, народзіцца хлопчык. І наадварот: калі пара часта займаецца сэксам, то ў іх, хутчэй за ўсё, народзіцца дзяўчынка.

Яшчэ ёсць павер'е, што ў залежнасці ад таго, хто ў сям'і галоўны — мужчына ці жанчына, народзіцца дзіця таго ж полу.

### Поры года і характар

Гараскоп дазваляе планаваць не толькі пол, але і характар дзіцяці. Так, хлопчыкі, зачатыя ўзімку, маюць рэзкі, наравісты характар. Іх практычна немагчыма падпарадкаваць. Яны адрозніваюцца ўпартасцю і самалюбствам. Часта пакутуюць ад няўдач у асабістым жыцці. Дзяўчаткі, зачатыя ўзімку, па характары, хутчэй, нагадваюць хлапчукоў. Яны нічога не баяцца і вызначаюцца адвагай, аднак часта таксама няшчасныя ў асабістым жыцці.

Хлопчыкі, зачатыя ўвесну, вельмі таленавітыя, але сціплыя. Адрозніваюцца фізічнай слабасцю. Дзяўчаткі, зачатыя вясной, вельмі асцярожныя і цяжка прывыкаюць да ўсяго новага. Ім цяжка выйсці замуж.

Хлопчыкі, зачатыя ўлетку, адрозніваюцца шыратой характару, дабрынёй і гонарам. А дзяўчаткі, зачатыя летам, — вельмі ўражлівыя і імпульсіўныя. Яны вельмі добрыя і эмацыйныя.

Хлопчыкі, зачатыя ўвосень, маюць ясны розум і вызначаюцца сур'ёзнасцю і ўраўнаважанасцю. Часцей за ўсё, яны становяцца навукоўцамі, філосафамі. Дзяўчаткі, зачатыя ўвосень, ствараюць самыя лепшыя сем'і. Яны вельмі любяць жывёл і дзяцей, адрозніваюцца адданасцю і прыязнасцю.

**Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.**

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II ПАЎГОДДЗЕ 2010 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Местное самоуправление · Чарнобылю · Свая справа · Жыцьдоля · Чырвоная змена · Купі лепшае! Тавары, паслугі, цэны · Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 12 400 рублёў на месяц<br>74 400 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 11 600 рублёў на месяц<br>69 600 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 19 900 рублёў на месяц<br>119 400 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 18 000 рублёў на месяц<br>108 000 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9 700—11 180 рублёў на месяц<br>58 200—67 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 940—10 430 рублёў на месяц<br>53 640—62 580 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 13 134—14 080 рублёў на месяц<br>78 804—84 480 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12 230—13 170 рублёў на месяц<br>73 380—79 020 рублёў на паўгоддзе |

* Залежыць ад рэгіёна

# Хто Гулівер?

**Бадай, упершыню ў Беларусі ў Віцебску вызначаць свайго велікана. Дарэчы, конкурс адкрыты, так што будуць рады ўбачыць і ўзнагародзіць і прыезджага чалавека — «хмарачоса».**

Акцыя пройдзе ў самым цэнтры, на плошчы Свабоды, у рамках святкавання дня горада. Яна запланавана на 26-га чэрвеня. Конкурс прысвечаны памяці знакамітага на ўвесь свет земляка, які праславіўся менавіта дзякуючы свайму росту.

Фёдар Андрэевіч Махноў нарадзіўся ў 1878-м годзе недалёка ад Віцебска. Ёсць розныя звесткі пра ягоны рост, паводле некаторых з іх — да 2 метраў 85 сантыметраў.

За кіламетраў дваццаць ад абласнога цэнтра, на малой радзіме велікана, нейкім цудам захавалася ягоная магіла, над якой стаіць адпаведны помнік. Надпіс паведамляе пра тое, што памёр велікан у 1912 годзе. Дарэчы, у 1930-я, як высветлілі краязнаўцы, ягоныя астанкі жонка прадала вучоным. Косці вывезлі ў Мінск, ды падчас вайны яны былі страчаны.



У музеі, які з любоўю створаны мясцовымі вясковымі энтузіястамі, ёсць нават арыгінальны ложак велікана. Можна прачытаць пра ягонае жыццё, убачыць і іншыя цікавыя экспанаты. Ён — просты селянін, аб'ехаў шмат краін. Быў вельмі моцным, выступаў у цырку. Цікава, што было ў яго пяцёра дзяцей, але ніхто не быў такім высокім — іх рост не перавышаў двух метраў.

На жаль, у нашы дні магіла велікана і насамрэч народны музей яшчэ не сталі турыстычнай Мекай. Можна спадзявацца, што адкрыты конкурс стане першай спробай прыцягнуць увагу да неабходнасці стварэння цікавага турыстычнага маршруту і развіцця адпаведнай інфраструктуры.

У вёсцы Старое Сяло энтузіясты даўно мараць пра гэта. Безумоўна, дарога да велікана можа стаць і вельмі прыбытковым турыстычным праектам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

**Вакол мундзіяля**

## ДАТЧАНЕ ЗАБІВАЮЦЬ САБЕ, ІТАЛЬЯНЦЫ ГУБЛЯЮЦЬ АЧКІ

**На чэмпіянаце свету па футболе ў ПАР адбыліся чарговыя матчы.**

У групе Е Галандыя перамагла Данію. Калі ў першым тайме каманда абаранялася, то ў пачатку другога ўсе яе намаганні былі дарэмнымі — абаронца датчан Сімон Поўльсэн няўдала згуляў галавой і накіраваў мяч у сетку сваіх варот. Працягнуць пачатае датчанамі галандцы здолелі і самі: у выніку — 2:0 на карысць «аранжавых». Далей на поле выйшлі каманды Японіі і Камеруна. І Японія ўпершыню ў сваёй гісторыі атрымала перамогу на чэмпіянаце свету, які праходзіць не на тэрыторыі сваёй краіны — 1:0. А вось дзейныя чэмпіёны свету італьянцы няўдала пачалі чэмпіянат. Прапусціўшы першымі ад Парагвая, каманда імкнулася адыграцца, што і ўдалося, а вось выйсці наперад не атрымалася — 1:1.

## АНТЫІНСТРУКЦЫЯ ДЛЯ ВУВУЗЕЛЫ — САПРАЎДНЫ ХІТ

**Праціўнікі вувузел на арэнах чэмпіянату свету па футболе выпусцілі здзекавальную інструкцыю па прымяненні назойлівых афрыканскіх дудак, якая карыстаецца вялікім поспехам у інтэрнэце. У ёй дадзены парады, у якіх выпадках прыхільнікам трэба здабываць гук з гэтага музычнага інструмента — калі ваша каманда атакуе, абараняецца, забівае гол, прапускае гол, выйграе, праіграе, калі выконваюцца нацыянальныя гімны, у перапынку матча і калі футбаліст атрымлівае траўму.**

А вось галандская кампанія знайшла вувузеле новае прымяненне. Яна запісала гукі афрыканскай дудкі для мелодыі званка мабільнага тэлефона. Тым часам паўднёваафрыканская кампанія, якая выпускае папулярныя ў сваіх прыхільнікаў дудкі, абвясціла аб пачатку выпуску ў іх больш ціхай версіі. Магутнасць гуку новай вувузелы будзе складаць 107 дэцыбел — на 20 менш, чым у звычайных. Нядаўна праведзенае даследаванне паказала, што гук вувузелы магутнасцю каля 127 дэцыбел апярэджвае барабан (122 дэцыбелы) і свісток арбітра (121,8 дэцыбела). Пасля пачатку чэмпіянату арганізатары атрымалі шмат скаргаў на дудкі ад заўзятараў, футбалістаў і тэлекампаній, якія вядуць трансляцыі. Апошнім з футбалістаў, які выказаўся супраць вувузел, стаў лідар зборнай Партугаліі Крышціяну Раналду. Ён сказаў, што гук вувузел перашкаджае футбалістам сканцэнтравацца, але дадаў, што да такіх умоў прыйдзецца прыстасавацца.

## ЧАМУ НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ ПУСТУЮЦЬ МЕСЦЫ?

**Кіраўніцтва міжнароднай федэрацыі футбольных асацыяцый правядзе расследаванне прычын недастатковай колькасці гледачоў на некаторых матчах ЧС-2010. Пра гэта паведаміў прэс-аташэ арганізацыі Нікаля Менга.**

На пытанне пра тое, чаму на стадыёнах у Прэторыі і Палакванэ былі пустыя месцы ў глядацкіх радах, ён паведаміў, што «ФІФА пакуль не валодае дакладнымі лічбамі». «Несумненна, гэта не вельмі прыгожа, калі на чэмпіянаце свету падчас матчаў застаюцца пустыя месцы. Мы займаемся гэтым пытаннем, але рабіць высновы пакуль рана». Разам з тым, Менга адзначыў, што сярэдняя лічба наведвальнасці чэмпіянату вельмі высокая — каля 50 тысяч гледачоў.



ФІФА выключыла магчымасць распаўсюджання бясплатных білетаў сярод прыхільнікаў футбола. «Білеты прададзеныя, але нявыкарыстаныя. Галоўная прычына — зразумець, чаму гэта адбылося. Мы гэтым займаемся. Пра бясплатнае распаўсюджанне білетаў гаворка не ідзе».

## КІРОЎЦЫ АЎТОБУСАЎ СПЫНІЛІ ЗАБАСТОЎКУ

**Кіроўцы аўтобусаў, якія ажыццяўлялі перавозку футбольных прыхільнікаў, спынілі забастоўку, якая пачалася 14 чэрвеня. У панядзелак яны адмовіліся працаваць пасля матча Галандыя — Данія. У выніку пацярпелі каля тысячы прыхільнікаў.**

Прычынай забастоўкі стала звышурочная праца падчас чэмпіянату свету, якую кампанія не захацела аплачваць. Увечары 14 чэрвеня з кіроўцамі ўдалося дасягнуць дамоўленасці, і цяпер аўтобусы ходзяць згодна з раскладам.

## ПРЫХІЛЬНІЦ У МІНІ-СПАДНІЦАХ ВЫВЕЛІ СА СТАДЫЁНА

**Галандскія прыхільніцы не дагледзелі матч сваёй каманды супраць зборнай Даніі. Больш за 30 дзяўчат былі выведзеныя з тэрыторыі стадыёна «Сокер Сіці» за так званы схаваны маркетынг.**

Балельшчыцы былі апрануты ў міні-спадніцы, якія выкарыстоўваліся ў Галандыі ў промаакцыі піва Bavaria. Пры гэтым афіцыйным піўным спонсарам чэмпіянату з'яўляецца Budweiser.За парушэнне нормаў ФІФА іх вывелі са стадыёна, адкуль яны былі дастаўлены ў мясцовы паліцэйскі ўчастак. Паводле слоў адной з дзяўчат, ім пагражалі судом і шасцімесячным судовым зняволеннем.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

**ДВУМА РАДКАМІ**

*На чэмпіянаце павялічваецца колькасць вельмі ўпартых гульняў, зведзеных унічыю. Учора ўдзень былі згуляныя два матчы, якія таксама не выявілі пераможцаў (адпаведна ў групах F і G): Новая Зеландыя — Славакія — 1:1 і Кот-Д'Івуар — Партугалія — 0:0.*

# Радзіма Івана Мележа прыме да свята новае аблічча

Паважаныя сябры!

Штогод у першую нядзелю верасня наша краіна адзначае нацыянальнае свята — Дзень беларускага пісьменства. У гэты дзень мы аддаём даніну павагі нашым продкам, якія стварылі фундамент адукацыі і пісьменства, усім, хто на працягу стагоддзяў шанаваў і нёс у свет цудоўную беларускую мову, хто ўпрыгожыў айчынную і сусветную культуру сваімі бессмяротнымі творамі.

Сталіцай XVII Дня беларускага пісьменства ў 2010 годзе стануць Хойнікі. Гэты непаўторны край узгадаваў не толькі народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа, які на ўвесь свет праславіў родную зямлю сваёй «Палескай хронікай», тут таксама нарадзіліся і выраслі празаік Барыс Сачанка, паэт Мікола Мятліцкі, паэтэса Ала Канапелька і іншыя, якія сваёй творчасцю ўслаўлялі Хойнікшчыну і яе працавітых жыхароў.

Каб Дзень беларускага пісьменства прайшоў на самым высокім узроўні, запрашаем усіх неабыякавых людзей прыняць удзел у яго падрыхтоўцы. Вялікіх затрат патрабуе добраўпарадкаванне Хойнікаў: неабходна рэканструяваць дзіцячую бібліятэку, Дом культуры, гарадскі парк, былую панскую сядзібу, дзе неўзабаве будзе адкрыты краязнаўчы музей. У горадзе з'явяцца скульптурныя кампазіцыі герояў твораў Івана Мележа. Асабіста мы запрашаем прыняць удзел у дабрачыннай акцыі тых жыхароў Хойнікшчыны, якіх лёс раскідаў па розных кутках нашай краіны.

У вас ёсць шанц пакінуць сваё імя ў сучаснай гісторыі нашага краю. Свае грашовыя ахвяраванні можна дасылаць на разліковы рахунак 3641430000057 у філіяле 326 ААБ «Беларусбанк» МФО 151501685, г. Хойнікі, вул. К. Маркса, 4, УНН — 400057081, ОКПО — 04063463.

Створым свята разам!

**Нацыянальны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства ў г. Хойнікі.**

# «Самі піце такое малако!»

**Факты парушэння правілаў ажыццяўлення рознічнага гандлю выявілі спецыялісты Полацкага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці пры праверцы дзейнасці ААТ «Полацкі малочны камбінат».**

Малако, кефір, маянэз, тэрмін ужывання якіх перавышаў магчымы ад 2 да 72 дзён, спрабавалі прадаць у крамах. Вінаватых прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці.

У ліку іншага кантралёры ўстанавілі, што дзяржаўная падтрымка, аказаная прадпрыемству ў выглядзе дзяржаўных пазык на агульную суму больш за 7,2 мільярда рублёў, вярталася несвоечасова. І ў асноўным гэтыя грошы траціліся таварыствам на авансаванне сельскагаспадарчых арганізацый. Пры гэтым дапусцілі перавышэнне авансавання некаторых арганізацый за малако больш чым на адзін год уперад.

Праверкай таксама ўстаноўлена, што аўтапрадпрыемствам — філіялам малочнага прадпрыемства, не вытрымлівалася працоўнае заканадаўства, несвоечасова ажыццяўляўся разлік работнікаў за час працоўнага водпуску і пры звальненні.

За выяўленыя факты парушэння парадку правядзення і кантролю знешнегандлёвых аперацый прадпрыемства аштрафавалі на 5,7 тысячы еўра.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «МЫ ХАЦЕЛІ Б АТРЫМАЦЬ БАБУЛІН ОРДЭН...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-стар.)*

Пытанне, што прагучала, не такое простае, як можа падацца на першы погляд. Пачаць трэба хоць бы з таго, што да ўзнагароды (мы зараз гаворым пра савецкую ўзнагародную сістэму: гэта важна, пра што распавядзём крыху ніжэй больш падрабязна — **С.Р.**) маглі прадстаўляць міністэрствы і ведамствы СССР, цэнтральныя органы агульнасаюзных грамадскіх арганізацый, Саветы Міністраў саюзных рэспублік. Гэта, калі гаварыць спрошчана, нібы той пратакол намераў, хадатайніцтва. У нашым выпадку яна выкананая — мы бачым пастанову ЦК КП(Б)Б якраз адносна прадстаўлення групы грамадзян да ордэнаў і медалёў. А вось само ўзнагароджанне адбывалася на падставе Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Гэта нам пацвердзілі і ў аддзеле дзяржаўных узнагародаў упраўлення кадраў і дзяржаўных узнагародаў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і ў 2-м аддзеле (так званым узнагародным) 2-га ўпраўлення галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны. Аўтар матэрыялу Генадзь Баркун удакладніў нам, што меў на ўвазе якраз прадстаўленне. Словы «сярод узнагароджаных», «узнагароджаны», «удастоены» не азначаюць фактычнае ўручэнне грамадзянам дзяржаўных узнагарод, але іх ужыванне ў згаданым кантэксце, як нам падаецца, у пэўнай ступені дапушчальнае, паколькі сам факт прадстаўлення чалавека да ордэна ці медаля ўжо можна назваць падзякай, узнагародай.

Паколькі спасылак на Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, як мы ўжо сказалі, няма, першая і галоўная задача — праверыць па картатэцы: ці быў сам факт узнагароджання і ці ўручалася сама ўзнагарода. Тут мы вяртаемся да згаданай вышэй савецкай узнагароднай сістэмы. Яе правапераемніцай з'яўляецца ўзнагародная сістэма Расійскай Федэрацыі. Канкрэтна дапамогу можа аказаць упраўленне па дзяржаўных узнагародах Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Заяўніцы трэба будзе зрабіць запыт з просьбай, паведаміўшы імя, імя па бацьку, прозвішча, год нараджэння, месца пражывання бабулі, дату прадстаўлення да ўзнагароды і яе назву.

Калі факт узнагароджання пацвердзіцца, можна будзе пераходзіць да другой часткі пошукаў — высвятляць, ці была ўручаная ўзнагарода. Калі не, па якой прычыне. Потым трэба будзе пераходзіць да пошукаў у архівах (да гэтай тэмы мы вернемся пазней, калі атрымаем адказ на наш запыт з галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны). Толькі вось што датычыцца жадання нашчадкаў атрымаць уласна сам ордэн... Вядома, такія выпадкі нават праз 65 гадоў пасля вайны ёсць (і будзем спадзявацца, што нашым заяўнікам таксама пашанцуе ў гэтым сэнсе). Аднак найбольш верагодным падаецца варыянт (паўторымся яшчэ раз, калі пацвердзіцца сам факт узнагароджання) атрыманне ўнучкай ордэнскай кніжкі да ўзнагароды бабулі.

Трэба сказаць і некалькі слоў пра саму ўзнагароду. Ордэн Чырвонай Зоркі быў заснаваны пастановай Прэзідыума ЦВК СССР ад 6 красавіка 1930 года. У Статуце ордэна сказана, што ён заснаваны для ўзнагароджання за вялікія заслугі ў справе абароны Саюза ССР як у ваенны, так і ў мірны час, у забеспячэнні дзяржаўнай бяспекі. Па сутнасці гэта баявы ордэн, прызначаны для ўзнагароджвання найперш ваеннаслужачых.

З аднаго боку, сам факт прадстаўлення чалавека кіраўніцтвам Беларусі за выкананне задання ўрада па перагонцы коней менавіта да гэтага ордэна (пры тым, што на той момант ужо меўся дастаткова шырокі пералік працоўных ордэнаў і медалёў для ўзнагароджвання) сведчыць пра тое, наколькі важнай такая задача была ў далёкім ужо 1945 годзе. З другога боку, пасля заканчэння вайны мінула паўгода, пасля вызвалення Беларусі — паўтара, жыццё ў рэспубліцы ўвайшло ў мірнае рэчышча... Магчыма, і ў гэтым была нейкая свая прычына, якая паўплывала на ход падзей?..

**...Прыкладна пра гэта мы яшчэ раз пагутарылі са Святланай Мікалаеўнай. Яна коратка прыгадала ўспаміны бабулі пра той час, пра тыя цяжкасці, з якімі даводзілася тады сутыкацца людзям, што пераганялі коней. Не пакідаючы без увагі нашы далейшыя пошукі, сышліся на тым, што ўжо сам факт згадвання прозвішча бабулі ў гістарычнай пастанове аб прадстаўленні да ордэна, цяперашняя публікацыя Генадзя Баркуна на падставе архіўных дакументаў — ужо своеасаблівая ўзнагарода, даніна памяці Бар'яш Ганне Архіпаўне як чалавеку, што зрабіў свой слынны ўнёсак у аднаўленне жыцця ў пасляваеннай Беларусі, і падстава для гонару для ўсіх яе цяперашніх нашчадкаў...**

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АДЧУЦЬ СЯБЕ САПРАЎДНЫМ ПАРТЫЗАНАМ

У віцебскім парку, які атрымаў афіцыйную назву Парк партызанскай славы, зусім хутка можна будзе ўбачыць на свае вочы аднаўленыя экспазіцыі пад адкрытым небам «Партызанская зямлянка» і «Рэйкавая вайна» і ўбачыць новыя — акопы для абароны і сапраўдны партызанскі аэрадром. Усё гэта размяшчаецца непадалёк ад віцебскага музея памяці легендарнага партызанскага камандзіра Міная Шмырова і подзвігу ўдзельнікаў партызанскага руху. Дарэчы, сярод іншых экспанатаў у музеі ўпершыню плануецца паказаць рукапіс бацькі Міная, як называлі яго з павагай браты па зброі, у якім ён расказаў пра прыём у Сталіна. Адкрыццё парку будзе зроблена падчас спецыяльнага тэатралізаванага прадстаўлення.



А на галоўную плошчу Віцебска — плошчу Перамогі — нядаўна прызямляліся верталёты. Для вечнай стаянкі. Такім чынам тут папоўнілася калекцыя экспанатаў ваеннай тэхнікі, якую адкрылі напярэдадні святкавання Дня Перамогі.

Верталёты, перададзеныя ваеннымі, вядома, даставілі па зямлі. Неўзабаве тут з'явіцца і самалёт, і сучасныя бронетранспарцёры.

Таксама цяпер непадалёк ад алеі пасля агляду танка, самаходкі, гармат ваенных часоў можна паспытаць смачную грэцкую салдацкую кашу. Кошт порцыі ўсяго 2 тысячы рублёў. За кашай, прыгатаванай па салдацкім рэцэпце, часта выстройваюцца чэргі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Беларускія рыбакі — у дзясятцы наймацнейшых у свеце!

**Беларуская каманда Fishprofi FFF Sensas з Мінска ўвайшла ў дзясятку наймацнейшых на XXX чэмпіянаце свету па лоўлі рыбы летняй паплавочнай вудай сярод клубаў.**
**Пра гэта паведаміў капітан каманды Віталь Кіеня.**

— Упершыню ўзяўшы ўдзел у чэмпіянаце такога ўзроўню, мы абыгралі знакамітыя каманды з Іспаніі, Германіі, Венгрыі, Партугаліі і іншых краін і занялі высокае восьмае месца, — сказаў ён.

Удзел Беларусі ў элітным спаборніцтве рыбакоў дазволіў вывесці нацыянальны рыбалоўны спорт на новы, міжнародны ўзровень. У склад беларускай каманды ўвайшлі чэмпіён Беларусі 2009 года Віталь Кіеня, бронзавы прызёр чэмпіянату краіны Валерый Дайнека, самы вопытны беларускі спартсмен Алег Закржэўскі, вядомыя беларускія спартсмены Яўген Сас і Аляксей Бежук, а таксама запрошаны рыбак — Ёнас Яблонскіс. Трэнер каманды — Дзмітрый Рускевіч.

Сёлета чэмпіянат прымала Польшча. З-за ўмоў надвор'я за тыдзень да пачатку спаборніцтваў было зменена месца яго правядзення: замест раней запланаванай рыбалкі высокага ўзроўню на рацэ Варта вядомыя рыбакі свету сабраліся на вяслярным канале возера Мальта ў Познані. У сёлетнім чэмпіянаце ўдзельнічала рэкордная колькасць камандаў з 31 краіны свету.

**БЕЛТА.**



**Масавымі спаборніцтвамі па рыбнай лоўлі адкрылі рыбацкі сезон работнікі, іх сем'і і госці прыгараднага КСУП «Усход» Гомельскага раёна. Кожную вясну ў гаспадарцы зарыбляюць мясцовае возера, а летам некалькі разоў наладжваюць спаборніцтвы па рыбнай лоўлі і свята з папуляпызацыяй прадукцыі ўласнай вытворчасці.**



Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

# МАК І КАНОПЛІ НІШЧАЦЬ НЕ ШКАДУЮЧЫ



39-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Моклішча, што ў Хойніцкім раёне, вырошчваў на прысядзібным участку невялічкую плантацыю маку (0,15 га), якая была знойдзена супрацоўнікамі аддзялення па ахове тэрыторый радыеактыўнага забруджвання. Ураджай, а гэта каля 150 кг зялёнай масы, быў знішчаны датэрмінова.

На Кармяншчыне супрацоўнікамі ўзвода па ахове зон радыеактыўнага забруджвання каля вёскі Літвінавічы знойдзены дзікарослыя каноплі: 600 кг тут і яшчэ 700 на ўскраіне Чачэрска знішчаны міліцыянерамі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Не заплаціў падаткі — ажно 130 мільёнаў

У дачыненні да віцебскага індывідуальнага прадпрымальніка заведзена крымінальная справа за тое, што ён «зламысна на працягу некалькіх гадоў ухіліўся ад выплаты падаткаў, збораў» на агульную суму больш за 130 мільёнаў рублёў.

Як паведамілі «Звяздзе» ва Упраўленні дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці, бізнэсмен займаўся аптовым гандлем. Каб зэканоміць на падатках, у адпаведныя дакументы і справаздачы заносіў фальшывыя звесткі. Заніжаў даходы ад рэалізацыі, уключаў дакументальна не пацверджаныя выдаткі на набыццё тавараў...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


## РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства у Иностранного частного унитарного производственного предприятия «БУГАЛЮКС» фирмы «БУГАЛЮКС, ДЕНМАРК А/С»**

**Продавец:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Октябрьского района г. Витебска

- Капитальное строение (пошивочный цех № 1) с инв. № 200/С-33103 общ. пл. 1794 кв.м, по адресу: Витебск, ул. Гагарина, 11, начальная цена продажи* **614 700 000 руб.** Для обслуживания недвижимого имущества выделен земельный участок пл. 0,1914 га.

**Характеристика объекта согласно техпаспорту:** фундамент – бутовый; наруж., внутр. капстены – кирпич; пергородки кирпич, металлич. сетка; перекрытия чердач., межэтажн – ж/б; крыша – совмещ., рулон.; полы – мозаичный бетон, плитка, линолеум; проемы окон – двойные створные; дверные – простой работы; отделка стен – штукатурка, окраска; внутр. отделка – штукатурка, окраска, плитка; отопление – центральное; электроосвещение – скрытая, открытая проводка; водопровод – стальн. трубы; канализация – чугун. трубы; горячее водоснаб. – стальные трубы; душ; вентиляция в капстенах; лифт – мет. кабины.

1. Аукцион состоится **19 июля 2010 года в 10.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 16.07.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация 19.07.2010 с 9.30 до 10.00 по месту проведения аукциона.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утв. Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 г. № 559. Условие – наличие не менее 2-х участников. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

3. Для участия в аукционе приглашаются юр. лица и физ. лица. Участнику необходимо подать заявление, копию платежки о внесении задатка в размере 10 % от стоимости лота и документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ.лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. Задаток перечисляется на р/с 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» Витебск, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

4. Имущество продается в собственность без передачи права собственности на земельный участок, на котором оно расположено. Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

5. Победитель возмещает фактические затраты по организации и проведению аукциона, которые сообщаются участникам до начала аукциона.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с реализуемым имуществом.

** Начальная цена продажи утверждена без учета налога на добавленную стоимость.*

**Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02; эл. почта: Vit.in@tut.by**


# Чытаць — гэта модна!

**У рамках сацыякультурнага праекта «Чытаць — гэта модна!» у рознічнай кнігагандлёвай сетцы ААТ «Белкніга» пры падтрымцы выдавецтва «Харвест» стартавала серыя акцый, скіраваных на прыцягненне ўвагі чытацкай аўдыторыі да кнігі ў час летніх адпачынкаў і школьных канікулаў. Пра гэта журналісту «Звязды» паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі нашай краіны.**

Так, у сталічнай краме «Дом кнігі «Светач» і маладзечанскай кнігарні «Спадчына-М» праходзіць акцыя «Чамаданны настрой», падчас якой пакупніку пры набыцці двух мастацкіх выданняў трэцяя кніга ўручаецца ў падарунак.

У сталічных крамах «Кніжная скарбонка» і «Кнігарня пісьменніка» ў рамках акцыі «На канікулы з падарункам» бацькам пры набыцці дзвюх дзіцячых кніг будзе ўручацца бясплатна трэцяя кніга, таксама разлічаная на дзіцячую аўдыторыю.

У крамах «Кнігачэй» і кнігарні «Эўрыка» (Мінск), а таксама ў жодзінскім «Кніжным свеце» ў ходзе акцыі «Усё па 8000 рублёў» увазе пакупнікоў будзе прапанаваны шырокі асартымент мастацкіх выданняў. Акцыя будзе доўжыцца да 15 жніўня, удакладнялі ў міністэрстве.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ *16 июля 2010 г.* ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

| | | Лот 1 | Лот 2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Звенячи |
| 2 | Кадастровый номер | 623681306601000070 | 623681306601000071 | 623681306601000072 | 623681306601000073 | 623681306601000074 | 623681306601000075 | 623681306601000076 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1307 га | 0,1306 га | 0,1421 га | 0,1330 га | 0,1431 га | 0,1572 га | 0,1644 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 255 300 | 1 255 300 | 1 255 300 | 1 255 300 | 1 255 300 | 1 255 300 | 1 255 300 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 9 000 000 | 9 000 000 | 10 000 000 | 9 000 000 | 10 000 000 | 11 000 000 | 12 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 800 000 | 800 000 | 900 000 | 800 000 | 900 000 | 1 000 000 | 1 100 000 |

| | | Лот 8 | Лот 9 | Лот 10 | Лот 11 | Лот 12 | Лот 13 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Горанский с/с, д. Звенячи | Горанский с/с, д. Жуки | Горанский с/с, д. Новое Поле | Горанский с/с, д. Тейки | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 21 | Лошанский с/с, д. Бровки, участок № 22 |
| 2 | Кадастровый номер | 623681306601000077 | 623681305101000037 | 623681315101000200 | 623681317601000003 | 623684001601000292 | 623684001601000293 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1396 га | 0,1745 га | 0,1606 га | 0,1517 га | 0,2104 га | 0,2391 га |
| 4 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 5 | Расходы по подготовке документации (рублей) | 1 255 300 | 1 097 644 | 1 241 977 | 334 000 | 493 444 | 480 529 |
| 6 | Начальная цена земельного участка (рублей) | 10 000 000 | 8 000 000 | 12 000 000 | 7 000 000 | 21 000 000 | 23 000 000 |
| 7 | Задаток (рублей) | 900 000 | 700 000 | 1 100 000 | 600 000 | 2 000 000 | 2 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 16.07.2010 г. в 9.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов 12.07.2010 г. Контактные телефоны: (8 025) 92 761 92, 204 11 62, 204 35 25.

Задаток на участие в аукционе на Лоты 1–11 перечисляется на расчетный счет Горанского сельисполкома № 3604621020052 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 6000537220, код платежа – 04901.

На Лоты 12–13 – на расчетный счет Лошанского сельисполкома № 3600621060087 в филиале 614 АСБ «Беларусбанк» г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае, местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении ему земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта).

3.1 Представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

## ДАХ САРВАЛА

Моцны вецер прагуляўся па самым поўдні Гомельскай вобласці. У Брагінскім раёне пацярпелі КСУПы «Камарынскі» і «Пераможнік». У апошнім знесены дахі на двух кароўніках, пабудаваных 5 гадоў таму, і на будынку механічных майстэрняў. У «Камарынскім» ахвярамі ветру сталі два кароўнікі, цялятнік і зернесховішча. У апошнім, акрамя сарванага даху, абрынулася сцяна на плошчы 100 кв. м, што пацягнула за сабой змяшчэнне канструкцый усяго сховішча. Зараз вядуцца работы па аднаўленні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



# Мінскія салаўі праспявалі для ўсёй планеты

### НА СТАЛІЧНАЙ САЛАЎІНАЙ КАРЦЕ З'ЯВІЛІСЯ НОВЫЯ «ГАЛАСІСТЫЯ ПЛЯЦОЎКІ»

**Гэтымі днямі грамадская арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) падрыхтавала салаўіную карту Мінска-2010. Сёлета на ёй адзначаны 318 пунктаў спеваў салаўёў. Летась спецыялісты АПБ і гараджане сталіцы выявілі 261 месца спеваў гэтых птушак. Карта была падрыхтавана ў межах папулярнай беларускай акцыі «Салаўіныя ночы», якая сёлета была прысвечана Году біялагічнай разнастайнасці.**

Сёлета першыя паведамленні аб месцах спеваў птушак пачалі паступаць задоўга да старту акцыі «Салаўіныя ночы». На працягу двух сутак, 15 і 16 мая, пра сваіх салаўёў расказвалі жыхары практычна з усіх рэгіёнаў краіны. У Мінску былі арганізаваны салаўіныя пляцоўкі, якія наведала больш за 2 тысячы чалавек, паведаміў рэдакцыі **спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Аховы птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН**.

Найбольш актыўныя спевы салаўёў былі заўважаны ў раёнах Мядзвежына, Курасоўшчына і ў пойме Свіслачы на Убарэвіча—Магістральнай. Самым крытычным месцам, дзе колькасць салаўёў змяншаецца, зноў застаецца Лошыцкі парк. На жаль, мінімальная актыўнасць салаўёў зафіксавана і ў іншых цэнтральных парках і скверах сталіцы.

Асобныя аматары птушак правялі маршрутны ўлік салаўёў у горадзе. Паводле паведамленняў актывіста АПБ Андрэя Несцерава, у пойме ракі Свіслач у Чыжоўцы на працягу 1,5-кіламетровага маршруту было падлічана больш за 30 галасістых салаўёў. Дзякуючы вялікай актыўнасці жыхароў сталіцы, на салаўінай карце Мінска з'явіліся новыя «галасістыя» пункты. Аднак агульныя вынікі падлікаў сведчаць, што ў мінскіх парках і скверах колькасць салаўёў зніжаецца. Менавіта таму арнітолагамі і спецыялістамі Мінпрыроды будуць прапанаваныя гарадскім уладам канкрэтныя рэкамендацыі па захоўванні месцаў жыхарства гэтых цудоўных птушак. Сёлета ў межах акцыі АПБ арганізавала яшчэ і салаўіныя экскурсіі, дзе аматары прыроды змаглі навучыцца вызначаць па знешнім выглядзе і нават голасе не толькі салаўёў, але і іншых звычайных галасістых птушак.

У пачатку першага месяца лета салаўінай акцыяй у Беларусі зацікавілася сусветная служба Бі-бі-сі. Для карэспандэнта гэтай тэлерадыёвяшчальнай кампаніі ў чэрвені была арганізавана асобная экскурсія. Звычайна ў гэты час мінскія салаўі ўжо замаўкаюць, аднак у гэты раз некалькі птушак спявалі ва ўсю моц, бо мабыць разумелі, што потым беларускіх «спевакоў» пачуе ўвесь свет.

**Сяргей КУРКАЧ.**




Гаспадары

Грэк Стас ВАВУЛІДЗІ:

# «БЕЛАРУСКАЯ ЗЯМЛЯ І ПТУШКІ НАС КОРМЯЦЬ»

**На адным з хутароў недалёка ад вёсак Сянькоўшчына і Ягнешчычы Слонімскага раёна жыве шматдзетная сям'я грэка Вавулідзі. Сям'я даволі добрая, дружная, працавітая. Ды і сядзіба іх дагледжаная, хоць працы яшчэ шмат. Гаспадар сядзібы Стас Вавулідзі і яго жонка Надзея нядаўна запрасілі да сябе журналістаў.**

Мы наведалі гэту маладую сям'ю, якая нас пачаставала курыным шашлыком, сокам, уласным выпечаным хлебам. За сталом на прыродзе мы шмат гутарылі пра жыццё, пра людскія лёсы. Сёе-тое з гутаркі прапануем чытачам газеты «Звязда».

***— Стас, скажыце, калі ласка, як вы трапілі на Слонімшчыну?***

— Родам я з Казахстана. Вырас у былым Савецкім Саюзе. Мама ў мяне па нацыянальнасці руская, тата — грэк. Жыў я за мяжой у Грэцыі і ў Германіі. А школьны мой сябрук пасля распаду Савецкага Саюза пераехаў у Беларусь на Слонімшчыну. Я некалькі разоў да яго прыязджаў у госці. І тут пазнаёміўся вось з гэтай прыгожай дзяўчынай. Пажаніліся. У нас нарадзіліся два сыны і дачушка. Трэба было неяк уладкоўваць сваё жыццё. Прыглядзелі вось гэтую сядзібу на хутары, купілі яе, і ўжо пяць гадоў тут жывём. А жывучы на хутары, мы пачалі прывыкаць да зямлі, гадаваць свойскую птушку. Зямля і птушкі нас кормяць.



***— У вас тут сапраўды шмат свойскай птушкі. І такіх курэй і пеўня мы яшчэ не бачылі. Адкуль Вы іх прывезлі?***

— Гэта парода курэй Брама. Іх разводзяць для ўпрыгожвання падворкаў. У асноўным гэта куры белыя, цёмныя, ёсць, праўда, і палевага, і нават чырвонага колеру. Куры Брама пачынаюць несціся даволі позна — у 7-8 месяцаў, 100-120 яек у год. А куры старэй за два гады нясуцца нават радзей. Жывая маса — 3-4 кг, пеўняў 4-5 кг.

***— Вы нам цэлую лекцыю пра курэй Брама прачыталі. І чым вы іх кормiце?***

— Чым усе людзі кормяць свойскіх птушак: камбікормам, пшаніцай, ячменем і г.д.

***— Усе гэтыя качкі, куры, гусі і кормяць вашу сям'ю. Так?***

— Вядома ж, яны нас кормяць. Мы і дзеці прывыклі есці курынае, гусінае і качынае мяса. Швагерка неяк прывезла свініны, дык мы паелі яе адзін раз, то нам балелі страўнікі. Мяса птушак усё ж больш карыснае і для дарослых, і для дзяцей.

***— Дык вы, магчыма, хочаце з цягам часу сур'ёзна заняцца фермерствам?***

— Час пакажа. Але некалі яшчэ ў XIX стагоддзі мае продкі прыехалі ў Кіргізію і заснавалі пасёлак Івана-Аляксееўку. І сталі там багатымі людзьмі. Пазней побач з пасёлкам у 1877 годзе ўзнік і горад Таласк на левым беразе ракі Талас, заснаваны рускімі і ўкраінскімі перасяленцамі. Так што працавітасць у мяне ад продкаў.

***— А дзеткі вашы куды ў школу ходзяць?***

— У Сянькоўшчынскую сярэднюю школу. Праўда, сёлета зімою так замяло да вёскі дарогу, што прыйшлося нават звярнуцца да намесніка старшыні Слонімскага райвыканкама Вячаслава Апановіча, каб дапамог расчысціць дарогу. Дарогу расчысціў мясцовы СВК, але заплацілі за гэта 32 тысячы рублёў.

***— Ці надоўга вы аселі на Слонімшчыне?***

— Мяркуем, на ўсё жыццё. Тут добрая прырода, душэўныя людзі. Плануем зрабіць да дома прыбудовы, добраўпарадкаваць тэрыторыю...

**Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.**

## Усміхнемся!

Двое сяброў:

— Чаму твой сын так хутка расце, за вушы цягнеш, ці што?

— Не, проста манітор кожны месяц на 5 сантыметраў падымаю!

☺

**Выпі «Есентукі-17», здзіві печань...**

☺

— Я прапаную ўвесці ў школе ўрокі палавога выхавання.

— Навошта?

— Ну трэба ж неяк дзяцей у школу заваблiваць!

☺

**Калі-небудзь я давучуся ва ўніверсітэце, стану вопытным хімікам, буду займацца даследаваннямі і атрымаю хімічны элемент № 119. У яго будзе вельмі маленькая працягласць жыцця, і за гэта я назаву яго Стыпендый!**

☺

Сям'я інжынераў. Муж:

— Калі абматаць усю зямлю медным дротам у некалькі пластоў, атрымаецца нядрэнны генератар пераменнага току...

Жонка:

— Зноў напіўся? Не пераменнага, а пастаяннага!

☺

**— Сідараў, як не сорамна! Вы зноў спіце на працы! З першага чысла вы звольнены!**

**— Дык гэта ж з першага. Чаго вы мяне цяпер вось будзіце?**



Вытокі

# БАБСКІЯ РОЗГАРЫ

**Ужо не першы год на старонках розных перыядычных выданняў друкуюцца артыкулы, прысвечаныя найбольш вядомым каляндарным святам. Аднак склалася так, што практычна кожная наша новая паездка па Беларусі адкрывае для нас абрады, якія здавён бытавалі ў той ці іншай мясцовасці, але не былі вядомыя шырокай грамадскасці. Сёлета мы наведалі Дубровенскі раён, пабывалі ў в. Баева і шмат гадзін правялі разам з мясцовымі знаўцамі народных традыцый, запісалі ад іх некалькі дзясяткаў абрадавых песень, занатавалі шэраг асаблівасцяў правядзення каляндарных святаў і сямейна-родавых абрадаў. Але сапраўднай знаходкай для нас аказаўся падрабязны аповед пра мясцовую традыцыю выканання абраду «Розгары».**

Ва ўсіх сваіх публікацыях мы шмат увагі надаём рэгламентацыям, звязаным з паводзінамі розных удзельнікаў тых ці іншых святаў у залежнасці ад узросту, сямейнага становішча, сацыяльнага статусу і полу чалавека. Вымалёўвалася дакладная сістэма культурных прадпісанняў, звязаная самым непасрэдным чынам са зместам абрадавых дзеянняў.

Яшчэ раз нагадаем, як размяжоўваліся прадстаўнікі розных узростаў, калі траплялі ў тыя ці іншыя абрадавыя сітуацыі. Напрыклад, капаць магілу і апускаць труну з нябожчыкам у магілу мелі права мужчыны толькі пасля 40 гадоў. Або як толькі труну з нябожчыкам апусцяць у магілу, прысутны люд выконвае рытуал апошняга з ім развітання. Уважліва і ўдумліва пастаўцеся да апошняга правіла: сям'я памерлага зямлю ў магілу не кідае, таму што яна развітваецца з нябожчыкам пацалункамі і абдыманнем — гэтаксама як пры сустрэчы або развітанні з жывымі. Той жа, хто не цалаваў памерлага на развітанне, кідае тры жменькі зямлі, гэтым самым адштурхоўваючы «смерць» ад сябе.

Сустрэчы ў Дубровенскім раёне выразна паказалі, што ёсць яшчэ адна катэгорыя людзей, пра якую ніхто і ніколі не гаварыў як пра ўдзельнікаў памінальных абрадаў на працягу года. Давайце ўзгадаем: на восьмым тыдні пасля Вялікадня ў многіх мясцовасцях Беларусі адзначаўся «Русальны тыдзень» — свята, прысвечанае ўшанаванню рана памерлых дзяцей, незамужніх дзяўчат, маладых жанчын, якія зацяжаралі, а затым скончылі жыццё самагубствам.

Аказваецца, у в. Баева і некаторых суседніх з ёй вёсках быў спецыяльны дзень, калі ў цэнтры ўвагі былі жанчыны, якія цяжка хварэлі і так і не змаглі нарадзіць дзяцей, якія тайна зрабілі аборт, якія зачалі дзіця, але не вынасілі яго патрэбны час і ў іх быў «скідыш» (выкідыш), якія зачалі дзіця, але парушылі пэўныя забароны (напрыклад, прадпісанне не прасці і не ткаць у калядныя вечары або не секчы нічога сякерай, не вязаць у час цяжарнасці), у выніку чаго нараджалася дзіця, якое вельмі хутка памірала.

«Бабскае свята» адзначалася на восьмы дзень пасля Тройцы, або ў першы панядзелак пасля заканчэння Русальнага тыдня. Вельмі моцнае абрадавае спалучэнне: **спачатку трэба ўшанаваць-памянуць заўчасна памерлых дзяцей, а назаўтра аддаць даніну павагі жанчынам з няшчаснай мацярынскай доляй!**

Зранку гэтыя жанчыны выконвалі штодзённыя гаспадарчыя справы, а затым, бліжэй да дзевяці гадзін раніцы, рыхтавалі сабе спецыяльны венік з крапівы. Па памерах ён нагадваў бярозавы венік, якім вымяталі двор. Крапіўны венік насаджвалі на палку, каб можна было пакласці на плячо, і з ім адпраўляліся ў загадзя падрыхтаваную лазню. Жанчыны збіраліся «вяткамі» — групамі, гуртамі: нехта ў адной лазні, нехта — у іншай. Венікі залівалі на непрацяглы час кіпенем, а пасля гэтага пачыналі парыцца. Жанчыны, якія расказвалі пра незвычайны абрад, заўважылі, што кожнае рытуальнае дзеянне абрадніц суправаджалася спецыяльнымі формуламі-прыгаворамі, аднак, на жаль, яны ўжо не памятаюць тых магічных слоў. Хоць, магчыма, у гэтых словах была нейкая ўласная тайна, звязаная з памяццю пра бяду-здарэнне, і гаварыць пра яе пабочным людзям было зусім непажаданым.

Шмат пытанняў выклікае выкарыстанне веніка менавіта з крапівы. Яна якраз да гэтага часу набірала сваю моц, таму шырока выкарыстоўвалася ў ролі перасцярогі або ахоўнага абярэга ў купальскай абраднасці. Так, некалькі сцяблін крапівы вешалі ў варотах хлява, раскідвалі на падворку, каб мясцовыя ведзьмы не змаглі пранікнуць у хлеў і скрасці малако ў кароў. Крапіва-жыгучка цесным чынам звязана з эратычнымі матывамі ў фальклоры. Прымаўка «скакаць у крапіву» азначала саграшыць або згвалціць дзяўчыну. Адпаведна дзеці, якія з'явіліся на свет па-за шлюбам, называліся «крапіўнікамі». У такім разе становіцца зразумелым, што крапіўны венік як асноўны атрыбут абраду «Розгары» выконваў адначасова і ачышчальна-ахоўную, і прадуцыравальна-эратычную функцыі. Жанчыны, якія страцілі дзяцей, або тыя, якія іх не маглі зачаць, парыліся крапіўным венікам, каб вярнуць сабе дзетародную здольнасць.

Пасля таго як памыюцца, жанчыны апраналі на сябе чыстае адзенне, бралі кожная свой хатулёк з ежай і ўсе разам кіраваліся на край вёскі, туды, дзе расло жыта. Цікава тое, што ў склад абрадавай ежы ўваходзілі тыя ж стравы, якія дзяўчаты бралі з сабой на Тройцу, калі куміліся, і пазней на Купалле. Галоўнае месца займала яечня — сімвал пераўтворанага жыцця, змянення статусу, пераходу ў іншую групу вясковых жанчын. Разам з яечняй быў хлеб, кавалак сала, нешта з хатняга печыва, абавязкова бутэлька гарэлкі.

На ўскрайку жытнёвага поля жанчыны рассцілалі посцілкі, раскладвалі прынесеную ежу, рассаджваліся і пачыналі своеасаблівае застолле. З аднаго боку, гэты абрадавы стол у пэўнай ступені нагадваў памінальны, таму што на пачатку жанчыны маліліся за страчаных дзетак, прасілі Бога дараваць ім гэты грэх, а з іншага — у ім былі выразныя элементы вясельнага стала. Нягледзячы на тое, што кожная з жанчын прыносіла свае стравы, яечню звычайна пускалі па крузе, каб кожны з прысутных узяў сваю долю (як і долю вясельнага каравая). Усе разам выпівалі па кропельцы гарэлкі, каб памянуць сваіх дзетак.

Праз нейкі час распачынаўся яшчэ адзін цікавы рытуал. Жанчыны ўставалі, браліся «па парах у абдымкі» і пачыналі парай качацца па жыце. Трэба было качацца да таго часу, каб кожная з жанчын тройчы апынулася на зямлі, на жыце. Нашы інфарматары расказвалі, што ў гэты час жанчыны нешта прыгаворвалі, аднак у сувязі з тым, што ў склад гурта дапускаліся толькі тыя, у каго здарылася бяда, то астатнія не ведалі тых замоў і малітваў. Аднак нам патлумачылі, што качацца па зямлі і жыце, якое ў гэты час выкідвала колас, трэба было дзеля таго, каб зямля дала ім сілу і здароўе, каб дапамагла, як і жыту, узгадаваць свой колас — сваё дзіця. Затым яны зноў садзіліся «за стол» і спявалі розныя песні — у асноўным ўжо пазаабрадавыя, пазнейшага часу, а таксама сіроцкія, у якіх быў адпаведны эмацыйны настрой. На наша пытанне адносна таго, ці не шкодзіла гэта жыту, жанчыны ўдакладнілі: яно толькі-толькі выкінула колас і было яшчэ мяккаке, а не крохкае, таму абавязкова падымалася і давала ўраджай. Яшчэ адно істотнае ўдакладненне. Незалежна ад таго, нараджаліся потым у гэтых жанчын дзеці ці не, аднак яны усё адно штогод бралі ўдзел у абрадавым дзеянні.

Адвячоркам жанчыны збіралі «стол» і рушылі па вёсцы. А далей магло адбыцца тое, што часцей за ўсё здаралася на Масленіцу. Калі на вуліцы яны сустракалі мужчыну, то пачыналі лавіць яго і патрабаваць выкуп за тое, каб адпусцілі. Мужчына павінен быў адарыць жанчын цукеркамі, гарэлкай або грашыма. Калі ж ён не хацеў адкуплівацца, паводзіны жанчын станавіліся агрэсіўнымі. Яны са смехам пачыналі распранаць небараку: зцягвалі сарочку, маглі залезці ў штаны...

Аднак і на гэтым жаночае свята не заканчвалася. Сабраўшы выкуп, яны кіраваліся ў адну з вясковых хатаў (пра гэта загадзя дамаўляліся) і ладзілі сваё гулянне: танчылі, спявалі жартоўныя песні. Цікава тое, што на заключную частку абрадавых падзей прыходзіла вясковая моладзь і далучалася да святочнага гуляння: спявалі, скакалі, ладзілі ігрышчы.

Сення абрад гэты захаваўся ў спрошчаным выглядзе, аднак ён па-ранейшаму захоўвае сваю сакральную накіраванасць. Напрыклад, у суседняй вёсцы Ірвяніца ў гэты дзень жанчыны запрашаюць адна адну такімі словамі: «Ганна, пайшлі скідышаў памінаць!»

Сапраўды, чарадзейная зямля беларуская, і колькі б ні прайшло часу, яна ўсё адно будзе здзіўляць нас сваімі мудрымі людзьмі, абрадамі і святымі мясцінамі.

**Аксана КАТОВІЧ,**
**Янка КРУК.**

Жывая зямля

# ДАЙЦЕ ДРЭВУ ШАНЦ... БЫЦЬ ДРЭВАМ

Упрыгажэннем зямлі, а не рэкламным шчытам ці папераджальнай шыльдай. Проста расці, а не быць піламатэрыяламі. Немагчыма кожнае дрэва абнесці плотам і залічыць у помнікі прыроды — у гэтым нашы маўклівыя браты менш за ўсё маюць патрэбу. Але кожнае з іх, няважна дзе яно расце (у лесе ці каля дарогі), — сведка нашага ўзроўню... маралі і культуры.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**












# «І ЛЯЦЕЎ ЁН НА РАЯЛІ, НАЦІСКАЎШЫ НА ПЕДАЛІ...»

## Чым выклікана настальгія па нямым кіно і тапёрскім мастацтве?

**А вы ведаеце, што пад экранам кінатэатра «Ракета» ў Мінску без справы, нерухома, а магчыма як напамін, стаіць старое тапёрскае піяніна?!. Аднак магчыма, што стаіць недарэмна: дух тапёраў дагэтуль жывы і рвецца скрозь клавішы ў прастору. Ці то на раялях, ці то, можа, на машынах часу новыя, сучасныя тапёры акампануюць старому нямому кіно, ладзяць так званыя кінаканцэрты, вылечваюць нашу настальгію... Па свеце ладзяцца тапёрскія фестывалі: ад Кемерава да Сан-Францыска. Апошнім часам у Мінску адбываецца адзін кінаканцэрт за другім, газеты ўжо паспелі назваць гэтую з'яву «моднай» і задумацца, ці не адкрываецца ў тапёрскага мастацтва «другое дыханне»?**



### КІНО МАЎЧЫЦЬ — РАЯЛЬ КРЫЧЫЦЬ

Аўтары нямых камедый прыдумалі штуку: «пузатае» піяніна, якое на кінаэкране не стаіць, як наканавана чалавекам магутнаму інструменту, а свавольна падае, смешыць гледачоў! Чарлі Чаплін першым праехаўся прама на фано з гары, адкуль інструмент бультыхнуўся ў возера і патануў — гэткая махіна! Пасля ў нямых фільмах раяль спускалі ўніз па лесвіцах, выкідвалі з вокнаў, коўзалі на ім па праспектах — усё дзеля забавы аўдыторыі. Піяніна на экране, вядома ж, разбівалася, рассыпаючы чорна-белыя клавішы і выпростваючы струны, спачатку абсалютна нема, потым неяк няясна, а пазней трэск, бум, бах, грукат рабіліся ўсё гучнейшымі, ды яшчэ і герой-комік пачаў пасяваць да таго, як з акна да зямлі даляціць дарагушчае піяніна, пракрычаць з экрана: «За што мне гэтае?!».

Колькі раяляў было разбіта ў кіно невядома, аднак гэты класічны «гэг» можна залічыць сімвалам таго, што здарылася з мастацтвам тапёраў пасля з'яўлення гуку ў кіно: тапёры, тыя, хто суправаджаў сеансы нямых фільмаў жывой музыкай, граючы часцей за ўсё на старых піяніна (адсюль і назва прафесіі: «тапёр» (фр.) — «грукатаць» — прыходзілася па клавішах), сталі не патрэбны кіно — і знікла прафесія, і знікла тапёрскае мастацтва... Трэск, бум, бах, грукат! Але гледачам асалода: з'яўленне гуку было натуральнай эвалюцыяй кінематографа...

Нямое кіно непераўзыдзенае ў выяўленчых эксперыментах да экспрэсіўнасці акцёрскай гульні! Рэжысёр Квенцін Тарантына ў скандальным постмадэрнісцкім гімне кінамастацтву «Ганебныя» задвердзіў «усемагутнае» кіно ў вечнасці нечакана з дапамогай таго самага класічнага, «разбуральнага» «гэга». У гэтым ваенным фільме нібыта складаецца рэйтынг спосабаў барацьбы з фашыстамі, і перамагае бабуля, якая скінула раяль з акна на ворага... Апошнім часам пайшла хваля сапраўднай цікавасці і да тапёрскага мастацтва. Натуральна, вобраз сучаснага тапёра цалкам адрозніваецца ад тапёраў, пра якіх мы прачыталі ў апавяданнях Чэхава ці Тургенева: яны апісваюць, як пагардліва ставілася грамадства да тапёраў, напрыклад, сапраўдны скандал і нават бойку магла выклікаць заўважаная размова дзяўчыны з вышэйшага свету з тапёрам-служкай. Зрэшты, тыя тапёры яшчэ не перайшлі ў кіназалы і гралі на танцавальных вечарынах. Пазней у свеце склаўся іншы вобраз: большасць кампазітараў, якія стваралі музыку для нямых фільмаў, былі сур'ёзнымі класічнымі музыкамі, і сваю працу ў кіно яны разумелі як новую і фінансава выгадную сферу класічнай музыкі. Нават выказвалася меркаванне, што вялікія кампазітары, такія як Вагнер ці Чайкоўскі, чыя музыка адрознівалася выключным драматызмам і эмацыйнасцю, калі б жылі ў эру з'яўлення кінематографа, абавязкова зразумелі б тыя магчымасці, якія надае музыцы «ўсемагутнае» кіно, і з задавальненнем сачынялі б ноты для тапёраў! Тапёры ж выдатна імправізавалі, чым заслугоўвалі павагу кінагледача.

— Сучасныя тапёры ўжо не носяць камізэлек і капелюшоў, пераабуліся з чаравікаў з лакавымі насамі ў белыя спартыўныя туфлі, змянілі піяніна на сэмплеры, але пакінулі самае галоўнае — прыглушаны, задуменны бляск у вачах... — кажа Валянцін Грышко, музыка, генеральны прадзюсар «MTV у Беларусі», які паспрабаваў акампанаваць нямому кіно. — Вазьміце ў рукі гітару, выключыце гук у тэлевізары — і, я ўпэўнены, нечакана для сябе вы здолееце агучваць нават экстранныя выпускі навінаў!

Валік Грышко супрацоўнічаў з гуртом «Усе», які складаўся з Графа (бас і прагамінг) і Арцёма Раменнага (гітара).

— Усіх нас узрадавала тое, што нам выпала агучваць любімы фільм і Фрэдзі Мэркюры «Метраполіс» рэжысёра Фрыца Ланга: гэты фільм надзвычай адпавядаў стылістыцы нашай музыкі — мінімалістычнай, меладычнай, крыху электроннай... Па праўдзе кажучы, мы, падаецца, нічога і не рабілі на сцэне: чорна-белыя футурыстычныя вобразы на экране і подых гледачоў самі выцягвалі музыку з-пад нашых пальцаў... Мы проста ў захапленні напярэдадні глядзелі фільм... Часам музыка настолькі дапаўняла фільм, што ў нас самых дух займала! У пацвярджэнне — дружныя апладысменты і ўзрушаныя воклічы з залы!..

### ЧАС — НАЗАД!

Самае прыемнае для гледача ў сучасных тапёрскіх кінаканцэртах — гэта адчуванне цеснай сувязі сябе з мінулым, з гісторыяй, такое рэальнае, што нават гублаешся... Грукат, бах, бум, трэск, і зноўку кіно абсалютна нема: гэта зачароўвае — быць удзельнікам мінулай падзеі, якая паваротвае час назад!..

Такую магчымасць далі вечарыны класічнага і сюррэалістычнага кіно, якія ў мінскім кінатэатры «Перамога» агучваў кампазітар-тапёр з Санкт-Пецярбурга Арсеній Трафім. Асабліва ж гэтай падзеі ў тым, што калі звычайна на кінаканцэртах музыкам прапаноўваецца паэксперыментаваць з агучваннем фільмаў, то Арсеній Трафім, аўтар праекта «Сучасная тапёрская кіназала», займаецца напісаннем і выкананнем музыкі да нямых фільмаў прафесійна, пастаянна. Ён кіраўнік элітарнага праекта: загадзя абвяшчае гледачам, што на яго выступленнях адбываецца змяшэнне кінатэатра і філармоніі, таму пасля сямі гадзін, як пасля трэцяга званка, не пажадана заходзіць у кіназалу.

Арсеній Трафім мае прафесійную музычную адукацыю — скончыў аддзяленне джаза-акадэмічнага фартэпіяна, ды дадаткова атрымаў спецыяльнасць «гукарэжысёр», спецыфіка якой цяпер дазваляе агучваць фільмы не толькі з дапамогай музыкі, але і дадатковых штучных шумоў і грукатаў. Музыка, якую ён піша да нямых фільмаў, не стылізацыя пад прыёмы і звычкі тапёраў-акадэмістаў пачатку XX стагоддзя: яна гучыць сучасна і мадэрнова, але пры гэтым, як правіла, не перашкаджае фільму распавядаць гісторыю свайго часу, толькі дадае разнастайных музычных колераў да чорна-белага кіно.

Сам кампазітар-тапёр распавядае, што шмат якія аўтары авангардных фільмаў раней забаранялі тапёрам акампанаваць сваім кінашэдэўрам, бо тая музыка, якую прынята было тады выконваць у кінатэатрах, не была эксперыментальнай, а значыцца, не здолела б падтрымаць інавацыйнасць авангардысцкіх маніфестаў. Адной з галоўных функцый сваёй дзейнасці «Сучасная тапёрская кіназала» называе асветніцкую. Але ж адчувалася, што, на жаль, нечага не хапала для таго, каб дапамагчы сучаснаму гледачу з «кліпавым» мысленнем успрыняць і прыняць выдатныя авангардысцкія кінаэксперыменты амаль стогадовай даўніны...

Затое Арсеній Трафім, як і было заведзена каля ста гадоў таму, запісвае ноты па сцэнах! Цікава, што з 1924 года захавалася спецыяльная інструкцыя — «Настроі нямых фільмаў» знакамітага кампазітара Эрна Рапі, якая змяшчала 52 «настроі» (клішэ, якія звычайна адбываліся на экране), распісаныя па ангельскім алфавіце з прыкладнымі нотамі: «аэраплан» (airplane), «гурт» (band), «бітва» (battle), «птушкі»(birds), «званок» (call) і г.д. Згодна з гэтым метадам, музыка мог адным вокам сачыць за экранам, а другім вокам — за алфавітам і, такім чынам, хутка знаходзіў тое, з чаго можна было б пачынаць агучваць сцэну. Пачаць, а потым ужо — таленавітая музычная імправізацыя!

### ІГРАЦЬ — НІБЫТА ВАГОНЫ РАЗГРУЖАЦЬ

Гэтая сустрэча паказала, што ахвотных паглядзець нямое кіно пад музыку ў Мінску зусім нямала! Ды ў нас ёсць прыхільнікі тапёрскага мастацтва не толькі сярод публікі. Самі беларускія музыканты з вялікай ахвотай адгукаюцца на падобныя эксперыменты.

Калісьці Музей гісторыі беларускага кіно запрашаў на сеансы піяніста, каб музыкай стварыць патрэбную атмасферу перад нямым фільмам. Урэшце, у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек 26 мая падчас Міжнароднага фестывалю лялечных тэатраў акцёр Віталь Краўчанка «з'явіўся на сцэне з пафасна-музычна-тэатральным вывяржэннем гукаў на табурэтцы пад тапёра (Даша Мароз) «Істэрыі не будзе!» па творах А.М. Вярцінскага».

Адбылася не адна праграма ў кінатэатры «Перамога», падчас якіх класіцы нямога кіно акампанавалі вядомыя беларускія гурты. Напрыклад, «Метраполіс» (1926 г.) Фрыца Ланга ці «Голем» (1920) Паўля Вегенера агучвалі музыкі Валік Грышко, «Каханне і спорт», «Drum XTZ», Глеб Галушка і «HDDN Name». Нямецкі фільм «Кабінет доктара Калігары», рэжысёра Роберт Вінэ ішоў пад гурт «Рацыянальная Дыета». Гурт «Князь Мышкін» агучваў фільм «Дзяўчына са скрынкай» (1927) Барыса Барнэта. А вось Андрэй Іваноў з гурта «Zartipo» сваёй музыкай нагадаў савецкую класіку — фільм «Кастрычнік» (1927) Сяргея Эйзенштэйна...

Леанід Нарушэвіч, лідар гурта «Князь Мышкін», успамінае:

— Нашае выступленне ў «Перамозе» прыйшлося на ўсплёск грыпу ў Мінску, таму гледачоў было так сабе, не шмат, але пляскалі ў далоні яны гучна!

Мы выступалі ў якасці тапёраў таксама на сеансах у Таганрогу і Маскве.

І калі-небудзь мы абавязкова выступім зноўку ў якасці тапёраў.

Тапёрская музыка патрабуе велізарнай увагі ад выканаўцы, тым больш, калі гэтая музыка імправізацыйная і моцна стамляе... Прафесія тапёра ў свой час была яшчэ тая, цяжкая, амаль як вагоны разгружаць.

Эпоха нямога кіно беззваротна сышла, і падобныя калажы цікавы сёння выключна як эксперымент. А можа ўсё-такі ёсць нейкая настальгія па той эпосе — нямога кіно?

На жаль, у Мінску няма рэтра-кінатэатра ці кінатэатра «паралельнага пракату», хоць даўно час, а пакуль тапёрскія кінаканцэрты — гэта адзіная магчымасць на вялікім экране паглядзець класіку нямога кіно.

**Наталля ДАШКЕВІЧ.**

*Лечымся без лекаў*

# КАРЫСНАЯ ПЯКУЧКА



**Я Е стараюцца абыходзіць бокам — каб не апякла. А траўнікі раяць, наадварот, не толькі не пазбягаць «пякучкі», але і збіраць яе, бо яшчэ спакон веку крапівой хвасталі цела пры мышачных і сустаўных болях, а таксама гатавалі з яе ўсялякія зёлкі.**

Крапіва — маленькі, але натуральны фармацэўтычны склад. Яна ўтрымлівае арганічныя кіслоты, вітаміны $B_1$ і $B_2$, C, E, K і PP, флаваноіды, крэмніевая і мурашыная кіслоты, хларафіл і мноства мікраэлементаў. Дзякуючы ім зёлкі з крапівы аказваюць не толькі агульнаўмацавальнае дзеянне, але і гаючае, чым карыстаюцца многія фармзаводы, вырабляючы з гэтай расліны медыкаменты. Іх прызначаюць тым, хто пакутуе ад крывацёкаў; тым, у каго ёсць раны, якія доўга не загойваюцца, язвы, ацёкі; а таксама тым, хто вельмі раздражняльны і скардзіцца на бяссонніцу.

Больш за ўсё карысных рэчываў у крапіве назапашваецца ў перыяд яе цвіцення, тады лепш за ўсё яе і збіраць. Збірайце лісце крапівы — там уся «гаючая сіла». Аднак калі магчымасці часта хадзіць па крапіву няма, можна іх і нарыхтаваць. Для гэтага высушыце «здабычу» дома, але не на сонцы (разбураецца хларафіл, страчваецца частка вітамінаў), а ў цені, у цёплым памяшканні, якое прадзімаецца. Калі цэнтральная жылка ліста становіцца крохкай, сыравіна гатова — час спыняць сушку. Такія зёлкі прыдатныя да ўжывання 2 гады.

### Народныя рэцэпты

**Настой — ад крывацёкаў, нерваў і ацёкаў.** Валодае некалькімі ўласцівасцямі. Па-першае, гэта кроваспыняльны сродак (дзякуючы вітаміну K) — ён эфектыўны пры гемараідальных, кішэчных і лёгачных крывацёках. Акрамя таго, крапіва яшчэ і паляпшае кроватварэнне (дзякуючы вялікаму ўтрыманню жалеза), з-за чаго яна карысная пры жалезадэфіцытнай анеміі. Па-другое, настой аказвае заспакаяльны эфект (дзякуючы вітамінам групы B), яго рэкамендуюць пры нервовым расстройстве, раздражняльнасці і бяссонніцы. І па-трэцяе, яго прымяняюць як мачагоннае пры ацёках. Для прыгатавання настою вазьміце 2 ст. лыжкі свежага лісця, заліце 400 мл кіпеню, настойвайце 2 гадзіны, працадзіце. Прымайце па 1/2 шклянкі ў дзень за 30 хвілін да яды.

**Сок — ад ран, вугроў і язвы.** Свежы сок крапівы гоіць раны і язвы. Адціснуць яго можна пры дапамозе мясарубкі або сокавыціскалкі (перад гэтым лісце трэба старанна прамыць). Пры гастрыце і язве прымайце па 1 ч. лыжцы соку 3-4 разы на дзень за 30 хвілін да яды, развёўшы яго ў палове шклянкі гатаванай вады. Сурвэткі, змочаныя ў соку, дапамагаюць залячыць прэласці, вугры і раны на скуры. Для гэтага іх трэба прыкладваць да пашкоджаных месцаў і прыклейваць пластырам, мяняць 2-3 разы на дзень, да загойвання. Пры вуграх паралельна трэба прымаць настой крапівы ўнутр. Як агульнаўмацавальны сродак лепш за ўсё піць менавіта сок, пры гэтым яго трэба разводзіць: 1 ст. лыжку на шклянку гатаванай вады.

**Адвар — ад аблысення.** Мыццё галавы адварам крапівы дапамагае пры себарэі і ачаговай лысасці. Вазьміце 100 г лісця, кіпяціце 30 хвілін у 1 л воцату, які папярэдне развядзіце з вадой у суадносінах 1:1. Мыце галаву вечарам перад сном, без шампуню, праз дзень, курс 3-4 тыдні, потым перапынак на 1-2 тыдні і зноў паўтарыце курс.

**Свежыя крапіўныя венікі — ад рэўматызму, ламоты.** Пры дакрананні крапівы да цела пякучыя валаскі расліны раняць скуру. У ранку з унутранай паласці валаска выцякае вадкасць, якая ўтрымлівае мурашыную кіслату. Яна і раздражняе скуру, выклікаючы моцнае смыленне. Пры рэўматызме варта кожны дзень на працягу 1-3 хвілін «біць» сябе свежай крапівой або пасыпаць парашком з яе хворыя месцы.

**Каму нельга?** Прэпараты з крапівы не падыходзяць для лячэння жанчынам з гінекалагічнымі крывацёкамі, паліпамі і іншымі пухліннымі захворваннямі маткі і яечнікаў, цяжарным жанчынам. Абсалютнае супрацьпаказанне — павышаная згусальнасць крыві. Асцярожнасць патрэбная і пры ўжыванні прэпаратаў крапівы людзьмі з хворымі ныркамі.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

*Нетрадыцыйная медыцына*

# ЗОЛАТА ЎМАЦУЕ НЕРВОВУЮ СІСТЭМУ

**Напэўна, у дзяцінстве многім прыкладалі да сінякоў і гузакоў медны пятак. Гаючыя ўласцівасці медзі і іншых металаў актыўна выкарыстоўваюць народныя лекары. Перш чым лячыцца золатам, срэбрам, меддзю ці волавам, іх трэба пачысціць. Метал падаграецца і апрацоўваецца (на выбар) сметанковым маслам, алеем, малаком ці кашкай з зерня. Добра натрыце іх, пакіньце на 3 хвіліны, потым насуха вытрыце кавалкам палатна.**

**МЕДЗЬ** — *выдатны танізуючы сродак для печані, селязёнкі і лімфатычнай сістэмы. Асабліва карысная для людзей, схільных да павышэння вагі і ацёкаў. Яна таксама дапамагае змагацца з анеміяй. А на Русі здавён карысталіся медным посудам, на сценках якога затрымліваліся накіп і шкодныя для арганізма солі.*

● У аздараўленчых мэтах піце па 2 ч.л. меднай вады 3 разы на дзень незалежна ад прыёму ежы на працягу месяца. Для яе прыгатавання на працягу паўгадзіны прамывайце 10 медных манет (напрыклад, капейкі савецкіх часоў) у праточнай вадзе, потым заліце іх літрам халоднай вады і кіпяціце, пакуль не выпарыцца палова вадкасці.

● Той жа эфект будзе ад пастаяннага нашэння меднай бранзалеткі на запясці.

● Пры ўдарах ног, варыкозе і тромбафлебіце пакладзіце медныя манеты ў абутак ці панчоху і насіце на працягу дня

● Каб зняць галаўны боль, прыкладзіце на 10—15 хвілін па 2 манеты да ачагоў болю.

● Пры кан'юнктывіце штодзённа кожную гадзіну на 10 хвілін кладзіце на павекі капеечныя манеты.

● Пры агульнай слабасці, нервовым знясіленні і неўрастэніі кітайскія лекары раілі прыкладаць медныя манеты да пункта паміж указальным і вялікім пальцамі на тыльным баку кісці штодзённа на 1,5-2 гадзіны. Больш за ўсё медзі ў трохкапеечных манетах, выпушчаных да 1961 года. Каб узмацніць лячэбны эфект, прабіце ў іх адтуліны дыяметрам 2-7 мм. Абавязкова загартуйце манеты на патэльні без масла, а калі яны астынуць, зачысціце скуркай да бляску, каб выдаліць вокіслы. Паўтарайце ачыстку перад кожным цыклам лячэння.

**ЗОЛАТА** *эфектыўнае для ўмацавання нервовай сістэмы, паляпшае памяць і інтэлект, умацоўвае сардэчную мышцу і павышае вынослівасць.*

● Для прыгатавання лячэбнай вады заліце залатое ўпрыгажэнне без камянёў двума шклянкамі вады і кіпяціце, пакуль аб'ём вады не паменшыцца напалову. Можна прымаць на працягу месяца па чайнай лыжцы 3 разы на дзень незалежна ад прыёму ежы. Пасля гэтага варта 20—30 хвілін правесці ў спакоі, накрыўшыся пледам.

**ЖАЛЕЗА.** *Спрыяльнае для коснага мозгу, печані і селязёнкі. Стымулюе ўтварэнне чырвоных крывяных цельцаў. Умацоўвае мышцы, косці і нервовую сістэму.*

● Жалезную ваду рыхтуйце так, як і залатую, і прымайце па чайнай лыжцы тры разы на дзень пасля яды на працягу месяца.

**СВІНЕЦ** — *лепшы сродак ад удараў.*

● Калі адразу пасля ўдару пакласці на пацярпелае месца невялікі кавалачак свінцу, гэта дапаможа пазбегнуць кровападцёка.

**СРЭБРА** — *адзін з самых важных лячэбных металаў. Здымае розныя запаленні, дапамагае пры слабасці пасля ліхаманкі, пры пякотцы, запаленні страўнікава-кішачнага тракта, павышанай актыўнасці жоўцевага пузыра.*

● Срэбная вада рыхтуецца гэтак жа, як і залатая. Але ёсць і «халодны» спосаб яе прыгатавання: прадмет са срэбра максімальна высокай ступені ачысткі вагой ад 10 да 30 г заліце літрам халоднай негатаванай вады ў нейтральным посудзе (з керамікі, шкла, каменя). Праз суткі вада ўзбагаціцца іонамі срэбра. Піць срэбную ваду можна па шклянцы ў дзень, лепей раніцай перад снеданкам. Курс лячэння — да двух месяцаў у год, але ні ў якім разе не больш. Карысна піць цёплае малако, сагрэтае ў срэбным посудзе. Яно дае моц і павышае вынослівасць.

**ВОЛАВА** *можна прымяняць для лячэння скурных захворванняў.*

● Прыбінтуйце да хворага месца ці замацуйце пластырам невялікую пласціну волава. Пакіньце на 1-2 гадзіны. І гэтак штодзённа да ўстойлівага пазітыўнага выніку. Ваду з волава рабіць не варта.

**Але перш чым пачаць лячэнне металамі, пракансультуйцеся ў спецыяліста, каб пераканацца, што ў вас няма алергіі на іх.**

**Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.**

*Ну і ну!*

### Выйшаў з кабінета, вярнуўся — абакралі...

**Малады чалавек, жыхар Гродна, рэгулярна наведваў розныя арганізацыі і ўстановы абласнога цэнтра, пасля чаго бестурботныя грамадзяне заставаліся без сваёй маёмасці. А супрацоўнікі міліцыі слухалі ад іх адно і тое ж: «Выйшаў з кабінета, вярнуўся — абакралі», паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Ідэнтычны почырк здзяйснення крадзяжоў даваў падставы меркаваць, што ва ўсіх выпадках арудуе адзін зламыснік. Яго сышчыкі вызначылі па адбітку пальца. Аказалася, што гэта той самы хлопец, які ўжо мае вопыт падобных злачынстваў — 36 даказаных эпізодаў і два гады знаходжання ў папраўчай калоніі строгага рэжыму. Напрыканцы студзеня сёлетняга года ён вызваліўся з-за кратаў і ... зноў за старое. Устаноўлена больш за дваццаць новых фактаў незаконнага папаўнення ўласнага кашалька, украдзеная маёмасць ацэньваецца на суму каля дзесяці мільёнаў рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### За адзін дзень — пяць тапельцаў

**На Брэстчыне 12 чэрвеня ў розных раёнах вобласці ўтапілася 5 чалавек.**

Самым маладым быў 17-гадовы жыхар в. Навасёлкі Кобрынскага раёна, а ў возеры Свяцілаўскае, што ў Баранавічах, знайшлі мёртвай 82-гадовую пенсіянерку. Астатнія тапельцы былі маладымі людзьмі ад 28 да 36 гадоў. У наступныя дні (13 і 14 чэрвеня) у вобласці ўтапіліся яшчэ 6 чалавек.

### Пабывалі ў палатцы, зазірнулі ў вагончык...

**За адну ноч на беразе возера Белае, што каля Белаазёрска, невядомыя абакралі турыстаў. З палаткі былі выкрадзеныя дарагія мабільнікі і тэлевізар, а з турыстычнага вагончыка зніклі прадукты і спінінгі.**

Устаноўлена, што ў палатцы пабываў 45-гадовы беспрацоўны, а ў вагончык зазірнулі двое вучняў сярэдняй школы — усе мясцовыя жыхары.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Утерянный бланк квитанции 1-СУ серии КС № 0669975, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительным.**

Усім, хто валодае якімі-небудзь звесткамі пра **СЫСОЕВУ Марыю Вячаславаўну**, 1986 года нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Віцебск, праспект Чарняхоўскага 22-4-66, просьба паведаміць іх у **суд Першамайскага раёна г. Віцебска** па адрасе: г. Віцебск, вул. Гарбачэўскага, 26, каб. 31, суддзі Н.Е. Дасько.

# ЯК РЫБА НА РАСПРАДАЖЫ,

## або Знакі задыяка ў краме

**Ты бачыш шыльду «Зніжкі» і гатовая несціся на злом галавы ў краму? Тады ты не толькі сапраўдная жанчына, але і, цалкам верагодна, Дзева па гараскопе. А калі ты пры гэтым яшчэ і забылася свой кашалёк дома, то, хутчэй за ўсё, ты — Вадалей. Кожны знак задыяка ходзіць у краму па-свойму. А вось як?**



**Авен.** Натыкаючыся позіркам на чарговую шыльду, дзяўчына-Авен можа ўспомніць, што менавіта гэта ёй і трэба (нават калі яна абсалютна не збіралася заходзіць у краму па пакупку). Праўда, зайшоўшы ў буцік, «авечка» можа ўтаропіцца на прылавак «як баран на новыя вароты», доўга выбіраючы тое, што будзе даспадобы, і адмахваючыся ад прадаўцоў. Але, прабегшы вачамі па вітрыне і рашуча вызначыўшыся з пакупкай, дзяўчына-Авен можа ўзяць рэч без прымервання або апрануць яе адразу і ў ёй і пайсці. А дома доўга думаць — няўжо я не магла знайсці што-небудзь лепшае?

**Парада Авену:** не спяшайся з пакупкай, абыдзі некалькі крамак, каб канчаткова вызначыцца з выбарам. Тады табе не давядзецца моўчкі пакутаваць, убачыўшы набытыя толькі што туфлі ў суседнім буціку з надпісам «Распродаж».

**Цялец.** Паход па крамах для дзяўчыны-Цяльца — гэта цэлы рытуал. Таму асабліва нервовых мужчын, якія не могуць вытрымаць доўгіх праменадаў па крамах, лепш адразу пакінуць дома. Выбіраючы сабе світарок, Цялец можа вельмі доўга прыдзірацца да якасці, колеру і вытворцы, дастаўшы ўсіх навакольных. А абраўшы пэўную рэч, купіць адразу дзве — калі падабаецца, то трэба браць з запасам. Пры гэтым шыльда «Распродаж» не дзейнічае на дзяўчыну-Цяльца як «чырвонаяануча на быка», хутчэй, наадварот, яна пастараецца сысці ад лішняй мітусні і вярнуцца ў гэту ж краму пазней.

**Парада Цяльцу:** не забывай пра тое, што акрамя паняцця «зручна» і «мне падабаецца», ёсць яшчэ слова «мода», таму варта часам глядзець fashion-паказы і падбіраць хоць бы аксэсуары, здольныя ажывіць твой гардэроб.

**Блізняты.** Асаблівую слабасць большасць дзяўчат-Блізнят мае да глянцавых выданняў, на якія гатовыя выдаткаваць нямала фінансаў. Праўда, ля газетна-часопіснага развалу, як і ля любой іншай крамы, «блізняткі» могуць затрымацца надоўга, з цяжкасцю спрабуючы вызначыцца, што ж іх сэрцу міла. У рэшце рэшт, накупляўшы ўсяго, што прыцягнула позірк, дзяўчына-Блізняты палову можа так ніколі і не распакаваць, закінуўшы ў далёкі кут.

**Парада Блізнятам:** не раскідвайся. Калі ты вырашыла купляць штосьці пэўнае, то ідзі ў краму, не адцягваючы ўвагу на ўсё астатняе.

**Рак.** Дзяўчына-Рак можа блукаць па крамах цэлы дзень. Вось ужо каму сапраўднае раздолле ў гіпермаркетах! Накупляўшы ўсяго неабходнага і абвешаўшыся пакетамі з ног да галавы, якія практычна не будуць абцяжарваць Рака (бо свая ношка не цягне), яна не забудзецца прыкупіць і што-небудзь для душы: цікавую кніжку, мілую бразготку або ажурныя шторкі. Праўда, потым можа аказацца, што «для душы» злёгку пераважвае «трэба», але ж гэта такія дробязі!

**Парада Раку:** гуляючы ў велізарных гандлёвых цэнтрах, не забывайся глядзець на гадзіннік, а то можаш аказацца зачыненай ахоўнікам у чарговай краме.

**Леў.** Ільвіца аддае перавагу шыкоўным модным буцікам. І да самага закрыцця можа спрачацца з прадаўцамі, патрабуючы генеральнага дырэктара за тое, што ёй прапанавалі прымераць рэч з бракам. І толькі пасля таго, як у яе папросяць прабачэння, яна ўрачыста выдаліцца. Часцей за ўсё дзяўчыну-Льва можна знайсці ў ювелірным аддзеле, дзе яна прыглядае сабе чарговы кулончык або бранзалет. Пры гэтым недарагая біжутэрыя яе, зразумела, не задавальвае — толькі сапраўдныя камяні і высакародныя металы.

**Парада Льву:** не патрабуй ад прадаўцоў немагчымага. Калі таго, што табе трэба, у іх няма, то з-пад зямлі яны дакладна нічога не выкапаюць.

**Дзева.** Вось ужо хто сапраўды неадэкватна рэагуе на разнастайныя распродажы, дык гэта Дзева. Яе практычная натура проста не дазваляе прайсці міма распаўсюджанай шыльды (бо ў гаспадарцы ўсё спатрэбіцца), а затым прымусіць насіць набытую рэч, пакуль гэта дазваляе пара года і мода (не прападаць жа дабру). Затым рэчы дружна перамяшчаюцца ў кладоўку або на дачу і дажываюць свой век там.

**Парада Дзеве:** убачыўшы слова «Распродаж», заплюшчы вочы і праходзь міма. Калі табе што-небудзь будзе трэба, то дзе-небудзь у горадзе абавязкова будзе распродаж і пазней.

**Шалі.** Шалі могуць хадзіць па крамах не проста гадзінамі, а накручваючы кругі толькі ў адным месцы. А як жа інакш — хіба можна вызначыцца ў такой колькасці рэчаў? Выбар жа такі цяжкі... Асабліва складана ў такіх любімых дзяўчатамі гэтага знака мастацкіх салонах і крамах падарункаў — так шмат усяго цікавага і прыгожага і так цяжка з гэтага выбраць. Толькі з дапамогай прадаўца ім удаецца вызначыцца з пакупкай, і тады Шалі адыходзяць шчаслівыя і задаволеныя.

**Парада Шалям:** не бойся звяртацца па дапамогу да прадаўцоў-кансультантаў. Гэта іх праца, і яны абавязкова дапамогуць зрабіць добры выбар.

**Скарпіён.** Любімыя крамы дзяўчыны-Скарпіёна — гэта часцей за ўсё антыкварныя крамкі, камісіёнкі і блышыныя рынкі. Там жа столькі ўсяго цікавага! І не мае значэння, што гэты капялюшык ужо не ў модзе, затое выглядае арыгінальна і незвычайна. Вось толькі задорага... Але Скарпіён нікуды не спяшаецца і гатовая пачакаць, пакуль яе ўцэняць. Зрэшты, калі дзяўчыну гэтага знака штосьці сапраўды зацікавіць, яна гатовая будзе заплаціць любую цану, толькі б атрымаць жаданае.

**Парада Скарпіёну:** не забывай аб модзе. Безумоўна, ты можаш быць яе заканадаўцай са сваёй развітой інтуіцыяй, але ж існуе і рызыка таго, што ты будзеш выглядаць смешна.

**Стралец.** Гэтая дзяўчына пралятае па краме «з хуткасцю стралы» і падрульвае да касы з поўным кошыкам патрэбных і абсалютна бескарысных рэчаў. Вось у каго хуткасць руху вымяраецца ў колькасці выдаткаваных «долараў за хвіліну». Пры гэтым на касе пачынаецца весялосць для ўсіх навакольных, таму што Стралец не супраць паспрачацца з абслуговым персаналам, што нярэдка прыводзіць да сур'ёзных канфліктаў. Зрэшты, ведаючы свае правы, іх заўсёды можна абараніць.

**Парада Стральцу:** купляй тавары па спісе і добра вучы заканадаўства, каб не ўкляпацца пры адстойванні сваіх правоў.

**Казярог.** Адзін з самых важных момантаў пры пакупцы для «казярожкі» — гарантыя на тавар. І сапраўды, хіба можна купіць няякасны тавар? А калі на яго няма гарантыі, то хто яго адрамантуе, калі ён сапсуецца? Вось і атрымліваецца, што да выбару любой рэчы трэба падыходзіць з самымі сур'ёзнымі намерамі, таму што купляць басаножкі на месяц — гэта несур'ёзна, бо ў іх можна прахадзіць два або тры сезоны, пакуль яны канчаткова не выйдуць з моды.

**Парада Казярогу:** калі ўжо ты вырашыла ўзяць абавязкова якасную рэч, то не варта эканоміць. Праўда, перад тым як выбраць «рэч на гады», падумай, ці змесцяцца яны ў тым велізарным пакоі, які ты называеш кладоўкай.

**Вадалей.** Вялізныя супермаркеты з касай на выхадзе не для дзяўчыны-Вадалея. Прабягаючы па краме, яна горне ўсё ў адзін пакет, пачынаючы з блузкі з карункамі і заканчваючы электрычнай лямпачкай. Асабліва хутка знікаюць з прылаўкаў «навінкі», якія дзяўчына-Вадалей бярэ, каб паспрабаваць што-небудзь гэтакае. І не мае значэння, што гэта — модныя портачкі або фарба для валасоў. Вось толькі на падыходзе да касы высвятляецца, што кашалёк яна забылася дома. А калі ён ёсць, то ў ім проста можа не хапіць грошай на ўсе пакупкі.

**Парада Вадалею:** збіраючыся ў краму, не забудзься кашалёк і спіс усяго неабходнага. А ў краме пастарайся яго хоць трохі прытрымлівацца.

**Рыбы.** Рыбка «плавае» па крамах спакойна і вальяжна, нікуды не спяшаючыся. Ды і куды спяшацца, калі гэты дзень яна вырашыла прысвяціць сабе, любімай. Паміж наведваннямі чарговых буцікаў можна заруліць і ў кавярню для лёгкага перакусу, бо крамы — гэта так стамляе. Убачыўшы чарговага прамоўтара, дзяўчына гэтага знака з лёгкасцю мяняе кірунак руху ў яго бок, каб парадаваць сябе чарговым падарункам пры пакупцы чаго-небудзь не асабліва патрэбнага.

**Парада Рыбам:** збіраючыся прагуляцца па крамах, не плануйце больш нічога ў гэты дзень, таму што лёгка можаце затрымацца ў чарговым гіпермаркеце як мінімум на суткі.

*Інфарм-укол*

# КРОКАМ МАРШ!

**У таго, хто толькі і робіць, што сядзіць, узнікае гіпакінезія — недастатковасць рухальнай актыўнасці, пры якой фактычна немагчыма гаварыць пра здароўе.**

Паводле слоў **урача-педыятра 2-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ЗВЯРУГІ**, у першую чаргу пакутуе цяглічная сістэма, яна практычна атрафіруецца. Пакутуюць і косці. Каб мы маглі абапірацца на шкілет, ён павінен быць трывалым. Падчас бегу, напрыклад, ударныя нагрузкі на касцявую тканку складаюць да 6 мас цела чалавека, таму косці вымушаны паступова ўмацоўвацца. Калі ж чалавек не рухаецца, арганізму здаецца, што трываласць шкілету не патрэбная, і косць становіцца лёгкай, губляе кальцый. Нават пры збалансаваным харчаванні, ужыванні мінеральных комплексаў кальцый амаль не будзе засвойвацца, а значыць, тут недалёка і да астэапарозу.

Маларухомым ладам жыцця абумоўлены і атэрасклероз, і каранарная хвароба сэрца. Амерыканская Асацыяцыя медыкаў у барацьбе з атэрасклерозам прапісвае займацца фітнэсам 5-6 разоў на тыдні па 30-40 хвілін з пульсам не менш за 100 удараў у хвіліну. Можна проста хадзіць бадзёрым крокам — 1 км за 8-9 хвілін.

У галаўным мозгу ёсць так званы цэнтр рэтыкулярнай інфармацыі. Ён падтрымлівае ўстаноўлены ўзровень актыўнасці цэнтральнай нервовай сістэмы ў цэлым. Гэтая сістэма працуе за кошт нашых адчуванняў і ўражанняў — калі мы бачым, чуем, да чагосьці дакранаемся і г.д. Вялікая доля прыпадае на інфармацыю ад рухальнай сістэмы. Пры нерухомым ладзе жыцця цэнтральнай нервовай сістэме хранічна не стае актывацыі. Атрымліваецца, калі мы мала рухаемся, то і думаем не так, як належыць.

Дыябет 2 тыпу з поспехам лечыцца цяглічнай нагрузкай у спалучэнні з дыетай. Ад пастаянных трэніровак адчувальнасць рэцэптараў да інсуліну павышаецца. Акрамя таго, у гэты час клетачныя мембраны становяцца больш пранікальнымі для глюкозы. Так што пасільныя нагрузкі вельмі патрэбныя дыябетыку 2 тыпу. Падчас фізічнай нагрузкі трэніруецца і гарманальная сістэма.

Гэта дапаможа вам больш рухацца і ўмацоўваць цяглiцы.

**1.** Раніцай пасля сну сядзьце з выпрастанай спінай, устаньце на дыбачкі.

**2.** На прагулцы не абыходзьце камяні і лужы. Кожны скачок надае лёгкасць хадзе і захоўвае гнуткасць ног.

**3.** Раніцай і ўвечары, падчас чысткі зубоў, уставайце на дыбачкі, напружвайце цяглiцы ног і сцёгнаў.

**4.** Імкніцеся не карыстацца ліфтам. Добра ісці па лесвіцы праз адну прыступку.

**5.** Нахіляйцеся, не згінаючы ногі ў каленях. Спіну імкніцеся трымаць прама.

**6.** Уставайце з ложка і крэсла без дапамогі рук.

**7.** Падчас выканання хатняй працы прысядайце з выпрастанай спінай і напружанымі цяглiцамі ног.

**8.** Не прысядайце і шчыльна злучайце ступні падчас чысткі туфляў.

**9.** Каб паглядзець назад ці ўбок, паварочвайце толькі галаву.

**10.** Штодня некалькі хвілін хадзіце дома на дыбачках, з кнігай на галаве.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## СААЗ прадказала двухразовы рост колькасці памерлых ад раку

**Штогадовая колькасць лятальных выпадкаў раку павялічыцца ўдвая на працягу наступных 20 гадоў. Такі прагноз зрабілі спецыялісты Міжнароднага агенцтва па вывучэнні раку Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), паведамляе Fox News.**

Паводле інфармацыі GLOBOCAN, у 2008 годзе ў свеце было выяўлена прыкладна 12,7 мільёна злаякасных новаўтварэнняў. Каля 7,6 мільёна хворых памерлі ад раку. Найбольш распаўсюджанымі відамі раку ў 2008 годзе былі пухліны лёгкіх, малочных залозаў і тоўстага кішэчніка.

Спецыялісты IARC адзначылі, што структура захворвання на рак стала больш раўнамернай. У прыватнасці, узрасла колькасць злаякасных новаўтварэнняў, якія выяўляюцца ў жыхароў краін, што развіваюцца. Паводле звестак арганізацыі, у 2008 годзе на гэтыя краіны прыпала каля 56 працэнтаў выяўленых пухлінаў, а таксама 63 працэнты лятальных выпадкаў раку.

Высокі ўзровень смяротнасці ад раку ў 2008 годзе быў зафіксаваны ў краінах Усходняй Еўропы і былога СССР. У прыватнасці, у Расіі ад раку памерла больш за 180 чалавек на 100 тысяч жыхароў. У Венгрыі, Манголіі, Арменіі, Уругваі, Літве і Беларусі гэты паказчык перавысіў 200 чалавек.

Мяркуючы, што тэмпы росту захворвання на рак не зменяцца на працягу бліжэйшых 20 гадоў, вучоныя зрабілі прагноз на названы перыяд. На іх думку, да 2030 года колькасць злаякасных пухлінаў, якія выяўляюцца штогод, дасягне 21,4 мільёна, а смяротнасць ад раку складзе прыкладна 13,2 мільёна хворых у год.

